АЛІНА ДЛАТОЎСКАЯ

АРНАМЕНТЫ

АРНАМЕНТЫ

Аліна Длатоўская

АРНАМЕНТЫ

Аповесць

Мінск
Выдавец А. М. Янушкевіч
2019

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
Д51

Ілюстрацыі Васіля Шарапава

Длатоўская, А. А.

Д51 Арнаменты : [аповесць] / Аліна Длатоўская. — Мінск : А. М. Янушкевіч, 2019. — 204 с. : іл.
ISBN 978-985-7210-25-1.

Другая кніга пісьменніцы, якая гучна заявіла пра сябе два гады таму, напісана ў жанры «гарадскога фэнтэзі».

Вёскі паступова выміраюць. І не толькі людзі перабіраюцца ў гарады. У Мінску з'яўляюцца нячысцікі: у Купалаўскім скверы Лясун вымушае блукаць тых, хто не даносіць да сметніцы недапалкі, на Камсамольскім возеры Вадзянік цягне на глыбіню тых, хто купаецца пасля Перунова дня, а на Каменнай Горцы мінчукоў прымушае вар'яцець кашэчы кароль Варгін...

Аднак з'явіцца той, хто аб'яднае нячысцікаў агульнай мэтай: паказаць людзям, хто мусіць валадарыць на гэтай зямлі.

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44

ISBN 978-985-7210-25-1

© Длатоўская А. А., 2019
© Афармленне. Выдавец А. М. Янушкевіч, 2019

Мурашы

Мільёны дробных лапак у няспынным руху краналі скуру. Ад мезенцаў на руках праз прыдалонні, локці, плечы — да шыі, да твару. Ад грудзей праз жывот, сцёгны, калені — да мезенцаў на нагах. Мурашы выпаўзалі з-пад скуры, пакідаючы на ёй невялікія купкі. Такія з'яўляюцца на зямлі ўвесну. Мурашы лезлі ў нос, у вочы, у вушы, блыталіся ў валасах, казыталі ўнутры.

У сэрцы варушылася нешта вялікае. Перабірала вузлаватымі лапкамі, пстрыкала мулкімі крылцамі і адкладала, адкладала, адкладала яйкі.

Арсень падхапіўся, упіваючыся пазногцямі ў грудзі, дыханне збілася. Прасціна скамечаная, коўдра на падлозе. Правёў далонню па твары, зірнуў на яе — чыстая. Выдыхнуў і ўзняўся, папраставаў на кухню. Следам скіраваўся кот.

Арсень знайшоў чорны камячок сярод лістападаўскай слоты. Мужчына жыў адзін дзевяць гадоў, як памерла маці. Жывёл не любіў, клапаціцца звыкся толькі пра сябе, але паўз гэтае кацяня прайсці не змог.

Бяляш — не называць жа яго Чарныш — круціў пысай ад усіх кармоў, незалежна ад якасці і цаны. Малако, сасіскі, вараная рыбка, курыныя катлеткі — усё гэта яму не падыходзіла. Ён еў толькі сырую ялавічыну. Арсень дзівіўся, але купляў, бо ведаў рэцэпт ідэальнай раніцы: чорная кава і чорны кот на каленях — і можна забыцца на дрэнныя сны.

* * *

Сем гадзін да канца рабочага дня. Тэлефанаванні — як камарыны піск, усё звіняць, звіняць над вухам. Дрэнна спаў. Бывае.

Пяць гадзін да канца рабочага дня. Гутарка калег — як мушынае гудзенне.

— Арсень, ты аформіў дамавіну? – менеджарка ў вялікіх акулярах і напаўпразрыстым шаліку нагадвае страказу.

— Ш-што?

— Дамову, кажу, аформіў?

Тры гадзіны. Літары на экране разбягаюцца чорнымі бліскучымі жучкамі і зноў збіраюцца ў словы. Замест «пагадненне» — «пахаванне», замест «камп'ютар» — «пакуты», замест «кліент» — «тлен». Сёння трэба легчы раней, а не глядзець дапазна дурныя відэа.

Гадзіна. Кроплі слімакамі спаўзаюць па шкле, пакідаючы вільготныя сляды. Літары выбягаюць з экрана на стол, лезуць чорнымі мурашамі пад пазногці, у рукавы кашулі.

Дадому. Тэрмінова дадому.

* * *

Наступная станцыя... Не ўзнімаць вочы. Не ўзнімаць.

Мурашы поўзалі па ўсіх, хто быў у вагоне. Па светлых тварыках гаманкіх дзяўчат-падлеткаў, па спрацаваных руках зморанай старой, па сівых вусах задуменнага рабочага, па капелюшах і шапках, па красоўках і ботах, па куртках і футрах, па торбах, заплечніках, каўнярах, шыях, тварах, скронях, насах, ілбах.

Кунцаўшчына.

Юнак, які сядзеў насупраць, глядзеў проста ў вочы. Валасы набок, чорная куртка, фірмовыя красоўкі,

заплечнік — нічога асаблівага. Толькі па ім мурашы не поўзалі.

Каменная Горка.

Арсень шыбаваў да выхаду з метро. Вялізная крама будматэрыялаў, жоўтая, нібы забытае на стале масла. Шэрагі бабулек, якія нападаюць на кожнага, хто пройдзе праз калідор іх тавараў і нічога не купіць. Не глядзець нікому ў твар.

У сэрцы заварушылася, выпроставаючы крылы, мурашыная матка. У лёгкіх казытала, пяршыла ў горле, мігцела, пульсавала ў вачах. Хацелася катацца па асфальце, пакуль яны не знікнуць. Але гэта не дапаможа, бо яна ўнутры. Яшчэ крок — і яго званітуе. Арсень спыніўся, хоць да пад'езда заставалася зусім крыху. Схіліўся над сметніцай, закашляўся.

Яго схапілі за плячо.

— Набірай паветра, — юнак з метро прымусіў разагнуцца.

Арсень тузануўся, каб вызваліцца, але хлопец трымаў моцна. Нешта зашаптаў на вуха, але Арсень ніяк не мог зразумець, што яму кажуць, дачуць усё цалкам, дабрацца да сэнсу. Юнак сунуў мужчыне ў руку льняны мяшэчак.

— Запарыш і вып'еш перад сном, а нанач адчыніш фортку. Ты павінен быць упэўнены, што гэта ўсё — у тваёй галаве. Не ў сэрцы, не пад скурай — у галаве. Зразумеў?

Арсень, вызваліўшыся, адыходзіў да пад'езда.

— Фортку адчыні, інакш памрэш.

* * *

Мільёны дробных лапак у няспынным руху кранералі скуру. Ад мезенцаў на руках праз прыдалонні, локці,





плечы — да шыі, да твару. Ад грудзей праз жывот, сцёгны, калені — да мезенцаў на нагах.

Па столі бегалі цені фіранак і мурашы. Ён некалькі разоў парываўся зачыніць акно, бо ў пакоі было холадна, але не наважваўся.

Бяляш насіўся па кватэры, караскаўся на фіранкі, дзёр мэблю, шыпеў і кідаўся на гаспадара, выпусціўшы кіпці. Пэўна, свежае паветра і водары вуліцы ўдарылі яму ў галаву. Гэта таксама пройдзе раніцай. Усё пройдзе.

У скронях гуло, шаргацела, рыпела, быццам там ладзілі новы мурашнік. Мурашыная матка пстрыкнула крылцамі, пакруцілася, варушачы вусікамі, і папаўзла ўгару. У горле дзерла, нібы пакурыў дрэнны кальян. Бяляш ашалела скакаў на шыбы. Арсень узняўся, стрымліваючы прыступы ванітаў, каб усё ж такі зачыніць фортку.

Кот раз'ятрана кінуўся на хлопца, ягоныя вочы свяціліся чырвоным. Арсень закрычаў, і з крыкам у фортку вылецела мурашыная матка. Бяляш скокнуў следам, а мужчына прыціснуўся гарачым ілбом да халоднай шыбы.

У святле ліхтара стаяў той самы юнак, а насупраць яго выгінаў спіну, тапырыў поўсць і жудасна крычаў кот. Цень ягоны рос, ператвараючыся ў чорную, чарнейшую за яго самога пачвару.

З рук юнака струменілі блакітныя іскрынкі, складаліся ў дзіўныя знакі, чырванелі, разгараліся, нібы полымя.

Кот ішоў на юнака. Падобны да чорнай дзіркі цень — следам. Юнак выкінуў наперад рукі, і гіпнатычны малюнак закруціўся, пашырыўся, ахутваючы кашэчы цень. Кот, ахоплены полымем, з вусцішным лямантам панёсся прэч.

Юнак зірнуў на акно, ля якога стаяў збялелы Арсень, кіўнуў:

— Дабранач, — і знік у цемры завулка.

Недапалак

Палова на дзясятую — яна яшчэ паспявае. З-за спіны даносіўся рогат пакінутай кампаніі.

Ад кола агляду трэба спусціцца ўніз, прайсці праз невялікі масток, потым пад вялікім мостам — і вось яна ў Купалаўскім скверы. А там наўскасяк, зноў праз мост — шмат у гэтым горадзе мастоў — па Купалы да Багдановіча, і яна будзе дома.

Яна задуменна зірнула на недапалак між пальцаў: увесну іх стане мільярд, таму нічога, калі адзін сярод мільярда будзе яе. Сметніца надта далёка.

Наперадзе ззяла цемрай арка пад мостам, і яна смела рушыла ў змрок. Цемра Лізу ніколі не палохала, бо дзяўчына не баялася міфічных пачвар, яна баялася людзей. А палове на дзясятую з дзяўчынай не можа нічога здарыцца. Нехта штурхнуў яе, прымусіўшы рэзка ірвануць наперад, бегма. Тут налева — да фантана з дзяўчатамі.

Нешта не тое: незнаёмыя прысады, лаўкі, нават асфальт — у Мінску такога няма. Ліза павярнула назад, але мост знік, і Свіслач таксама. Засталіся толькі дрэвы: клёны, каштаны, ліпы. Ліза зноў пабегла — недзе наперадзе гудзеў праспект, толькі прысады не заканчваліся. Ні фантана, ні музея, ні помніка. Мільганула постаць у ярка-зялёнай камізэльцы — такія носяць супрацоўнікі «Зелянбуду» — і знікла раней, чым Ліза паспела гукнуць.

Як можна заблукаць у цэнтры Мінска? Няўжо Жэнька падмяшаў ёй у колу гарэлку? Унутры схаладнела, і Ліза дрыготкімі пальцамі дастала тэлефон. Няма сеткі. Патрэсла, перагрузіла. Мабыць, ад холаду глюкануў? Пацерла між далоняў, пахукала, пабегла.

Слёзы грэлі шчокі, сэрца стукала ў горле, замінаючы дыхаць, ногі не падпарадкоўваліся. Бацька не стане слухаць яе апраўданні. Зноў давядзецца скарыстаць цюбік таналкі за раз. Зноў пераапранацца на фізкультуру ў прыбіральні, асобна ад дзяўчат, і хаваць вочы ад суседзяў. Зноў...

— Хэй, — гукнулі яе. — Што здарылася?

Яна спалохана заціхла. Да яе крочыў юнак — адкуль толькі ўзяўся? — крыху старэйшы за яе, з цёмным ускудлачаным чубам, які выбіваўся з-пад каляровай скандынаўскай шапкі. Чаму менавіта цяпер?

— Усё добра, — хаваючы заплаканыя вочы, адказала Ліза.

— Вы першы раз у Мінску? — мякка пацікавіўся ён.

Зараз будзе смяяцца...

— Я тут жыву.

— Здымайце паліто, хуценька, — юнак падышоў бліжэй, узяў яе за локаць. — Я хачу дапамагчы. Вы не патрапіце дадому, калі не паслухаецеся. Зніміце паліто і апраніце навыварат.

Ліза нервова расшпіліла гузікі. Юнак зняў з яе паліто, вывернуў і зноў накінуў на плечы.

— А цяпер трымайцеся, — юнак працягнуў руку, — і не азірайцеся.

Ён упэўнена рушыў наперад. Ліза паслухмяна трымала яго цёплую далонь. Праз хвіліну яны выйшлі на ходнік недалёка ад Купалаўскага музея. Тэлефон у кішэні раззлавана гудзеў.

— Дзе цябе чэрці носяць?!



— Я падыходжу, падыходжу, — спалохана мармытнула яна, хоць разумела, што робіць сабе толькі горш.

— Калі цябе не будзе праз дзесяць хвілін, будзеш заходзіць праз акно.

Вусны па-здрадніцку задрыжэлі.

— Я падвязу, — спакойна заўважыў юнак.

* * *

У салоне было чыста, пахла добрай мужчынскай парфумай, мандарынамі і, амаль няўлоўна, палявымі кветкамі.

— Ваш бацька ў некаторым сэнсе меў рацыю, спытаўшы, дзе вас носяць чэрці. Наўрад ці вам паверацъ, але вас збіў са шляху лясун. Нашкодзілі неяк?

— Кінула смецце не ў сметніцу.

— Заўсёды апранайце што-небудзь навыварат, калі будзеце ісці праз гэты парк, бо ён ад вас цяпер не адчэпіцца. Лесуны часта водзяць людзей, якія непрыстойна сябе паводзяць, а погляды ў іх, скажам так, старамодныя.

У іншы дзень Ліза б пасмяялася і пакруціла пальцам каля скроні, але цяпер толькі пакорліва кіўнула.

— Поспехаў з бацькам.

Заставалася ўсяго хвіліна, каб узляцець на пяты паверх.

Атрута

Пад ногі кідаліся бардзюры, лаўкі і агароджы. Каржакаватыя яблыні заціхлі ў чаканні ахвяры. Толькі спыніся — разарвуць крывымі замшэлымі кіпцюрамі. Каваныя белыя альтанкі прывідамі плылі ўздоўж ракі. Напаўразбураная цагляная забудова глядзела з супрацьлеглага берага пустымі вачніцамі. Дар'я спынілася на драўляным мастку, што вёў да выспы з трыма самотнымі дрэвамі.

Сёння яна прачнулася ў чужой кватэры. Яе абудзіла немаўля, якое раўло пад бокам. Ля ног мітусіўся невялікі сабака. Не было ў яе ні сабакі, ні дзіцяці. Дар'я ўзнялася, узяла малую на рукі. У пакоі ляжалі дзіцячая вопратка, кнігі, цацкі. Леваруч — старая шафа з зацёртым люстэркам, праваруч — стол, застаўлены кветкамі. Хіба яна калі любіла кветкі? Выйшла з пакоя, пагушкваючы дзіцё. Сабака ўвязаўся за ёю, жаласна скуголячы. На безгустоўна зялёнай кухні сівая жанчына варыла каву. Дар'я аддала ёй дзяўчынку, накінула куртку і выбегла на вуліцу.

Яна не ведала, як апынулася ў парку, не памятала, куды вяртацца. Рака клікала: халодныя хвалі абнімуць яе, заплюшчаць вочы, загушкаюць. Вадзе ўсё адно, хто ты і кім быў учора. Галава кружылася, рабілася ўсё больш пустой, далягляд сціраўся. Сусвет звужаўся

да выспы з трыма дрэвамі і драўлянага мастка. Яна пералезла праз парэнчы. Яшчэ крок — і яе не будзе. Яе ўжо няма.

* * *

Сёння яна прачнулася ў чужой кватэры, падхапілася на ложку. У пакоі, прывідным ад тлення зёлак, было светла і пуста, пахла палыном. Пад столлю віселі пучкі сухацветаў: святаяннік, чабор, крываўнік, рамонак. Яна пазнала хіба дзясятую частку ўсяго, што калыхалася над галавой у гіпнатычным танцы. Коўдра і прасціна расшытыя чырвоным беларускім арнаментам, які быццам свяціўся знутры. Ніткі з люрэксам?

— Вам трэба ляжаць, — да яе зазірнуў юнак.

Не сівы барадаты дзядуля ў ільняной кашулі, не кабета ў хусцінцы ў кветкі, не загадкавая дзяўчына з уплеценымі ў касу валошкамі — звычайны юнак. У чорных спартыўных штанах, расцягнутай бардовай футболцы з надпісам «Wizards Rule» і ў цёплых вязаных шкарпэтках.

— Дзе я? Дзе мая дачка? Што здарылася?

Ён сеў побач з ёй, прымусіў легчы.

— З вашай дачкой усё добра, а вось з вамі — не вельмі. Вас атруцілі, — хлопец нешта вырашыў для сябе, цяжка выдыхнуў. — Лойма. Раней яны кралі дзетак і падмянялі на сваіх. Атрымлівалася, што звычайныя жанчыны няньчылі нячысцікаў. Цяпер размнажацца стала больш складана, таму яны падмяняюць саміх жанчын: атручваюць, прымаюць іх аблічча, займаюць іх месца і жывуць у асалоду.

Дар'я сціскала коўдру. Атрута, падмена, нячысцікі — усё гэта не змяшчалася ў галаве, але і інтэр'ер, і яе адчуванні, і сумныя бурштынавыя вочы юнака прымушалі паверыць. Жанчына заплакала.

Хлопец паклаў ёй на лоб халодную далонь, зашаптаў. Замест слоў яна чула шолах лістоты ў вечаровым лесе, лёгкі ветрык і стракатанне конікаў.

* * *

— А што я павінен быў сказаць? — юнак стаяў ля ложка, прытупваючы нагой.

— Нічога, Міхась! Нічога, акрамя замовы на ачышчэнне, — жорстка адказалі яму з калідора.

Там нешта зазвінела. Відаць, упала на палічку звязка ключоў. Зашамацела. Зняў куртку ці паліто. Запстрыкала. Расшнураваў боты.

Жанчына глядзела праз прымружаныя вейкі, не наважваючыся паказаць, што прачнулася. Перад ёй мільгануў цень, прыдалонне абхапілі моцныя пальцы, па целе разлілася цеплыня. Захацелася скакаць, танцаваць, бегчы. Яна расплюшчыла вочы.

Над ёй схіліўся юнак, з твару нават маладзейшы за Міхася.

— Галава не баліць? — холадна пацікавіўся ён.

— Не, я выдатна сябе адчуваю, — Дар'я села на ложку.

Ён кіўнуў, дастаў з кішэні і выставіў на стол некалькі невялікіх слоічкаў з попелам і дзіўнымі цэтлікамі. «Лойма. Люты 2019» сцвярджаў той, як жанчыне было добра відаць.

— Лошыца — няпросты раёнчык, — звяртаючыся да Дар'і, хмыкнуў ён.

Міхась закусіў палец, цыкнуў:

— Паслухай, Усевалад, чалавек мае права ведаць, што з ім адбываецца.

— Чым менш народу ведае пра нячысцікаў, тым лепш. Усім. Зможаш адвезці спадарыню дадому? Моўчкі.

Пачынаць

Пяць гадоў таму

Слуп шчэрыўся звярынымі пашчамі, глядзеў чалавечымі вачамі, свяціўся перапляценнямі Арнаментаў. Пад драўлянай адпаліраванай скурай перацякалі блакітныя іскрынкі. Вада, зямля, паветра, полымя, расліны, жывыя істоты. Шэсць элементаў Энергіі, з'яднаных разам, — сімвал іх Свету.

З даўніх часоў Ваяры абаранялі людзей ад Пачвар. Іх вымярэнне, створанае Богам Маланак і Навальніцы Перуном, можна было прайсці ўздоўж і ўпоперак за дзень. Яго называлі Унутраным Светам, але куды больш яно было падобнае да ціхага мястэчка, ізаляванага ад наваколля. У іх Свеце быў свой парадак, свае законы і звычаі.

Сённяшні дзень шмат значыў для ўсіх, каму гэтым летам спаўнялася васямнаццаць. Цяпер яны не павінны былі штодня пакорліва выконваць загады настаўнікаў, праводзіць час у бясконцых трэніроўках, штомесяц праходзіць выпрабаванні. Цяпер яны маглі вырашаць, кім быць далей: ці стаць шараговымі жаўнерамі і выконваць дробныя даручэнні ў Вонкавым Свеце, ці прысвяціць жыццё тэарэтычнаму вывучэнню Пачвар, ці займацца забеспячэннем побыту Свету і вырошчваць зёлкі, вырабляць абарончыя амулеты,

шукаць у Вонкавым Свеце адораных дзяцей. А маглі атрымаць ступень майстэрства. Майстры кіравалі Камандамі і выконвалі самыя небяспечныя, складаныя заданні, выхоўвалі вучняў і карысталіся пэўнымі побытавымі прывілеямі. І, вядома ж, толькі яны маглі ўвайсці ў склад Рады Майстроў.

У таго, хто наважыўся стаць Майстрам, наперадзе было яшчэ тры гады вучобы: адзін — пры Майстры, які выхоўвае вучня, два — пры Майстры, які кіруе Камандай. Але спярша — сумоўе, якое праходзіў не кожны.

— Міраслава, патлумачце нам, калі ласка, сэнс Першага закону, — холадна папрасіў Кіраўнік. — Толькі не трэба яго цытаваць. Не сумняваюся, што за дзесяць гадоў вы яго вывучылі.

У каменнай залі Рады было холадна і змрочна, вусцішна. За доўгім драўляным сталом сядзелі сямёра. Самая вопытная даследчыца Пачвар — Бажэна. Самы паспяховы паляўнічы — Вітольд. Самы таленавіты стваральнік Арнаментаў — Святаслаў. Найлепшая знаўца замоў і зёлак — Сняжана. Адказны за побыт і лад штодзённага жыцця — Радаўлад. Адказная за адукацыю і выхаванне Ваяроў — Васіліса. І Кіраўнік.

Міру палохаў гэты чалавек. Выдатная пастава, пругкая хада, прыхаваная ў густой сівой барадзе таямнічая ўсмешка. Дзяўчыне здавалася, што за срэбна-шэрым металам вачэй жыве жудасная драпежная істота, і Кіраўніку каштуе неверагодных высілкаў стрымліваць і ўтаймоўваць яе.

— Мы павінны абараняць людзей ад Пачвар. Тых, хто жыве звонку і не надзелены дарам Перуна, — упэўнена адказала Міраслава і коратка зірнула на Васілісу.

Тая прыхільна ўсміхнулася. Міраславе пашанцавала, што яе знайшла менавіта Васіліса. Ваяры забіралі адораных дзяцей зусім малымі. Сем-восем гадоў — самы падыходзячы ўзрост, калі дар ужо раскрываецца,

але яшчэ не позна вучыць ім карыстацца. Міраславу забралі ў дзевяць. Іншы б пакінуў — пазнавата, а Васіліса ўзялася.

У іх былі асаблівыя адносіны, не такія, як у іншых Ваяроў з вучнямі. Больш цёплыя, блізкія, нават сяброўскія. Тыдзень таму, пасля апошніх выпрабаванняў, яны ўдзвюх выпілі цэлую бутэльку віна, пазапраўна прыцягнутую са Знешняга Свету, і настаўніца распавяла, што чакае дзяўчыну на сумоўі.

— А вось ваш сябар, які быў тут перад вамі, сцвярджаў, што ўсё гэта вельмі спрэчна.

Багдан быў другім паводле паспяховасці, пасля зоркі-Златкі, але перад Міраславай. Ён выдатна валодаў зброяй, хутка прымаў рашэнні і нядрэнна кіраваў Энергіяй. У Багдана быў выдатны настаўнік, стары Ваяр, які правёў шмат часу звонку і забіў нямала Пачвар. Але ў яго былі свае погляды на стварэнне Свету, якія не адпавядалі афіцыйнай версіі. І ён, відаць, не патлумачыў вучню, што лепш пра іх нікому не распавядаць.

— «Як можна паверыць, што свет стварыў нехта, каго ніхто ніколі не бачыў?» — вось што сказаў ваш сябар. «Я б з большай ахвотай дапусціў, што нас стварылі вы, Кіраўнік», — мужчына адкінуўся на спінку крэсла і зарагатаў, але хутка зноў стаў суровым. — На шчасце, Майстар Вітольд згадзіўся ўзяць Багдана ў Падмайстры і ўкласці яму ў галаву тое, што не ўклаў настаўнік.

Дурань, Багдане. Заўсёды любіў правакаваць іншых. Знайшоў жа час — на выніковым сумоўі, дзе вырашаецца лёс! Пашанцавала, што Вітольд добра ведаў ягонага настаўніка, выратаваў доўбня.

— Багдан мне не сябар, Кіраўнік, — спакойна адказала Міраслава. — У Ваяроў няма і не можа быць сяброў. Тым больш я не падзяляю і не ўхваляю ягоныя

погляды. Я служу бацьку Перуну і гатовая служыць яму ўсё жыццё, якое б рашэнне вы цяпер ні прынялі.

Насамрэч, якая розніца, хто і як іх стварыў? Якая розніца, хто даў ім здольнасць забіраць Энергію ў Свету і ператвараць у зброю? Мабыць, яны ўвогуле існавалі заўсёды. Мабыць, яны з'явіліся першымі. А потым у Ваяроў пачалі нараджацца дзеці без дару, звычайныя людзі, якія не маглі абараніцца, і тады свет падзяліўся на два. Хто ведае? Гэта не мае значэння, бо важна толькі тое, што тут і цяпер.

— Але я разлічваю, што вы накіруеце мяне да найлепшага Майстра, каб гэты год быў такім жа паспяховым, як гады навучання ў Настаўніцы Васілісы.

Кіраўнік шматзначна хмыкнуў. Міра ўявіла, як нацягнуўся павадок, што ўтрымлівае істоту ўнутры яго.

— Тут усе найлепшыя, прапануеце нам таксама выпрабаванні прайсці?

Міраслава разгубілася. Варта было ўсё ж крыху ўтаймаваць сваё нахабства. Што цяпер яму адказаць?

— Калі дазволіце, Кіраўнік, — падала голас Васіліса. — Асноўная мэта гэтага года навучання — паглядзець, як іншы настаўнік выхоўвае вучня. Міраславе патрэбны не найлепшы Ваяр, а той, у каго найлепшы вучань.

— Майстар Людавіт? — прапанавала Сняжана.

Міра скаланулася. Яна чула, што Людавіт прымушае вучня стаяць босым на вуглях ды спаць на вуліцы ўзімку.

— У нас ёсць адзін спадар, які робіць поспехі, большыя за Янавы. Вучань Майстра Святаслава.

Малады чалавек, які дагэтуль быў заняты размалёўваннем аркуша для нататак, холадна зірнуў на Васілісу.

— Дзякуй за гонар, Майстарка Васіліса, але я не думаю, што гэта добрая ідэя.

— А я думаю, — заўважыў Кіраўнік. — Пойдзе на карысць не толькі Міраславе, але і вам з Усеваладам. Бо вы хутка лбамі зрасцяцеся. Вырашана. Збірайце рэчы, Міраслава, Майстар Святаслаў зойдзе за вамі ўвечары. І паклічце наступнага.

* * *

Сон не ішоў. Міра ўжо даследавала хату: агульны пакой, ванная, тры спальні — усё як ва ўсіх, усё на сваіх месцах. Бездакорная чысціня — нічога цікавага. Міры карцела пазнаёміцца з «найлепшым вучнем». Златка распавяла, што Усевалад можа ствараць Сімвалы адным позіркам і адчыняць праход у Вонкавы Свет. Ціхамір — што ён цэліць з арбалета з заплюшчанымі вачамі і трымае меч у левай руцэ так жа добра, як у правай. Багдан толькі назваў Святаслава і яго вучня самаўпэўненымі вырадкамі.

Святаслаў не падаўся ёй такім. Ён паводзіў сябе стрымана, але ветліва. Адзінае што — настойліва прасіў не заходзіць у пакой вучня без дазволу, але Міра не магла ўтрымацца.

Пакой апынуўся нават меншы, чым выдзелілі Міраславе. Ложак, ля акна стол і крэсла, на якім акуратна былі складзеныя рэчы. Хлопчык спаў на баку, паклаўшы правую руку пад галаву. Коўдра спаўзла, закрываючы яго толькі па пояс. Спіна, рэбры, плечы, рукі былі спрэс у жоўта-фіялетавых сіняках, касцяшкі збітыя ў кроў. Рукі ад локцяў да пальцаў у блакітных стужачках, падобных да маланак, — апёкі ад Энергіі. Бываюць, калі хапаеш больш, чым трэба, альбо занадта спяшаешся.

Унутры ўсё сціснулася ад хвалявання: калі Майстар так шмат патрабуе ад вучня, ці не будзе ён чакаць

ад Падмайстаркі яшчэ большага? Сама вінаватая — не варта было прасіцца да найлепшага.

Васіліса рабіла акцэнт на духоўнае, а не на фізічнае навучанне. Калі Міра атрымлівала падчас заняткаў траўмы, настаўніца пазбаўляла яе ад болю Арнаментамі альбо зёлкамі, казала: «Яшчэ натрываеш». І вось што, відаць, мела на ўвазе.

Міра наблізілася. Хлопец павярнуўся ў сне. На яго левым прыдалонні быў выбіты Сімвал жыцця. Ваяры рэдка набівалі татуіроўкі, а такіх Міраслава ўвогуле ніколі не бачыла: пад скурай быццам мігцелі вугельчыкі. Пальцы міжволі пацягнуліся дакрануцца, памацаць, упэўніцца, і чым бліжэй была яе рука, тым больш чырвонымі рабіліся вугельчыкі, нібы на іх нехта дзьмуў. Міра амаль дакранулася, калі яе адштурхнула да сцяны пругкая плынь Энергіі. Хлопец сеў на ложку, закрываючы правай далонню левую руку. У позірку яго перамяшаліся боль, расчараванне і стома.

У пакой, скрыжаваўшы рукі, увайшоў Майстар Святаслаў і сурова зірнуў на дзяўчыну. Яна напружылася, рыхтуючыся да вымовы альбо пакарання, але Майстар перавёў позірк на вучня. Той узняўся, ціха вымавіў:

— Я прашу прабачэння, Настаўнік.

— Ты павінен ставіць абарону кожны вечар, а не калі табе гэтага захочацца.

— Я забыўся, — падлетак зусім не выглядаў вінаватым.

— Ты не забыўся, свавольнік, ты не захацеў. Што б ты рабіў, калі б гэта быў вораг, а твая Энергія не спрацавала б інтуітыўна? Мае загады ў гэтым доме не абмяркоўваюцца і не парушаюцца. Гэта тычыцца і вас, спадарыня Міраслава.

Святаслаў казаў жорстка, але спакойна, не павышаючы голас. Міру гэта палохала і зачароўвала. Зачароўвалі яго халодныя шэра-блакітныя вочы, моцныя

рукі, скрыжаваныя на грудзях, няўхвальна падціснутыя вусны і падбароддзе з ямкай.

— Прабачце, Майстар Святаслаў, — збянтэжана прамармытала дзяўчына.

Мужчына кіўнуў, зноў звярнуўся да Вучня.

— У цябе хвіліна, каб паставіць абарону.

— Мне трэба паспаць, каб аднавіцца.

Ваяры пазычалі Энергію ў Свету. Бралі з паветра, з полымя, з вады, з зямлі, з раслін, з жывых істот і перанакіроўвалі, ператваралі ў Сімвалы, у Арнаменты, з дапамогай якіх знішчалі Пачвар, біліся з ворагамі і абаранялісся. Але Энергія цячэ да Энергіі. Каб пазычаць у Свету, Ваяр павінен мець хоць колькі сваёй.

— Мяне гэта не цікавіць. Не можаш скарыстаць Энергію — прыдумай што-небудзь іншае. Хвіліна пайшла, — Святаслаў вывеў Міраславу з пакоя, трымаючы за плячо.

— А пракантраляваць? — шэптам спытала дзяўчына.

— Не раю вам правяраць, ці выканаў ён загад, Міраслава. Кладзіцеся спаць. Дабранач.

* * *

Міраславу абудзіў рогат. Яна здзіўлена ўтаропілася ў сцяну, спрабуючы ўсвядоміць, дзе знаходзіцца. Успомніла, вызірнула ў акно. Там Святаслаў і Усевалад гулялі ў квача. Учора ўвечары суровы настаўнік выгаворваў вучня за непадпарадкаванне, а сёння яны гуляюць…

Хлопчык спыніўся пад яе акном.

— Выходзь хутчэй. Ён карае за спазненне на трэніроўку.

— Не бачу, каб яна пачалася, — здзекліва заўважыла Міра, але паспяшалася прыслухацца да парады.

Святаслаў сурова ацаніў яе гатоўнасць: скураная вопратка, праз плячо — арбалет, на поясе — кінжал, некалькі льняных пакуначкаў з зёлкамі. Кіўнуў.

— Здымайце ўсё. Моц Ваяра не ў зброі. Арбалету патрэбна адлегласць, кінжал, наадварот, дапаможа толькі на блізкай дыстанцыі. Гэта, — на яго далоні расцвіла кветка Сімвала полымя, — спрацуе ў любым выпадку.

— Не ў любым, — дзёрзка адрэзаў Усевалад і ўдарыў настаўніка рабром далоні па руцэ.

Яны счапіліся ў бойцы. Біліся па-сапраўднаму, не шкадуючы і не стрымліваючыся. Святаслаў быў відавочна больш моцны, Усевалад — больш хуткі. Ні заўваг, ні парад. Перарывістае дыханне, рэдкія выгукі, кароткія позіркі, ледзь заўважныя выразы твараў. Міраславе было васямнаццаць, на два гады больш, чым Усеваладу, але так яна не ўмела.

Навошта Васіліса, любімая настаўніца, падштурхнула яе сюды? Мабыць, заўсёды лічыла, што Міра не такая ўжо здольная вучаніца?

Святаслаў прыціскаў вучня да зямлі каленямі і адной рукой, у другой зноў круціўся Сімвал полымя. Усевалад закусіў вусны і беспаспяхова намагаўся вызваліцца.

— У чым памылка? Дзе памыліўся, Вал? — цяжка дыхаючы, спытаў настаўнік.

— Праваронію абарону, — ледзь чутно адказаў хлопчык.

— Зноў, — мужчына дапамог вучню ўзняцца. — Ты нападаеш, і гэта добра, бо ты моцны, але не забывай пра абарону. На кожнага моцнага знойдзецца альбо больш моцны, альбо больш хітры. Зразумеў, свавольнік? Добра. Міраслава, падмяніце мяне, калі ласка.

— Я? Ды я хвіліны не пратрымаюся, — разгублена прамармытала дзяўчына.

— Сёння — не, заўтра — так. Толькі Сімвалы. Міраслава нападае, Усевалад абараняецца. Наперад, — ён пляснуў у далоні.

Яна прымусіла сябе сабрацца. Гэта прасцей, чым біцца. Выкарыстанне Сімвалаў давалася ёй лёгка: вобразы ўсплывалі ў галаве, Энергія паслухмяна скіроўвалася туды, куды трэба, рукі рабілі неабходныя рухі. Сімвалы дазвалялі Энергіі канцэнтравацца, задавалі слушны кірунак, акрэслівалі мэту, якой Ваяр хацеў дасягнуць. Міра стварыла некалькі Сімвалаў запар: Полымя, Маланка, Сонца. Полымя і Сонца не кожнай Пачвары маглі прынесці сур'ёзную шкоду, падпаліць шкурку альбо асляпіць на час. Маланка была больш небяспечнай: драбязу дык забівала на месцы. Ваяру Сімвалы пагражалі толькі фізічным болем, паводле адчуванняў параўнальным з апёкам.

Не паспелі яшчэ Сімвалы зляцець з рук Міры, як Усевалад крутануў перад яе носам стандартны абярэг Ваяроў, Перунову Зорку. Міра раззлавалася. Пры якіх абставінах увогуле магчымая такая сітуацыя? Ваяр супраць Ваяра... Бязглуздзіца. Альбо Пачвара будзе абараняцца Перуновай Зоркай? Не, не будзе. Міра спрабавала трымаць сябе ў руках, бо злосць — не лепшы дарадца.

— Пляці Арнамент, — кінуў ёй Усевалад.

Арнаменты — спалучэнне Сімвалаў, створаных адначасова — часцей пляліся Камандамі. Толькі самыя здольныя Майстры маглі плесці іх самастойна. Арнаменты мелі куды большую эфектыўнасць, чым Сімвалы паасобку, ды выкарыстоўваліся звычайна супраць самых небяспечных Пачвар. Адзіным не баявым Арнаментам, наколькі ведала Міраслава, быў абаронны. Але Васіліса не вучыла яе нават гэтаму. Міра разгублена азірнулася на Святаслава. Той стаяў, скрыжаваўшы рукі, стрыманы, халодны.

— Я не ўмею, — нясмела заўважыла яна.

— Тады падмані мяне, — фыркнуў юнак. — Нападай.

Падмануць яго. Лёгка сказаць... Маланка, Сонца, Полымя, Маланка і зноў — толькі ў іншым парадку. І зноў. Яна стоміцца раней за яго. У кожнага Ваяра ёсць пэўны аб'ём Энергіі, які ён можа пазычыць за раз. Міраслава на свае здольнасці не скардзілася. Да сённяшняга моманту.

Перунова Зорка круцілася, хоць ён яе нават не трымаў, знішчаючы Сімвалы на падлёце. Але з часам пачала блякнуць, паміргваць, і Міра ўзрадавана павялічыла дождж з Сімвалаў. А калі зразумела, што ўвесь гэты час рабіў Усевалад, было позна. Зорка знікла, і ён за секунду разгарнуў абарончы Арнамент, якому пазайздросціла б любая Каманда. Сімвалы бумерангам скіраваліся да дзяўчыны. Яна ледзь паспела выставіць абарону, слабую, на што хапіла моцы, таму адляцела назад, нібы лялька, і добра б выцялася, калі б яе не падхапіў Святаслаў.

— Разлічвай моц, свавольнік! Выдатная праца, Міра.

Крама

Датчык руху нічога не бачыў, сігналізацыя не спрацоўвала. Вокны, дзверы — усё зачыненае, але раніцай у памяшканні быў вэрхал. У міліцыю звяртацца бессэнсоўна, бо што яны зробяць? Выклікала святара, які асвяціў памяшканне. Па яго парадзе паставіла па кутах абразы, павесіла крыж. Праз тры дні зноў вазоны на падлозе, кветкі паабламаныя, цэтлікі скамечаныя, паўсюль зямля. Абразы скінутыя, крыж дагары нагамі. Знаёмая параіла схадзіць да шаптухі, нават адрас дала. Тамара не верыла ні ў шаптух, ні ў экстрасэнсаў, але пайшла.

Хата была зусім не падобная да той, у якой павінна жыць шаптуха: нядаўна адбудаваны, сучасны катэдж з вялікімі вокнамі. У двары прыпаркаваны чорны джып, каля ганка стаіць ваяўнічая снежная баба з вядром на галаве і рыдлёўкай у руцэ. Дзверы адчыніла жанчына гадоў сарака ў расцягнутым світары і джынсах. Правяла ў светлую сучасную гасцёўню.

— Што вас непакоіць? — далікатна звярнулася яна, нібы да дзіцяці альбо да хворай.

— Мне трэба выгнаць з крамы палтэргейст, — гучала Тамара сапраўды як хворая.

— Гэта не да мяне.

— Мне сказалі, што вы шаптуха.

— Я — Знахарка. Я не палюю на пачвар, але, — яна таямніча ўсміхнулася, дастала з кішэні мабільны, — ведаю тых, хто палюе.

* * *

Тамара з цяжкасцю ўяўляла, чым ёй могуць дапамагчы два падлеткі.

Сур'ёзны, ветлівы ды выхаваны Міхал, які размаўляў з ёй, выклікаў яшчэ хоць нейкі давер. Але другога, дзівака ў рваных джынсах, які замёр над вітрынай з кактусамі, хацелася выставіць за дзверы.

— Вам трэба будзе сысці...

— Не, хлопцы, — яна была гатовая да такой просьбы, — я хачу ведаць, што вы тут робіце.

Раптам гэтыя сучасныя шаманы абрабуюць яе — і на гэтым уся магія?

— Ваша прысутнасць можа перашкодзіць працы, — акуратна заўважыў Міхась.

— Я. Не. Сыду.

— У такім выпадку мы вымушаныя вам адмовіць.

Той, што разглядаў кактусы, выпрастаўся. Утаропіўся ў яе, нібы яна таксама зялёная ды ў іголках.

— Досыць, Міхась, не жасці.

— Вал, ты сам казаў: людзі не павінны ведаць!

— Хочацца чалавеку ў Навінкі — што з гэтым зробіш?

* * *

Пад яе крэслам пульсаваў чырвоным дзіўны сімвал: восем выцягнутых ромбаў складаліся ў кветку, па баках ззялі яшчэ чатыры невялічкія ромбы. Выходзіць за межы сімвала ёй забаранілі. Міхась мітусіўся па краме, правяраючы, ці добра курацца зёлкі ў керамічных місах. Усевалад расслаблена сузіраў архідэі. Асабліва яго цікавілі тлустыя зялёныя карані, што тырчалі з празрыстых гаршкоў. Мітусня Міхася яго не кранала.

— Архідэі — эпіфіты. Яны чапляюцца каранямі за дрэвы і ўзнімаюцца вышэй да сонца. А кактусы — сукуленты. Запасаюць вільгаць унутры сваіх цел і потым могуць доўга знаходзіцца без вады, як вярблюды, — каб заняць сябе хоць нечым, пачала распавядаць Тамара.

— Усё прыстасоўваецца, каб выжыць, — меланхалічна паціснуў плячыма Усевалад.

І зноў змоўк на доўгія хвіліны. Міхась нервова паглядваў на гадзіннік.

— Што, калі сёння нічога не адбудзецца? — спытала Тамара.

— Нічога не адбудзецца, — рэхам паўтарыў Усевалад.

Адна з гліняных місак саслізнула на падлогу. Хлопцы ўмомант сабраліся. Мітуслівы матылёк і лянотная клякса ператварыліся ў дзве нацягнутыя спружыны. Міхась сціскаў у кулаку запальніцу, Усевалад круціў між пальцаў кароткі паляўнічы нож.

Шэрая істота, падобная адначасова да ката, сабакі і малпы, шаснула ад аднаго стэлажа да іншага, паўсюль натыкаючыся на зёлкі, наблізілася да Усевалада. Нож маланкай прыбіў істоту да прылаўка за хвост. Істота зайшлася ў такім скавытанні, што Тамары давялося заціснуць вушы.

Іх стала шмат. Тузін, калі не больш. Шэрыя, чорныя, рудыя, пярэстыя аблезлыя стварэнні. Некаторыя чамусьці ў абутку, пераважна ў кедах, іншыя — заматаныя шалікамі хакейных клубаў ці ў непрапарцыйна вялікіх кепках з надпісам «OBEY». Яны раз'ятрана валілі з паліц кветкі, білі вазоны і рвалі пакункі з глебай, імкнучыся насыпаць яе юнакам у вочы.

Адзін нават учапіўся за Міхасёву руку, хоць зусім не Міхась быў галоўнай пагрозай. Усевалад. І яго арбалет. Балты бязлітасна працінялі пачвар, пакідаючы

ад іх купкі попелу. Пачваркі люцелі і настойліва імкнуліся дабіць усё, што не знішчылі за месяц.

Але Усевалад управіўся хутчэй.

— Архідэі — эпіфіты, кактусы — сукуленты, а Злыдні — нячысцікі, — на развітанне прамармытаў ён. — Яны заводзяцца ў хатах скупых ды зайздрослівых людзей. Цэны знізьце, карацей.

* * *

Пярэсты чорна-белы голуб касавурыўся пляскатым вокам у вокны на трэцім паверсе. Праз шыбу ён добра чуў гутарку юнакоў. Сёння нічога асаблівага. Голуб прылятаў некалькі разоў на тыдзень, глядзеў, слухаў, вывучаў іх звычкі і манеры.

Знахар дома насіў яркія цішоткі са смешнымі прынтамі і цёплыя шкарпэткі. Ваяр апранаў чорныя спартыўныя касцюмы. Знахар спаў пад цяжкай цёплай коўдрай і летам, і зімой, яго ложак стаяў у глыбіні пакоя. Ваяр летам спаў не накрываючыся, а зімой пад тонкай коўдрачкай. Яго ложак стаяў каля самага акна. Знахар абураўся, калі Ваяр пакідаў пасля сябе брудны посуд. Ваяр злаваўся, калі Знахар марнаваў час на сацыяльныя сеткі. Зранку Знахар сыходзіў ва ўніверсітэт, Ваяр — на прабежку. Знахар вяртаўся а чацвёртай і клаўся спаць, Ваяр у гэты час кіраваўся на працу ў фітнес-клуб непадалёк. Позна ўвечары яны разам выходзілі ў горад, вярталіся пад раніцу. Па серадах і пятніцах Знахар наведваў курсы англійскай мовы, а Ваяр выходзіў у горад адзін.

Знахар смачна гатаваў і вельмі любіў чысціню. Ваяр штовечар выстаўляў у кватэры абарону з Арнаментаў і не цяміў, што пагроза можа быць звонку. Пагроза можна зазіраць у вокны пляскатым птушыным вокам.

Ружы

Бляклыя штучныя кветкі глядзелі на яе з усіх бакоў, падобныя да прывідаў. Рамонкі, сланечнікі, півоні — не адрозніць. Аднолькавыя, аднолькава мёртвыя. Ніколі іх не любіла, але цяпер несла сама, бо нядобра, калі свежая магіла без кветак. Што людзі скажуць? Каля крыжа не затрымалася, толькі даліла гарэлкі, паплакала крыху і назад. Доўга ехала ў 68-м аўтобусе. Далёка да Паўночных могілак, але што зробіш? У яе цяпер вольнага часу хапае.

На вуліцах свята вясны, паўсюль цюльпаны ды мімозы. Жывыя. Жывыя трупы. Набыла галінку мімозы, як ён некалі, паставіла ў вазу, а побач — яго здымак.

«Што мне цяпер, Тосечка? Куды мне? Хіба што за табой... Адна я, зусім адна. Як я буду?»

Дзяцей Бог не даў, сяброўкі — хто дзе. Большасць засталася ў вёсцы, а яны з Анатолем паехалі ў сталіцу, за лепшым жыццём. З'ела яго тое жыццё, не папярхнулася. Цяпер толькі працаваць дзень і ноч, абы кватэру аплачваць і не звар'яцець. Быў чалавек — ды няма. Прыйшоў з працы, лёг тэлевізар глядзець, заснуў і не прачнуўся.

«Не магу я, Тося, без цябе. Забяры мяне...»

Ёй ніхто не адказаў, але яна ведала, што сказаў бы муж.

* * *

— Дурная ты баба, Людка, — Анатоль глядзеў з папрокам. — Налівай. Чаго равеш? Радавацца трэба.

Выпіў чарку, пажаваў агурок.

— Ты Міколу перадай: як ён пазыку табе не верне, дык я сам па яе прыйду. Так і скажы, Людка, так і скажы.

Яна моўчкі наліла мужу яшчэ гарэлкі. У спальні грукнулі дзверы шафы.

— Пінжак мой любімы выкінула? Навошта?

Людміла пераражагналася і схапілася за сэрца.

— Спалохалася? Хіба я цябе крыўдзіў калі?

Не крыўдзіў. Добра жылі, нават калі перапіваў. Іншыя дык рабіліся злыя, агрэсіўныя, а яе Тосечка ласкавы, мяккі, нібы кацяня. Быў.

— Добрая ты ў мяне баба, Людка, — у перапэцканых пальцах з абламанымі пазногцямі ён круціў чарку. — Стамілася толькі, усё на твае плечы. Нічога, Людка, я цябе забяру з сабой. Чаго равеш? Дурная ты баба, Людка. Сама ж прасіла.

* * *

Яна, раскудлачаная, у хатнім адзенні, бегла да царквы. Пэўна, не дапаможа, але больш няма куды. Ад яе пахла могілкамі, мёртвымі бляклымі кветкамі. Пахла смерцю.

Яна не хацела смерці. Па-сапраўднаму — ніколі. Плакала, галасіла, а як інакш? Клікала яго, бо смуткавала. Клікала яго, а наклікала яе. Да царквы заставалася зусім крыху, і яна чула яго. Ён там, у яе за спінай. На плячо апусцілася цяжкая рука, у вачах пацямнела.

Ачуняла на могілках. Анатоль цягнуў яе да раскапанай, расчыненай труны.

— Не плач, Людачка, патрывай. Хутка нам будзе добра. Разам.

Яна чаплялася за мёрзлую сакавіцкую зямлю пазногцямі. Мільгалі перад вачыма, дражніліся яркія штучныя ружы. Хто прынясе кветкі на яе магілу? Хто ўвогуле заўважыць, што яе больш няма?

Яны раптам запаліліся ў цемры. Два пільныя белыя вокі. Ліхтары.

— Сюды! Дапамажыце! Ратуйце!

— Дурная баба! — прароў Анатоль.

Ліхтары згаслі, сакавіцкая глеба пахла холадам. Жанчына амаль нічога не бачыла. Чула.

Тупат. Збітае дыханне. Удары. Шэпт. Жывёльнае выццё таго, што калісьці было яе мужам.

—Яна мая! Мая!

Яна сціснулася. Нехта закрыў яе сабой.

— Міхась, прэч!

Анатоль схапіў яе за лыткі, пацягнуў у труну.

— Мая-а-а!

Яркае святло. Цішыня.

Яна ляжала на дне магілы. Побач — перапэцканыя ў брудзе штучныя ружы.

Дурная ты баба, Людка.

Спайс

Міхась сядзеў, падабраўшы ногі, абхапіўшы калені рукамі. Вусны разбітыя, на скуле драпіна. Час ад часу кранаў яе, незадаволена цыкаў і зноў заміраў. Знахарка села насупраць, падсунула яму кубак гарбаты. Міхась цяпер рэдка заходзіў, толькі калі тэрмінова патрэбны былі зёлкі, якія нечакана скончыліся, альбо калі неабходна было адпачыць ад тыранічнага сябра.

— Так далёка вашы сваркі яшчэ не заходзілі…

Хлопец стомлена зірнуў на яе.

— Гэта быў Непрытомнік. Вал кожную вясну могілкі правярае. Сёлета пачвары разышліся, што называецца, на ўсе застаўкі. Я хацеў, як лепш, але…

— Дык гэта не Усевалад?

— Ён. Ай, я так тлумачу па-дурацку… Карацей, я перашкодзіў яму працаваць, палез пад руку. Непрытомнік кінуўся на жанчыну, а я закрыў яе сабой. Замест таго каб валіць пачвару, яму давялося ратаваць мяне. Атрымалася замінка. Небяспечная… Ну ён і заляпіў мне па твары. У выхаваўчых мэтах, як ён сам кажа. Ну, ты ж ведаеш Вала…

Жанчына пашкадавала, што Міхасёў бацька на сустрэчы па працы. Яму заўсёды было прасцей знайсці патрэбныя словы, каб падтрымаць сына. Яна ж магла толькі злавацца на самаўпэўненага Ваяра, які ставіўся да адоранага Знахара як да ўласнасці.

— Ён павінен быць удзячны проста за тое, што ты побач. Ты не ягоны падначалены, нават не вучань. Хаця і гэта не апраўдвала б гвалт!

— Я якраз недзе паміж, Ядзя, — хмыкнуў Міхась, ізноў дакрануўся да драпіны. — Дробязь, зажыве. Ёсць для нас навіны?

— Здаецца, не. Хіба што... Учора прыходзіла жанчына. Сын не можа злезці з наркаты. Я на нячысцікаў не падумала — людзі самі спраўляюцца. Але калі ты кажаш, што яны разышліся...

* * *

Цемра глядзела ў вочы, абдымала дзясяткам ледзяных далоняў, казытала сотняй вузлаватых пальцаў. Холадна. Яго не адпусціць. Ён увесь час будзе тут, прыкуты, прывязаны да яе. Горача. З ключыц, з рэбраў рос лес. Вакол плёскалася бясконцае мора, бяздоннае, салёнае, балючае. Яго вывернулі вонкі і павесілі сушыцца, як пасціраны заплечнік. Холадна. Ён бачыў уласныя вантробы. Рознакаляровыя сабакі лізалі яму пяткі вясёлкавымі языкамі. Маці з пацучынай пысай замест твару кусала яго пальцы. Горача. Белыя, тонкія, як ніткі, чарвякі тачылі яго сэрца, чорныя зубы цемры ўгрызаліся ў косткі. Цела гарэла, лес гарэў. Холадна. Чарцяня, парослае рэдкай жорсткай поўсцю, цягнула да яго лапкі, задаволена рохкаючы. Трымай яшчэ крыху чароўнага зелля. Без яго ты нішто.

* * *

Пахла вішняй, вішнёвым вэйпам. Зацягнуцца б разок. Хто даведаецца? Металічны корпус прыемна лёг у далонь, палец сам намацаў кнопку. Толькі раз.

Усевалад выбіў вэйп у Міхася з рук, сунуў замест яго арбалет.

— Гэта Апівень. Калі мяне пачне глючыць — страляй.

Усевалад даўно навучыў яго карыстацца гэтай штукай і нярэдка ладзіў трэніроўкі. Аднак у нячысціка Міхась яшчэ ні разу не страляў.

— Хіба Апівень не па алкаголі спецыяліст?

— Эвалюцыя, — Усевалад пацісну́ў плячамі.

Апівень чапляўся да людзей, схіляючы іх да п'янства. На кожным застоллі — няпрошаны госць. Падліваў, пакуль не бачаць, дражніў п'яных, учыняў бойкі. Але галоўная мэта Апіўня — выпрацаваць залежнасць. Толькі ў сферы алкаголю ніякаму нячысціку з людзьмі не спаборнічаць. Трэба шукаць іншыя сферы ўплыву, тым больш цяпер гэтых сфер дастаткова: цыгарэты, наркотыкі, інтэрнэт.

Істота з'явілася знянацку: невялікая і на першы погляд нават мілая, падобная да рагатага парсючка, які стаіць на задніх лапках. Задаволена рохкнула, вывучаючы Усевалада.

Няўжо ў Ваяра ёсць слабасці? У чалавека, які ніколі не прапускае ранішнюю прабежку, які не спрабаваў ні алкаголю, ні тытуню. У таго, хто п'е гарбату без цукру і не любіць салодкае, на чыім тэлефоне ніводнай сацыяльнай сеткі.

Пакуль Усевалад плёў Арнамент, Апівень памножыўся. Іх стала пяцёра, і ўсе яны агідна вішчалі ды здзеклі́ва крывілі лычы. Усевалад забіў аднаго, і яшчэ, і яшчэ. На месцы кожнага забітага з'яўляліся два новыя.

Вал з зацятасцю сапраўднага Навальнічніка нішчыў іх аднаго за адным. Вочы гарэлі. Ён выглядаў усё больш апантаным, а Энергія рана ці позна скончыцца... Вось табе і слабасць Ваяра. Відаць, Усевалад нешта такое пра сябе ведаў, раз загадзя даў арбалет. Патрапіць бы.

Міхась падышоў бліжэй. Запахла вішняй, у роце перасохла, рукі трэсліся. Ён падняў вэйп з падлогі. Раз зацягнецца — і ўсё вырашыць. Толькі раз.

«Я дзіўлюся тваёй цярплівасці», — сказаў яму бацька, калі даведаўся пра іх сварку з Усеваладам.

Міхась не лічыў сябе стрыманым альбо цярплівым і ўсе выбрыкі сябра прабачаў толькі таму, што любіў сваю справу. Ганарыўся тым, што яны робяць.

Юнак кінуў вэйп на падлогу, наступіў кедам і скіраваў арбалет на нячысцікаў. У якога страляць?

— Не лезь пад руку! — рыкнуў Усевалад. — Я сам разбяруся.

Міхась зірнуў на ашалелага сябра і зразумеў. Трэба было толькі разлічыць моц. Добра заехаў яму ў скронь так, што Усевалад пахіснуўся і, згубіўшы прытомнасць, упаў. Колькасць Апіўняў імгненна паменшала да аднаго. Міхась стрэліў.

Па целе разлівалася прыемная цеплыня. Управіўся з залежнасцю ад курэння, адолеў нячысціка, адолеў лепшага сябра, управіўся з залежнасцю ад лепшага сябра. Сёння адназначна ягоны дзень.

Бачыць

Пяць гадоў таму

— Мам, паслухай!

— Разувайся, хутка. Ці я цябе разуваць павінна? — у калідоры пачулася валтузня.

— Мам! У Ліны выпаў зуб, вось тут. Яна паклала яго пад падушку, а зранку замест яго знайшла манетку. Ёй зубная фея прынесла, уяўляеш?

— Не вярзі лухты, ёй манетку паклала мама. Ты дарослая дзяўчына, табе ўвосень у школу. Няма ніякіх фей, чараўнікоў, вядзьмарак і прывідаў. Спыні гэтыя размовы раз і назаўсёды.

— Ты казала, што Дзеда Мароза няма, а ён мне ляльку падарыў! — са слязьмі ў голасе закрычала малая.

— Ён ужо дзесяць разоў пра гэта пашкадаваў!

Міхась рэфлекторна сціснуўся, загарнуў падручнік, па якім рыхтаваўся да экзаменаў, што чакалі наступным летам. Ён сапраўды думаў, што дарма зрабіў той падарунак. Асабліва калі маці пра гэта нагадвала.

— Ты мяне не любіш! Ты злая!

Разгарнуў кнігу недзе пасярэдзіне і пачаў чытаць уголас, абы не чуць, што будзе далей, абы не ўлезці, бо стане толькі горш. Потым пагутарыць з малой, калі маці не будзе побач.

— Ах ты дрэнь няўдзячная!

Пачуўся пляскач, і малая зарыдала. Маці ніколі не кранала Агнію. З ім нярэдка распускала рукі, але з малой стрымлівалася. Раней. Ён падхапіўся і вылецеў у калідор.

— Не лезь, Міхал! Яна і так у цябе панабіралася. Я вам самае лепшае: цацкі, тэлефоны, камп'ютары — усё, што хочаце. А мне прылятае: ты злая. Як ты там мяне назваў апошні раз? Вар'ятка! Ды вы не ўяўляеце, што такое вар'яцтва. Я вас дваіх адна цягну. Працую ад ранку да вечара. І хоць бы раз хто «дзякуй» сказаў.

— Паспрабуй рукамі менш махаць, — стомлена заўважыў хлопец. — Можа, скажам.

— Ты мяне яшчэ павучы!

Маці рушыла да яго. Міхась зрабіў крок назад, апынуўся ў сваім пакоі, нервова каўтнуў. Добра, што яна пераключылася з Агніі на яго, дрэнна — усё астатняе.

— Мам, не кранай Міхася. Ён абараняе мяне…

— Як вы адно за аднаго! Удваіх супраць мяне адной. Дык у два разы больш і атрымаеце.

— Мам, — хлопец збялеў. — Толькі не Агнія, калі ласка.

— Вы хіба разумееце па-іншаму?! — у яе ў кішэні завібраваў мабільны. — Я з вамі не скончыла…

Сышла на кухню пагутарыць. Міхась закусіў вусны, стрымліваючы эмоцыі. Як заўсёды, усё павярнулася яшчэ горш, чым ён чакаў. Падхапіў сястру на рукі.

— Не плач, Агеньчык. Яна цябе не кране, абяцаю.

Трэба раззлаваць яе так, каб яна забылася на існаванне дачкі і сканцэнтравалася на ім адным. Што-што, а давесці маці да шаленства — не праблема. Праблемы пачынаюцца адразу потым. Нічога, патрывае, абы не Агнія. Малая ўсхліпнула, выцерла вочы, прыціснулася да брата.

— Давай сыдзем ад яе?

У Міхася пахаладзела ўнутры. Надта сур'ёзна, па-даросламу гэта гучала. У шафе, між скрынак з абуткам, даўно ляжаў новы чорны заплечнік, кампактны, зручны, чакаў свайго часу. Там грошы, цёплая вопратка, паўэрбанк, некалькі кансерваў і пачак ролтана. І нумар тэлефона, па якім ён тэлефанаваў апошні раз, калі нарадзілася Агнія. Слухаўку так і не знялі.

* * *

Кніга са стукам апусцілася на стол. У святле лямпы круціліся віхуры пылу. Мужчына ў старым світары, які калісьці быў чорным, адкінуўся назад у крэсле і закінуў ногі на стол.

Віктар не любіў лета. Яго сляпіла яркае святло, а гарачыя прамяні награвалі галаву так, што немагчыма было думаць. Увосень ды ўвесну было волка ды брудна, а зімой ніводныя ваўняныя шкарпэткі не ратавалі ад холаду. Холад быў унутры.

Віктар не любіў людзей. Істэрычных, зайздрослівых, нахабных, самаўпэўненых, слабых, баязлівых, крыклівых, мітуслівых, хлуслівых, эгаістычных, здрадлівых і навязлівых — усіх аднолькава. Але быў той, каго ён не любіў больш за астатніх, — ён сам.

І пустэча яго дома, што стаяў за кіламетр ад амаль вымерлай вёскі, і пустэча яго самога ўвесь час наводзілі на думкі, што трэба ўсё гэта заканчваць, але бракавала смеласці.

Штораніцы расплюшчваў вочы, адкрываў ноўтбук і да ночы выконваў замовы, пісаў коды, шукаў памылкі. Але сёння ён дазволіў сабе выхадны. Кубак моцнай чорнай кавы, добрыя цыгарэты, утульная цемра пакоя і самае галоўнае — кніга. Кнігі ён любіў, яны дазвалялі яму на час забыць пра сябе.

Недзе на адной з кніжных паліц зазваніў тэлефон. Віктар не хацеў адказваць. Выхадны. У яго выхадны. Але пальцы самі свайпнулі зялёнае колца ўверх.

— Слухаю, — ледзяны тон, каб у суразмоўцы адпала жаданне што-небудзь замаўляць.

— Тата?! Ты адказаў!

Мужчына ўтаропіўся ў сцяну. Гулка тахкала сэрца.

— Міхась?

— Мне трэба пагутарыць. Асабіста. Вельмі прашу. Толькі гадзінку. Калі ты не захочаш больш мяне...

— Я не магу цябе бачыць, — шэптам працягнуў мужчына. — Сынок, нам нельга. Я не магу прыехаць. Яна не...

— Я еду сам, — цвёрда адрэзаў сын. — Ты ж на хутары? Ты можаш праз гадзіну сустрэць на прыпынку? Я памятаю, дзе выходзіць, але па цемры баюся пераблытаць сцежкі.

— Сем гадоў прайшло, — мужчына страпянуўся, нібы прачнуўся. — Набяры мяне яшчэ раз, як будзеш пад'язджаць.

Яны ішлі ўздоўж трасы да павароту на вёску. Хударлявы падлетак у клятчастай кашулі і маленькае дзяўчо ў джынсавым сарафанчыку. Віктар углядаўся ў паўзмрок. Не, гэта не ён. Надта высокі, надта дарослы. Ды і што за малая з ім?

Нешта пацягнула, штурхнула зрабіць крок насустрач, выйсці з ценю прыдарожных хмызнякоў у святло ліхтара. Хлопец імгненна кінуўся абдымацца, зарыўся вострым падбароддзем у плячо, учапіўся пальцамі ў світар, быццам баяўся ўпасці. Віктар ледзь крануў вуснамі ўскудлачаныя валасы. Ад сына пахла горадам, пыльным аўтобусам, фаст-фудам і яе любімым кандыцыянерам для бялізны.

— М-м-м, тат, знаёмся, гэта Агнія. Твая дачка.

Віктар недаверліва зірнуў на Міхася. Малая збянтэжана хавалася за братам.

— У сэнсе?

— У адзіным магчымым. У дакументах пазначана, што «бацька запісаны са слоў маці», але яна твая. Калі... Калі ты з'ехаў, мама была цяжарная.

Мужчына павольна выдыхнуў, прысеў насупраць дзяўчынкі.

— Рады пазнаёміцца, Агнія.

* * *

Агнія расплюшчыла вочы ў спадзяванні, што гэта не сон. І драўляныя бэлькі замест бездакорна белай бетоннай столі былі найлепшым доказам. Брат спаў неспакойна, круціўся, скрыгатаў зубамі. Значыць, зноў мроіць жахі. Трэба ўстаць і прынесці яму вады.

Малая села і ледзь стрымала віскат. У дальнім куце пакоя, за старой шафай, корпаўся маленькі, з твару падобны да бацькі мужычок. Ён акуратна збіраў павуцінне, накручваючы яго на руку. Вялікія скруткі складаў у мех каля ног.

— Не пішчы, хлопча, — мармытаў ён камусьці. — Аднясу цябе ў хлеў, будзеш там жамяру есці. Ужо дастаткова цёпла, няма чаго ў хаце бруд разводзіць. Не, выбачай, павуцінне не аддам. Новага сабе наробіш, а з гэтага я шкарпэткі сабе звяжу, на восень.

Агнія разгублена штурхнула брата ў бок.

— Міхась! Міхась, тут нейкі маленькі мужык у хаце. Павуцінне збірае.

Брат, не расплюшчваючы вачэй, прыцягнуў яе да сябе, вымушаючы легчы, прыабняў.

— Гэта начны жах, Агеньчык. Спі.

— Гэта ў цябе начныя жахі. А ў мяне мужык у хаце! Рэальна.

* * *

Дарога была небам, Агнія — самалётам. Яна бегла наперад, раскінуўшы рукі, і тарахцела, нібы турбіны. На дарозе-небе заставаўся пясчаны след.

На вялізным камені пад дзікай вішняй ляжаў юнак, закінуўшы нагу на нагу і трымаючы ў роце травінку.

— Ах ты ж, Юрачка, што не жэнішся? Прыйдзе зімачка — дзе падзенешся?

Доўгія светла-русыя валасы запраўленыя за крыху адтапыраныя вушы, адзіная цёмная пасма выбілася з-за правага вуха і падала хлопцу на нос. Ён настойліва спрабаваў яе здзьмуць, каб не казытала. Агнія засмяялася. Хлопец падхапіўся, здзіўлены яе прысутнасцю.

— Мяне завуць Агнія. А цябе?

Ён агледзеўся, быццам яна магла звяртацца да каго іншага.

— Юрась.

— Дык ты пра сябе пяеш?

— Мо і пра сябе. А мо проста пяю.

— Ты прышпільны, — Агнія ўладкавалася на камені побач з хлапцом.

Брат забараняў ёй кантактаваць з незнаёмцамі, але Юрась выглядаў бяскрыўдным і надта цікавым. Яны крыху пасядзелі моўчкі, разглядаючы адно аднаго. У Юрася былі вялікія жоўта-зялёныя вочы і прыгожая выразная ўсмешка, таму тварык нечым нагадваў пыску ката.

— У цябе ў хаце ёсць дамавы? — раптам спытала малая.

— Хатнік? — хлопец здзіўлена зірнуў на Агнію. — У мяне няма хаты, то і хатніка няма.

— Дзе ж ты жывеш?

— Дзе пашанцуе.

— Я магу папрасіць бацьку, каб ён дазволіў табе жыць з намі…

— Мне няма чым аддзячыць.

— Будзеш распавядаць мне пра ўсякіх хатнікаў, — адмахнулася дзяўчына.

* * *

Усё пакрысе наладжвалася: маці надзіва лёгка, без істэрык і пагроз судом дазволіла ім правесці лета з бацькам, а сама выправілася з чарговым залётнікам на Кіпр; бацька намагаўся бавіць як мага больш часу з дзецьмі; малая перастала яго бянтэжыцца ды баяцца. Міхась нарэшце адчуваў сябе дома.

Агнія, відаць, таксама, бо прыцягнула аднекуль ката. Звычайнага вясковага ката, шэрага, з адным цёмным вухам, нахабнага, як танк. Бацька дазволіў яму жыць у пуні, хоць яна доўга ўпрошвала пусціць «чалавека» ў хату.

Называла яго чамусьці Юрасём, а на пытанне «Чаму ў ката чалавечае імя?» справядліва адказвала: «Таму што яго так завуць». Міхася кот раздражняў: невядома, колькі хвароб можна падхапіць ад блыхасціка. Але хлопец не хацеў быць падобным да маці, з якой бессэнсоўна было заводзіць размовы пра хатніх жывёл. Нават на тое, што Агнія новага сябра залішне ачалавечвае, ён заплюшчыў вочы. Агніі патрэбна было недзе схавацца ад рэзкіх змен у жыцці, ёй патрэбны быў сябар. Каб яна яшчэ не рабіла дурасцей…

Сястра сядзела на галіне яблыні, даволі высока, і боўтала ножкамі ў жоўтых кедах, чухаючы адной рукой кату за вухам.

— Агеньчык, ты як туды трапіла?!

— Юрась мяне падсадзіў.

— Ён не мог. У яго лапкі!

— У цябе ў самога лапкі... Юрась распавядае мне цікавосткі. Напрыклад, ёсць такая істота — хлеўнік. Ён даглядае свойскую жывёлу. Але калі яго не паважаць, ён робіцца злы: крыўдзіць жывёлін, кудлаціць, заблытвае поўсць, крадзе сена, малако забірае!

— Неверагоднае паскудства, — саркастычна заўважыў Міхась. — Як ты збіраешся злазіць?

— А ведаеш, як ад яго пазбавіцца?

— Развесіць паўсюль часнок? Папырскаць свянцонай вадой?

— Няправільна, — сястра свяцілася ад задавальнення. — Трэба павесіць над дзвярамі хлява забітую сароку.

— Фу-у-у, Агеньчык! Каго трэба павесіць, каб пазбавіцца гэтага блыхастага пацягайлы?

Кот фыркнуў пакрыўджана, быццам зразумеў.

— Юрась — чалавек. Чаму ты мне не верыш?

— Ува што я павінен верыць? У тое, што гэты пухнаты пархацік — пацан, які ведае, як управіцца з разлаваным хлеўнікам? Май на ўвазе, Агнія, каты ўмеюць толькі залазіць наверх. А я цябе здымаць не буду, — Міхась пашыбаваў дадому, за лесвіцай.

— Юрась не кот!

* * *

Шарэла. Трава пакорліва і мякка клалася да яго ног. Хлопец спрабаваў рабіць невялікія крокі і захопліваць паменш травы, як паказаў яму бацька. Дыхаў роўна і размерана, каб даўжэй не стамляцца. Каса лётала з боку ў бок, падпарадкоўваючыся ды здымаючы роўныя пасмы.

— Не цяжка? — занепакоена ўдакладніў бацька, які працаваў поруч.

— Нармальна.

— Агнія сказала, вы сёння пасварыліся.

— А яна не ўдакладніла, што залезла ўслед за катом на дрэва? — раздражнёна пацікавіўся Міхась. — І адтуль вярзла лухту пра мёртвых сарок.

— Мабыць, не варта ставіцца да гэтага як да лухты?

— Скажы яшчэ, што Юрась — чалавек.

Бацька змаўчаў. Чуўся толькі рытмічны свіст дзвюх кос.

Першыя дні Міхась бянтэжыўся размаўляць з бацькам свабодна. Казаў вельмі стрымана ды ветліва, але з часам расслабіўся і нават пачаў дазваляць сабе дзёрзкасці, якія з маці дакладна прывялі б да скандалу. Бацька іх быццам не заўважаў.

— Адна справа, калі яна верыць у зубную фею ці чакае ліст з Хогвартса. Іншая — калі яна распавядае мне, як забіць хлеўніка, — нарэшце прамармытаў Міхась.

— Ведаеш, я часта разважаю пра веру, — акуратна падбіраючы словы, пачаў Віктар. — Нам здаецца: мы адмаўляем тое, чаго не бачым. А насамрэч, можа…

— Не бачым тое, што адмаўляем? Мо да нас і іншапланецяне прыляталі?

— Хто можа давесці, што не? — бацька спыніўся, сеў на скошаную пасмачку, прапанаваў сесці побач. — Гэта ўсяго толькі пытанне веры.

— Можа і Зямля была плоская, пакуль у гэта верылі?

— У некаторым сэнсе — так, — задуменна ўсміхнуўся мужчына, разглядаючы аблокі.

— Бацька! Вера не ўплывае ні на фізічныя законы, ні на законы прыроды. Я ў гэтым упэўнены.

— А вось у чым упэўнены я, — мякка адказаў Віктар. — Цуды не здараюцца з тымі, хто ў іх не верыць.

Міхась задуменна паглядзеў на бацьку, усміхнуўся.

— Дарэчы, пра цуды. Ты не бачыў Агнію? Ужо даволі позна…

* * *

— Агнія?!

Яны з бацькам скіраваліся ў супрацьлеглыя бакі надзелу. Міхась нервова грыз пазногці. Якой дурасцю было думаць, што гэтая гарэза будзе спакойна сядзець у альтанцы і маляваць, пакуль яны ўдвух косяць.

З шэрасці на яго зірнулі ўважлівыя жоўта-зялёныя вочы.

— Цяпер павінна з'явіцца ўсмешка, Чашырскі ты кот! Куды малую падзеў?

Пыска ката зрабілася спалоханай. Ён памяўся з лапкі на лапку, азірнуўся ды пабег. Міхась крочыў следам. Кот безупынна варушыў вусамі і вушамі, збіраючы навакольныя звесткі. Шукаць малодшую сястру з дапамогай ката… Прывітанне, вар'ятня.

Хвастаты выйшаў да возера, у якім яны некалькі разоў плёскаліся ў спякотныя дні. Малая сядзела ля самай вады і набірала яе ў трохлітровы слоік. Навошта дзіцяці ўночы слоік азёрнай вады?!

— Агнія!

Кот стаў упоперак дарогі, зашыпеў на юнака.

— Пайшоў прэч! Агнія!

Кот адскочыў, прыпаў да зямлі, натапырыўся, выгнуў спіну.

Малая, пачуўшы вокрык, рэзка ўзнялася, згубіла раўнавагу і паляцела ў ваду. Нервова забоўталася. Яе цягнула на глыбіню.

Міхась рашуча кінуўся да сястры. Вада апынулася надзіва халоднай. Ногі блыталіся ў водарасцях, вопратка хутка набрыняла і агідна ліпла да цела. Рухацца

было цяжка. Ён наблізіўся наколькі мог і працягнуў сястрычцы руку, але яна не выпрастала сваю. Міхась зрабіў яшчэ некалькі крокаў, схапіў малую за плечы.

— Яны трымаюць мяне! Міхась, калі ласка! Прыбяры іх.

Сястра зарыдала. Так шчыра, спалохана, адчайна, што не паверыць ёй было немагчыма. Ён на імгненне зажмурыўся, а як толькі расплюшчыў вочы — убачыў. Доўгія зялёныя валасы, цёмная напаўпразрыстая скура, блакітныя халодныя вочы, сукенкі з ціны. Яны шчабяталі, нібы птушкі, ляскалі па вадзе далонямі і ступнямі, цягнулі малую на сярэдзіну возера ды рагаталі, вісклівa, непрыемна.

— Пайшлі прэч. Вяртайцеся на дно, адкуль з'явіліся, — цвёрда і спакойна загадаў Міхась.

Істоты імгненна зніклі пад цёмнай паверхняй вады.

Малая плакала, абдымаючы брата за шыю халоднымі ручкамі.

— Я хацела налавіць табе вадамерак, каб ты паверыў. Яны магічныя — яны ходзяць па вадзе.

Міхась шчыльна прыціснуў сястру да сябе, пацалаваў у лоб і рушыў да берага. Па ім, стараючыся не набліжацца да вады, усхвалявана хадзіў юнак у льняным адзенні. Як толькі яны выйшлі з вады на зямлю, ён кінуўся да Агніі.

— Стаяць! — тон Міхася быў халаднейшы за азёрную ваду. — Каб я цябе побач з ёй не бачыў, пацягайла блыхасты.

Валацуга

Шампунь, гарбата, вараная бульба, мытая падлога — ажно галава разбалелася ад усіх гэтых водараў, бо даўно не адчуваў і адвык.

— Можа, яшчэ? — ягоны выратавальнік заклапочана зірнуў на пустую талерку.

— Дык суседу ж вашаму пакіньце…

— Сусед сабе яшчэ прыгатуе, — юнак паклаў яму некалькі бульбін і смажаных каўбасак, уладкаваўся ў крэсле насупраць. — Працягвайце, калі ласка.

— Дзякуй. На чым я спыніўся? — разгублена ўдакладніў Генадзь.

Так прыемна было есці, карыстаючыся відэльцам і нажом.

— Вы пазнаёміліся з анёлам…

— Дакладна. Пазамінулым летам я пазнаёміўся са Сцешай. Яна была… Хвалістыя валасы, худзенькая, вочы вялікія-вялікія. А як яна спявала! Я клянуся табе — можна ж на ты? — клянуся, нават анёлы так не спяваюць. Карацей, сышліся. Я разумеў, што трэба маладой таленавітай прыгажуні ад бізнесмена ва ўзросце. Разумеў ды не разумеў. Мне нібы мозг дасталі і на яго месца яшчэ адно сэрца ўсунулі. Альбо не сэрца, калі ты разумееш, пра што я. Раней я ціха займаўся сваёй справай. А з ёй… Па барах, па клубах. Куды яна — туды я. Хочаш — сукенку за пару соцень, хочаш — пярсцёнак з каменьчыкам, хочаш —

у Парыж на выхадныя. Дах мне знесла канкрэтна... Падсеў на казіно. Аўтаматы, рулеткі, покер — похер. Прабач. А там і кампанія адпаведная знайшлася. Цыгары, віскарык, усё такое. Чым больш мы марнавалі грошай, тым больш нам хацелася. Бізнес прыбраў да рук мой партнёр, а мне і справы не было. Я весяліўся, пакуль грошы не скончыліся. А як скончыліся, дык прадаў машыну, усе свае гадзіннікі, срэбра. Яе ўпрыгожанні не чапаў, шкада было. Прадаў катэдж, пачаліся пазыкі. Звязваўся з тымі, з кім не варта было. І яна сышла... Думаеш, гэта мяне ацвярозіла? Хрэн там. Усё стала толькі горш. Піў, гуляў, пакуль зусім да торбы не дайшоў. Ды каму я распавядаю? Я цябе сёння абрабаваць хацеў. Гляджу — мажор на татавай тачцы. Думаю, сяду ў машыну, цюк па галаве ды выкіну дзе ў завулку. А лепш прыеду да хаты, цюк па галаве... Карацей, во гарбаты тваёй выпіў — толькі тады адпусціла.

Хлопца яго прызнанне не напалохала. Ён прыбраў брудную талерку, даліў гарбаты.

— Вы ведаеце, дзе яна можа быць цяпер?

Мужчына не паспеў адказаць, бо ў кватэру, абтрасаючы з красовак бруд, увайшоў сусед юнака.

— Усевалад, у нас госці.

— Хто на гэты раз?

— Здаецца, Бадзюля.

— Якая яшчэ «бздзюля»? — абурыўся Генадзь.

Міхась зарагатаў. Усевалад прашыбаваў на кухню, забраў у мужчыны кубак, доўга вывучаў яго далоні. Потым схапіў за падбароддзе, утаропіўся ў вочы. Зусім нахабства. Генадзь паспрабаваў вызваліцца, але марна.

— Як даўно ты жабрак?

Пытанне «Калі вернеш пазыку?» і тое гучала больш прыемна.

— Паўгода недзе.

— Шанс ёсць. Міхась, рыхтуй усё. Хутка, — наліў сабе гарбаты. — Як звалі?

— Генадзь Аляксеевіч.

— Ды не цябе. Яе.

— Стэфанія.

— Хм, забаўна. Звычайна яны скрозь Эсмеральды, Серафімы ды Эмануэлі, — кінуў кубак у ракавіну. — Міхась, гатова?

Сярод залі на падлозе ляжаў ліст фанеры, у які было забіта з сотню цвічкоў. Між імі нацягнутыя каляровыя ніці, якія, перакрыжоўваючыся, блытаючыся ды ўвінаючы адна адну, стваралі мапу Мінска. Міхась схіліўся над ёй, стоячы на каленях, і акуратна правяраў нацяжэнне кожнай нітачкі.

Усевалад дастаў з кішэні сцізорык, разануў Генадзеву далонь. Кроў ад аднаго дотыку юнака згусла, ператварылася ў пластылінавы шарык. Хлопец апусціўся на падлогу побач з Міхасём, змясціў шарык у цэнтр мапы і паставіў далоні, нібы грэў над вогнішчам. Па нітках пабеглі блакітныя іскрынкі. Крывавы шарык зрушыў з месца, кудысьці ў кірунку вакзала, павярнуў на Лошыцу, і зноў павярнуў — на Серабранку. Спыніўся ў раёне ўнівермага «Беларусь».

— У мяне матчына кватэра на Пляханава. Была, — нясмела заўважыў Генадзь. — Я яе на Сцешу перапісаў, ды толькі яе там няма.

Усевалад зірнуў на яго спадылба, узняўся.

— Сёння ж з'язджай з горада. Нічога свайго не бяры. Бо калі я яе сёння не заб'ю, заўтра яна заб'е цябе.

— Хто, Сцеша?

Юнак моўчкі паказаў на дзверы.

* * *

За гады, што яны працавалі разам, Міхась навучыўся рабіць дзве рэчы: выконваць самыя вар'яцкія загады Усевалада і адчыняць любыя дзверы за хвіліну. Другое, праўда, давалася прасцей, бо не заўсёды Вал свае загады тлумачыў. Бывала — бракавала часу, але куды часцей бракавала жадання. Міхасю давялося запомніць: калі Усевалад кажа, што для знішчэння Пачвары павінна быць зроблена тое і гэтае, яно павінна быць зроблена. І менавіта ў такой паслядоўнасці, якой бы дурасцю гэта ні здавалася. Адным нячысцікам хапала арбалетнага балта між вачэй, іншых трэба было выганяць доўгімі замовамі і складанымі рытуаламі, і брудная праца нярэдка даставалася Міхасю. Але яно было таго варта.

У кватэры, на шчасце, нікога. Юнак скінуў у калідоры заплечнік, паліто, закасаў рукавы кашулі. Некалькі разоў вымыў падлогу, выцер пыл, вынес смецце. Абкурыў кватэру святаяннікам, прачытаў замову. Тут дакладна не схаваецца.

Замёр пасярод калідора ў маўклівым чаканні. Звычайная кватэра, шараговая двухпакаёўка ў спальным раёне. Маленькая кухня, на якой немагчыма гатаваць удваіх, яшчэ меншая ванна, дзе альбо пральная машына, альбо ракавіна. На гаўбцы шклянкі, шмат гадоў не карыстаныя лыжы, таямнічы куфар, у якім, хутчэй за ўсё, старое адзенне. Але паўсюль, паўсюль штучныя атрыбуты багацця: на кухні — грувасткая кававарка ды процьма крыштальнага посуду, у ваннай — люстэрка на палову сцяны ды расстаўленыя па ўсіх паверхнях араматычныя свечкі, а ў гасцёўні — цяжкія аксамітныя шторы, расшытыя залатымі карункамі, каб схінуць іх ды не бачыць вэрхал на гаўбцы.

Міхась быў перакананы: людзі самі прыцягваюць нячысцікаў. Да тых, хто баіцца згубіць дзяцей, прыходзяць лоймы. Да тых, хто баіцца нябожчыкаў, — непрытомнікі. Да тых, хто баіцца галоты, — бадзюлі. Мабыць, людзі не толькі прыцягваюць, але і ствараюць нячысцікаў?

Усевалад скінуў «бамжа», значыць, ідзе. Міхась трэці раз вымыў падлогу і выскачыў з вядром вады на вуліцу. Да пад'езда, круцячы сцёгнамі, крочыла сапраўдная прыгажуня. Міхась коратка зірнуў на яе і, шэпчучы замову, выплюхнуў брудную ваду на захад.

Выродлівая лупатая жанчына, уся ў воспінах ды язвах, калматая, неахайная, апранутая ў брудную дзіравую анучу, жудасна завіскатала і кінулася бегчы. Але яе ўжо чакаў Усевалад.

«Клянуся, нават анёлы так не спяваюць...»

Нічога, яшчэ зажыве.

* * *

Усевалад задуменна ствараў у паветры ланцужкі Сімвалаў, знішчаў ды ствараў наноў. Міхась зачаравана глядзеў на гэта.

— Калі ты яшчэ раз прыцягнеш дадому якога-небудзь валацугу — я скарыстаю гэтыя Сімвалы на табе, — падаў голас Усевалад.

Міхась фыркнуў. Нічога ён не зробіць.

— Адчапіся, Вал. Я плачу за гэтую кватэру роўна палову.

— Не ты, а твой бацька.

За апошнія месяцы нагаджалася зашмат працы, зашмат нячысцікаў, нават для Усевалада. Як бы Ваяр ні быў апантаны сваёй справай, яму таксама патрэбны адпачынак. Стомлены ён рабіўся проста невыносным.

Каб не працягваць бязглуздую спрэчку, Міхась палез у тэлефон. Што там сёння адбылося, у гэтым рэальным свеце? Дыханне перахапіла.

— Вал! Мінскі збяднелы бізнесмен знойдзены забітым на «Барысаў-Арэне».

Сімвалы палыхнулі ў паветры.

— Халера! Дапазычаўся. Маглі ўлічыць…

— Зашмат здарэнняў апошнім часам, нібы нячысцікі сцякаюцца ў горад.

— Не шукай апраўданняў, — раздражнёна адрэзаў Усевалад. — Знішчыць Пачвару не заўсёды значыць уратаваць чалавека. Мы мусілі памятаць. Я. Мусіў памятаць.

Абаронца

— Трымаем яшчэ трыццаць… Дваццаць… Трымаем-трымаем. Засталося чатыры. Тры. Дзве. Добра, выходзім з планкі.

Ён лёгка ўзняўся, паправіў валасы, што казыталі лоб. Юля ведала ў ім кожную рысу. Цішотка з надпісам «Цярпенне. Праца. Талент», белыя найкі, пільныя шэра-зялёныя вочы, татуіроўка на левым прыдалонні. Пяць ромбаў кветкай — адзін пасярэдзіне, чатыры па баках. Каб яе разглядзець, спатрэбілася некалькі заняткаў і яшчэ вечар, каб знайсці ў сеціве некалькі згадак, што гэта сімвал чысціні.

Ён ні з кім не камунікаваў па-за межамі працы, але за месцы ў яго жаночых групах — іх было толькі дзве — хіба што не біліся. Таму што ён быў сімпатычны, таму што ён нікога не ўгаворваў. Раз ты займаешся, значыць, гэта трэба табе. І таму што ён ніколі не казаў таго, што так любілі ўжываць у якасці матывацыі іншыя трэнеры: «Давайце, дзяўчаты, вы ж хочаце быць прыгожымі, падабацца мужчынам».

Яны захоплена вывучалі кожную цягліцу, прагна лавілі рэдкія ўсмешкі і са скуры вылузваліся, каб пачуць тры галоўныя словы: «Правільна, малайчына, працягвай». Юля заўжды была ў першых шэрагах, але не сёння. Яна б не пайшла на занятак наогул, калі б не адчувала, што трэба пераключыцца. Трэба хаця б на гадзіну вызваліць галаву ад думак. На жаль, занятак

дапамагаў слаба. Настолькі, што па заканчэнні да яе падышоў трэнер.

— У цябе штосьці здарылася?

Юля сумелася. Дзяўчаты, пакідаючы залю, узнагароджвалі яе зайздрослівымі позіркамі.

— Прабачце, Усевалад Святаслававіч, я сёння ўся ў сваіх думках.

— Дык што здарылася? — ён не збіраўся сыходзіць без дакладнага адказу.

— У мяне ўчора хаскі ў лес уцёк. Шукалі палову ночы — так і не знайшлі.

— Я магу дапамагчы?

Юля разгубілася яшчэ больш. Заляцаецца? Не будзе ж ён проста так дапамогу прапаноўваць...

— Я была б удзячная.

* * *

Недапалкі, абгорткі, бутэлькі, цыгарэтныя пачкі — у лесе было па-вясноваму брудна. І светла, празрыста. Лес добра праглядаўся, і Юлі было відавочна: сабакі тут няма, але трэнер зазіраў пад кусты, у яры ды канаўкі.

— Віскі, хлопчык, хадзі да мяне! — клікала дзяўчына.

Ён нават на мянушку ўвагі не звярнуў. Любы іншы б пасмяяўся: «Вашага хаскі завуць Віскі?» Не, сабака яго мала цікавіў. Тады навошта ён тут? Няўжо дзеля яе?

— Вы ўяўляеце, якіх памераў хаскі? Вы не ёрка шукаеце і не чыхуахуа!

— Я ведаю, што шукаю, — холадна адрэзаў Усевалад.

— Дык і што гэта? Я таксама павінна ведаць!

Маўчанне. Не, ён тут не дзеля яе. І не для таго, каб шукаць сабаку. Тады навошта? Трэнер упэўнена ішоў

наперад, і Юля за ім ледзь паспявала. Спыніўся. У зараснiках лазняку шарэла нешта пухнатае, на поўсці былі добра заўважныя барвовыя плямы.

— Не! Не можа быць! — яна тарганулася да кустоўя, але Усевалад спыніў яе.

— Не рухайся.

Пачулася глухое гырканне. Дзяўчына зноў кінулася наперад.

— Стой на месцы!

Трэнер зірнуў на яе, як на апошнюю дурніцу, закрыў сабой. Рык паўтарыўся. З-за дрэваў на іх ішоў вялікі шэры сабака. Не Віскі, здзічэлы. Юля сказала б, што гэта быў воўк, але адкуль у Мінску ваўкі? Поўсць месцамі павыдзіраная, месцамі — у крыві, аголеныя іклы — чырвоныя.

— А каб цябе Пярун ляснуў, — вылаяўся трэнер.

У руцэ бліснуў кароткі паляўнічы нож. З глузду з'ехаў, тут хіба стрэльба дапаможа. Усевалад варухнуў вольнай рукой. Запахла паленай ігліцай і гарачай глебай. Тонкая стужка Арнаменту акрэсліла кола.

— За межы не выходзіць, — заўважыў трэнер і зрабіў крок наперад.

Сабака, ляснуўшы зубамі, скочыў да Усевалада. Той выставіў наперад далонь. Пырснулі ва ўсе бакі блакітныя іскрынкі. Звер, скуголячы, катаўся па зямлі. Усевалад уторкнуў нож у глебу лязом угару. Сабака раз'юшана шчэрыў іклы, пад поўсцю былі бачныя моцныя, напружаныя цягліцы, вочы свяціліся. Сабака скочыў. Усевалад зрабіў крок насустрач, учапіўся ў поўсць на шыі. Драпежнік ляскаў іклямі ля яго твару. Не дацягваўся зусім крыху.

Юля не крычала — паветра скончылася. Стаяла і глядзела шклянымі вачамі, па шчоках каціліся слёзы.

Трэнер напружыўся, узняў сабаку ў паветра і штурхнуў. Той дагары лапамі праляцеў над нажом. Са-


N

бачы вой ператварыўся ў чалавечы крык. Усевалад прыціскаў да зямлі сівога аголенага мужчыну, усяго ў драпінах ды ўкусах.

— Хто цябе абярнуў?

— Што? Ты хто, прыдурак? Якой халеры я ў лесе?

— Што ты памятаеш апошнім?

— Мы з мужыкамі пайшлі па піва разліўное. Да Жанкі. Гэтая ведзьма папрасіла скрынкі нейкія ў падсобцы перасунуць. А мне што... Раптам перападзе? — ён драпежна зірнуў у бок дзяўчыны. — Ну, ты разумееш...

— Не, не разумею. Завязвай з алкаголем, — Усевалад адпусціў мужчыну, развярнуўся да Юлі. — Твой сабака не ўцёк, ён кінуўся абараняць цябе і выратаваў жыццё.

Назаўтра крама «Жывое піва» была зачыненая, а ў Юлі пад дзвярамі скуголіў руды дваровы шчанюк, на ашыйніку якога была пазначаная мянушка — Морс.

* * *

Яна таропка крочыла праз прысады, падымаючы вышэй каўнер фірмовай курткі «Зелянбуду», усхвалявана азіралася. Ці не крочыць хто следам? Ёй здавалася, што праз імгненне пачуе за спінай цвёрдыя ўпэўненыя крокі Ваяра, яго пагрозлівае размеранае дыханне, адчуе на сабе Перунова полымя.

Правадыр будзе расчараваны. Ён жа прасіў правяраць ахвяр. Ён прасіў сачыць, каб іх шляхі як мага менш скрыжоўваліся са шляхамі Ваяра. Пакуль. Яшчэ рана. Нельга, каб Ваяр выйшаў на кагосьці з іх цяпер. У Мінску на ўсіх людзей хопіць... Але адкуль яна магла ведаць, што абернуты ёй ваўкалак нападзе менавіта на гэтую дзяўчынку? Адкуль яна магла ведаць,

што ейны сабака кінецца яе ратаваць? Адкуль яна магла ведаць, што гэты пракляты Ваяр апынецца яе трэнерам ды прапануе ёй дапамогу? «Ты магла прасачыць», — з папрокам скажа правадыр, сумна падціскаючы вусны. Ён не будзе лаяцца, не будзе кідацца пагрозамі, нават голас не ўздыме. Толькі ціха заўважыць: «Гэта наша агульная справа. Калі рызыкуеш ты — рызыкуюць усе. Калі ласка, будзь асцярожней».

Жанна будзе. І кожны, хто можа выходзіць на вуліцы, хаваючы аблічча за вобразам гарадскога садоўніка, кожны — будзе. Яны ўсе баяцца Ваяроў. Яны разумеюць, што ў горадзе пакуль адносна бяспечна. Яны ведаюць, што пагроза можа з'явіцца ў любы момант. Яны ўпэўненыя, што выратаваць іх можа толькі правадыр. «Гэта наша агульная справа», — скажа ён.

Новы Час

У розны час

Галлё дрэваў хвастала па твары, пырскала ў вочы халоднымі кроплямі дажджу. Карані хапалі за лыткі, не давалі бегчы на поўную моц. Лес адчайна спрабаваў утрымаць яе. Яна блытала сляды, спынялася ненадоўга, толькі каб даць адпачынак збітым нагам, хавалася ў цёмных вільготных ярах.

За спінай гуло і буркатала. Вялізныя пачварыны вырывалі з зямлі дрэвы, адно за адным, давілі ўсё, што траплялася ім на шляху: траву ды кустоўе, жывых істот. Бяздумна забіралі жыццё, нібы не бачылі. Старая бяроза з вусцішным стогнам абрынулася на зямлю. Дом знікаў, паміраў на яе вачах. Якая Гаёўка без гаю? Якая Гаёўка без сясцёр? Без вясёлых карагодаў на ўзлеску, без вечаровых спеваў у вершалінах дрэваў?

У яе ўцёках не было ніякага сэнсу. У новым свеце, дзе замест звілістых і таямнічых сцежак будзе праставаць асфальтавая траса, ёй няма месца. Яна глядзела, як металічная жоўтая пачварына з выпнутай разяўленай пашчай рушыць на яе. Ёй было боязна, але яна хацела, каб усё гэта хутчэй скончылася, каб больш не трэба было ўцякаць, спінай адчуваючы смерць радзімы. Пачварына раўла, чмыхала, торгалася. Гаёўка заплюшчыла вочы. Хутчэй бы.

Нешта ўчапілася ў плечы. Яна больш не дакраналася зямлі нагамі. Вялізны, пакрыты залатой лускай Цмок узнімаў яе над вершалінамі дрэваў, што падалі пад націскам металічных пачвар. Апошнія цмокі памерлі шмат гадоў таму. Старыя казалі, што ўсіх перабілі Навальнічнікі. А яшчэ старыя казалі, што засталіся тыя, хто памятаў, як выглядалі цмокі. Тыя, хто мог набываць іх форму. Хуты.

* * *

Хут вельмі любіў хітрыкі і лічыў, што ён самы гарэзлівы і жартаўлівы з усіх знаёмых яму Хутоў, хоць іх засталося зусім мала. Яго сваякам ўсё часцей трапляліся гаспадары пахмурныя, злосныя, змрочныя. Некаторым не шчасціла настолькі, што даводзілася туліцца ў хатах, дзе нават не дапускалі іх існавання, альбо спісвалі ўсё на якіх-небудзь «палтэргейстаў». Хуту ж патрапіўся выдатны гаспадар, які шторанiцы пакідаў яму рэшткі яечні і абаранкі, а часам нават пасмейваўся з ягоных жартаў. Сядзіць ён, напрыклад, на ганку, фарбуе свае гліняныя вырабы, а Хут возьме і сцягне пэндзлік, што стары адклаў на хвілінку. Мужчына пашукае-пашукае, усміхнецца ў вусы і заўважыць: «Ты гэтыя дурыкі кінь і працаваць не перашкаджай. Потым нагуляешся, чарцянятка».

Хут, вядома ж, пэндзлік вяртаў, часам нават з адсоткамі. Ён любіў не толькі пакпіць з кагосьці, але і прыемнае зрабіць. А калі гэта можна сумясціць — дык тут з ім ніхто не паспаборнічае. Так і з'яўляліся ў гаспадара новыя пэндзлікі, лішнія слоікі з варэннем ды большыя чым у суседзяў ураджаі яблыкаў. Вось ужо ён рагатаў, калі мужчына ўвечары ўзяў з палічкі вершаў пачытаць, а адтуль грашовая паперчына выслізнула. Стаяў той стары, глядзеў на вокладку вялі-

кімі вачыма і мармытаў: «Здаецца ж, не клаў ніколі грошай да дзядзькі Рыгора».

А назаўтра на печцы засталася цэлая яечня на скварачках. Такія дні Хут асабліва любіў. І гаспадару прыемна, і яму карысна. Але такім дням суджана было скончыцца, бо іх простае і ладнае жыццё апынулася пад пагрозай.

На вёсцы з'явіліся Навальнічнікі.

Раней ён ніколі іх не бачыў, толькі чуў ад іншых вусцішныя гісторыі. У палову з іх верылася з цяжкасцю, бо такімі толькі малых палохаць. Другая палова была збольшага перасцярогай: не рабі людзям блага, не атручвай жыццё, ва ўсіх сэнсах, не палохай чалавечых дзетак, не крадзь зашмат — і Навальнічнікі за табой не прыйдуць.

Але яны прыйшлі. Спачатку зніклі Здані. На вясковых могілках стала жудасна ціха. Потым з закінутай хаты знік надакучлівы Хіхітун, а з падворкаў — гаманлівыя Паўночнікі. Знік самотны Вядзьмак, які жыў наводшыбе. Зніклі Палявік і Начніцы, якія дурэлі на лугавіне. Перастаў завітваць нудны Шатан. Стала ціха ва ўсёй вёсцы, а потым надышла яго чарга — стала ціха ў ягонай хаце.

Яго гналі пыльнай вясковай вуліцай, няскошаным жытам, густым пералескам, нібы драпежніка, нібы звера. Цяпер ён і быў зверам: спрытным, крутлявым тхаром хаваўся ў траве. На тое, каб ператварыцца ў нешта драбнейшае, яму патрэбны быў час, хаця б імгненне.

Яны часу не давалі: удвух абрынулі на яго бесперапынны дождж палымяных іскрынак і арбалетных балтоў. Навальнічнікі былі хуткія, бязлітасныя, моцныя, але ён быў больш хітры.

Як толькі атрымаў магчымасць замерці — зрабіў менавіта гэта. Ператварыўся ў камень і ў наступнае імгненне апынуўся пад ботам маладога Ваяра.

— Ты яго ўпусціў? Няздара!

— Я прашу прабачэння, Настаўнік.

Мужчына адвесіў юнаку звонкую поўху.

— Я ж не Вупыра якога ўпусціў, — пакрыўджана заўважыў хлопец. — Гэты Хут нічога дрэннага не зрабіў.

— Цябе гэта хваляваць не павінна. Ты — Ваяр. Твая справа — забіваць Пачвар.

— Мая справа — забіваць тых, хто пагражае людзям, а забіваць проста так я не хачу, — абурыўся юнак.

І зноў атрымаў па твары.

— Зашмат размаўляеш! Мне ўсё адно, чаго ты хочаш. Ты будзеш выконваць загады. Зразумеў?

— Так, Настаўнік. Прашу прабачэння.

— Пра прабачэнне мы пагамонім дома, Святаслаў.

Юнак ціха фыркнуў, паддзеў каменьчык наском бота. Хітравата ўсміхнуўся і зашпурнуў падалей у траву.

* * *

У шыбы грукаўся злы вецер. Вычварныя лапы галін скрэбліся, просячыся ў хату. Халодная цэгла печы не грэла. Глядзелі са сцен безуважныя абразы, раздрукаваныя на бліскучай паперы. Яна не ела амаль месяц — апошні раз людзі заязджалі ў верасні, забіралі нарыхтоўкі на зіму. Баба Зося, старая гаспадыня, памерла ў сакавіку, а яе дзеці жыць тут не збіраліся, хіба прыязджаць на лета.

Яна сцялася, абхапіўшы каленкі рукамі. Хацелася плакаць, ды моцы ўжо не было. Спачатку яна злавалася, крычала, біла посуд, ламала рэчы, у спадзяванні, што нехта пачуе. Марна. Хатнік памёр неўзабаве пасля гаспадыні, хлеўнік сышоў кудысьці валацужнічаць, і цяпер яна шкадавала, што збаялася ісці з ім.

Калі злосць прайшла, прыйшоў адчай. Яна плакала тыдзень, стагнала, румзала, а потым скончыліся і слёзы. Засталася няўмольная безнадзейнасць.

Нехта пагрукаў. Вецер? Альбо падалося? Пагрукалі больш настойліва. Дрыготкай рукой узялася за клямку, нясмела штурхнула дзверы. На ганку стаяў мужчына ў чорным плашчы і капелюшы. Яна спалохана азірала ягоную вопратку ў пошуках сімвала смерці — чырвонай шасціпялёсткавай кветкі ў коле.

— Я не вораг, — з усмешкай заўважыў ён. — Дазволіш увайсці?

Яна прапусціла госця ў хату. Той адразу ж узяўся разводзіць у печы агонь і гатаваць вячэру з прынесеных з сабой прадуктаў. Па ім цяжка было сказаць, колькі яму гадоў, у якім ён настроі, чалавек ён увогуле ці не.

— Хто ты такі?

— Хут. Прабач, калі табе раптам непрыемна, што я ў чалавечым абліччы. Я проста падумаў, што ты звыклая да людзей.

— Так, звыклая. Я ж Вешчыца.

— Я ведаю, хто ты, — ён адправіў у духоўку казан з бульбай. — Ты няшчаснае дзяўчо, якое гэтыя пачвары пакінулі паміраць ад холаду, голаду і адзіноты. Нічога, маленькая, цяпер усё будзе добра.

— Ты застанешся са мной?

— Не. Мы знойдзем табе новую хату. У горадзе.

— Я не магу пакідаць родны дом.

— А ты спрабавала? — ён цёпла засмяяўся. — Павер, маленькая, у гэтым няма нічога складанага і страшнага.

— А што будзеш рабіць ты?

— Збіраць сяброў, каб аднойчы адплаціць людзям па справядлівасці. Мы прыйдзем у горад, зоймем іх хаты, прымусім баяцца і ўцякаць. Забяром іх жыцці.

— Навальнічнікі не дазволяць, — задуменна заўважыла яна.

Ён сеў побач, прыціснуў яе да сябе, крыху памаўчаў, думаючы пра сваё, перасмыкнуў вуснамі.

— Яны — дурні, якія не бачаць далей за ўласны нос. Яны нават не заўважаць, што нешта адбываецца, а калі заўважаць — я знайду сродак іх спыніць. Надыходзіць новы час, маленькая. Лепшы час. Наш час.

Разумець

Пяць гадоў таму

Міраслава рыхтавалася да плыні пытанняў. Штогод праз дзень пасля сумоўя за сталамі падмайстраў было асабліва шумна. Страўня была месцам вольных гутарак, сяброўскіх жартаў і абмеркавання апошніх навін. І так было прынята, што вучні сядалі за сталы да вучняў, падмайстры — да падмайстраў, малодшыя — да малодшых, старэйшыя — да старэйшых. Рада сядзела асобна.

Святаслаў і Усевалад удвух селі за вольны стол. Міра была вымушаная да іх далучыцца, кідаючы разгубленыя позіркі на сяброў, якія махалі рукамі і клікалі да сябе. За сталом панавала цішыня. Дзяўчына надта хутка паела. У Майстра яшчэ палова талеркі, а ў яе ўжо пуста. На шчасце, Усевалад паеў яшчэ хутчэй — інакш яна б не ведала, што рабіць. Ён акуратна склаў прыборы на талерку і моўчкі чакаў настаўніка.

Гаманлівая кампанія яе сяброў на чале з Багданам няўмольна набліжалася. Упершыню ў жыцці яна не рада была іх бачыць.

— Міра, прыйдзеш сёння ўвечары да Златкі? Будзем байкі баяць каля вогнішча.

Дзяўчына разгублена зірнула на Майстра. Яны не абмяркоўвалі, ці ёсць у яе вольны час і наколькі ён

вольны. Святаслаў жа быццам не бачыў іх — працягваў спакойна есці.

— Я таксама хачу байкі баяць, — раптам расцягнуўся ва ўсмешцы Усевалад.

— Эм-м-м. Калі твой настаўнік не будзе супраць...

— А ён не даведаецца.

Маладзёны ўтаропіліся на Усевалада, нібы на вар'ята. Святаслаў адсунуў талерку і ўзняўся. Хлопцы зрабілі крок назад.

— Свабода не адмяняе паважлівага стаўлення. Вы б хоць павіталіся.

Багдан перасмыкнуў вуснамі. Святаслава мала хто з Ваяроў любіў. Такі малады, а ўжо ў Радзе. Адны казалі, што яму гэта месца выбіў былы настаўнік, Майстар Велізар, блізкі сябар Кіраўніка. Другія — што яго нешта звязвае непасрэдна з Кіраўніком. Трэція — што ўсё дзеля камфорту і спакою «найлепшага вучня». І толькі малая частка лічыла яго таленавітым і моцным Ваяром, які атрымаў гэтае месца дзякуючы сваім здольнасцям.

— Просім прабачэння, Майстар Святаслаў. І добры дзень.

Мужчына цяжка зірнуў на Міраславу, быццам паводзіны сяброў — яе правіна, сурова вымавіў:

— Аб адзінаццатай каб былі дома. Абодва.

* * *

Міраслава думала, што Вал жартуе, здзекуецца, кпіць. Думала, ён разумее, што ў гэтай кампаніі яму няма чаго рабіць. Ды і не чакае яго там ніхто. Ён не жартаваў. І не разумеў.

— Ну што, малы, распавядай, адкуль ты такі? — задзірліва пацікавіўся Багдан. — Шмат кашы ў дзяцінстве еў?

— Мне маці гатавала, па асаблівым рэцэпце: пляшка Энергіі, дзве лыжкі Арнаментаў, лыжка металу. І дробка дурных пытанняў, каб з маленства прызвычайваўся, — ленавата адказаў Усевалад.

Сапраўды, пытанне было дурное. Ніхто з Ваяроў не памятаў сябе да таго, як патрапіў ва Унутраны Свет. Не памятаў ні бацькоў, ні дом, ні нават уласнае імя. Тут давалі новае. Ваяр не павінен мець прыхільнасцей.

Адказ быў трапны, і Міра напружылася. Багдан быў у іх кампаніі лідарам і дужа не любіў, калі яму затыкалі рот, але малы для яго быў надта цікавай забаўкай. Ён дазволіў сябрам пасмяяцца з ягонага жарту, нават сам стрымана ўсміхнуўся і працягнуў.

— Не, я сур'ёзна, што ў табе такога асаблівага?

Усевалад пацепнуў плячамі.

— Ты мне скажы. Гэта ж ты мяне баішся.

Багдан тарганўўся наперад, але яго спыніла Злата, гаспадыня вечара, якая ведала ўсе самыя вострыя і неверагодныя плёткі Свету.

— Цябе лічаць моцным. Як па мне, дык ты звычайны малы. Пры жаданні цябе не тое што Багдан, цябе нават я адолею.

Цяпер заставалася спадзявацца толькі на ўраўнаважанасць Усевалада. Ён паставіў іх у няёмкае становішча ў страўні, і яны, відаць, збіраліся яму адплаціць. Мабыць, ён і ўправіцца з Багданам альбо Златай, але не з абаімі. А іх і астатнія падтрымаюць, калі раптам дойдзе да бойкі.

— Моцны не той, у каго больш Энергіі, а той, хто ўмее ёй кіраваць, — спакойна адказаў хлопец, не зводзячы вачэй з вогнішча.

— Бач, які разумны, — фыркнуў нехта.

— Дык гэта ён не сам прыдумаў, — засмяялася Златка. — Гэта яму настаўнік распавёў. Дарэчы, Усевалад, гэта праўда, што яму месца ў Радзе ў спадчыну

засталося, ад Велізара? А калі ён памрэ, ты таксама аўтаматычна ў Раду ўвойдзеш?

— Я не ведаю, чаму ён у Радзе. Гэта не мая справа і тым больш не ваша.

— Ты тут госць, я — гаспадыня. Мне вырашаць, — дзяўчына нахабна ўсміхнулася. — Я яшчэ чула, што твой першы настаўнік загінуў праз цябе. Што, не ўтрымаў пад кантролем свае бясконцыя аб'ёмы Энергіі?

Усевалад узняўся. Цяпер Міра разумела, чаму ён быў самаўпэўненым і ганарыстым: своеасаблівы сродак абароны ад такіх доўбняў, як яе сябры. Багдан і Злата таксама ўзняліся. Багданава рука імгненна слізганула да мяча, у Златы на далоні ззяла Перунова Зорка. Хлопчык развёў рукамі, маўляў, я не збіраюся біцца.

— Добрага вам вечара. Спадзяюся, вы сабе языкі ў вузлы пазавязваеце, мяне абмяркоўваючы. Да сустрэчы, Міраслава.

Ды скіраваўся прэч. Яна нагнала яго на паўшляху да хаты. Ён ішоў, скрыжаваўшы рукі, ссутуліўшыся, павесіўшы галаву. Міра папрасіла прабачэння за сяброў і за сябе: сядзела ж моўчкі, хоць цудоўна ведала, чым гэта можа скончыцца. А ён раптам пачаў распавядаць:

— Майстар Велізар быў спачатку настаўнікам Святаслава, потым нядоўга маім. Ён загінуў пры дзіўных абставінах: пусцілі арбалетны болт у спіну. Так і не высветлілі хто. Я не памятаю нічога з таго дня. Майстар Святаслаў лічыць, што нехта хацеў забраць мяне альбо маю Энергію. Ён завернуты на маёй бяспецы, таму я мушу кожны вечар выстаўляць абарону і абараняцца на трэніроўках. І таму ў мяне ёсць гэтая татуіроўка. У Настаўніка такая ж. Калі мне штосьці пагражае — ён гэта адчувае. І наадварот.

— Я ніколі раней такіх не бачыла, — не ведаючы, што яшчэ сказаць, заўважыла Міра.

— Гэта вядзьмарства. Настаўнік істотна парушыў правілы, зрабіўшы нам гэтыя татухі.

— І чаму яго не выключылі з Рады пасля такога?

— Я не ведаю, праўда, — Усевалад разгублена пахістаў галавой.

* * *

Ад цяжкіх трэніровак балела цела, ад аб'ёму новай інфармацыі — нельга ж Падмайстарцы быць дурнейшай за вучня — трэскалася галава. Бракавала адпачынку, сустрэч з сябрамі, размоў з настаўніцай, але Міраслава ведала, на што ішла. Хочаш стаць Майстаркай — мусіш пабыць і Падмайстаркай. Пасля чакалі яшчэ два гады працы ў Камандзе ў Вонкавым Свеце. Потым — выпрабаванні, і толькі потым ступень майстэрства. Але пакуль рана пра гэта думаць, бо трэба было пражыць год з таленавітым, але самаўпэўненым, невыносным падлеткам і яго прынцыповым, патрабавальным настаўнікам. Апошні непакоіў Міраславу куды больш. Яна трэніравалася і думала пра Святаслава, клалася спаць і думала пра Святаслава. Стварала Сімвалы, мылася, бегала, чытала, прыбірала ў хаце, вячэрала і думала пра Святаслава. Усё гэта настолькі ўскладняла задачу год быць Падмайстаркай, што Міра не ведала, куды ад сябе дзецца.

Дні, калі іх абодвух не было дома, сталі для яе святам, і адно такое свята чакала яе сёння. Ва Усевалада былі шараговыя выпрабаванні. Вучні спаборнічалі між сабой, паказвалі, што вывучылі за месяц. Тройчы завалілі выпрабаванні — не стаць табе Ваяром, будзеш усё жыццё вырошчваць жыта, смажыць мяса ды праць бялізну тым, хто даў рады навучанню. Ясная справа, «найлепшаму вучню» такое не пагражала, і ўсё ж ён быў абавязаны праходзіць выпрабаванні, а настаўнік

павінен быў пры гэтым прысутнічаць. Прынамсі, так рабілі ўсе астатнія настаўнікі.

Міраслава, не стрымліваючы радасці ад адзіноты, вылецела ў гасцёўню. Яна планавала запарыць сабе цэлае вядро гарбаты і чытаць што-небудзь цікавае да прыходу гэтых дваіх, задаволеных і прапахлых потам.

Святаслаў, напяваючы сабе пад нос, перабіраў арбалетныя балты.

— Добры дзень, Міраслава. Выспаліся? — хітравата ўсміхнуўся ён.

— Ой, я думала, вы пойдзеце глядзець... — сумелася дзяўчына.

— На Усевалада? Ён зробіць усё магчымае, таму мая прысутнасць нічога не зменіць.

— Вы яго зусім не кантралюеце?

— Адна мудрая жанчына калісьці мне сказала: «Колькі б вы вучня ні кантралявалі, ён усё адно будзе рабіць дурасці. Да гэтага цяжка прызвычаіцца, але давядзецца». Займайцеся, чым планавалі, Міраслава, вы заслугоўваеце адпачынак.

Міра, не верачы свайму шчасцю, схавалася ў кнігу. Майстар вастрыў зброю, правяраў запасы зёлак, рабіў абярэгі. Напэўна, так выглядаў ягоны адпачынак.

Бліжэй да абеду ў дзверы пагрукалі. На ганку стаялі два дужыя Ваяры, трымаючы за плечы Усевалада. Рукі звязаныя, на твары драпіны, вопратка перапэцканая ў брудзе. Хлопец сціскаў і расціскаў кулакі, цяжка дыхаў, глядзеў спадылба. Раззлавана і пагардліва.

— Да гэтага вельмі цяжка прызвычаіцца, — выдыхнуў мужчына. — Што здарылася?

— Ваш вучань быў затрыманы за бойку, Майстар Святаслаў.

Вучням дазвалялася трэніравацца такім чынам, калі побач быў трэці, хто спыніць, бо раптам зойдзе далёка. Але бойкі са старэйшымі — з Ваярамі, тым

больш з Майстрамі — лічыліся ганьбай. Узняць зброю на старэйшага — праявіць непавагу.

— З кім? — мужчына не зводзіў вачэй з хлопца.

— З Майстрам Людавітам. Паводле правілаў ён мусіць быць пакараны перад Радай Майстроў.

Святаслаў сціснуў сківіцы, хіснуў галавой. Усевалад глядзеў на яго з цікаўнасцю і выклікам.

— Для вучняў чальцоў Рады робіцца выключэнне. Так што дзякуй, далей я разбяруся сам.

Мужчына грымнуў дзвярамі перад тварамі Ваяроў, уважліва агледзеў юнака ў пошуку сур'ёзных траўм, праверыў татуіроўку, але рукі развязваць не спяшаўся.

— Цэлы? На чым біліся? Мячы?

— Мг.

— Упэўнены, што Людавіт цябе не параніў?

— Я выбіў у яго меч, спадар Святаслаў, — ён наўмысна зрабіў націск на зварот, які выкарыстаў замест звыклага «Настаўнік».

— Ты выбіў меч у Людавіта?

— Як вы казалі: на кожнага моцнага знойдзецца альбо больш моцны, альбо больш хітры. Вы даволі добра навучылі мяне карыстацца зброяй.

— Давядзецца цяпер навучыць цябе ёй не карыстацца, — мужчына нарэшце развязаў хлопцу рукі. — Ідзі ў свой пакой, я буду праз пяць хвілін.

Ён з выдыхам апусціўся на лаўку, зарываючыся рукамі ў валасы, заплюшчыў вочы, замёр. Ён не выглядаў ні рашучым, ні прынцыповым, толькі згубленым. Усевалад не проста парушыў правілы. Здарылася нешта яшчэ, чаго Міраслава не разумела. Нешта, чаму Святаслаў не мог даць рады. Пяць хвілін прайшло, а Святаслаў не варушыўся, быццам чакаў, пакуль Усевалад зробіць першы крок.

Наверсе пляснулі дзверы. Вучань спусціўся, апрануты і ўзброены для вандроўкі. Настаўнік узняўся, яны сустрэліся позіркамі.

— Людавіт не хлусіў?

— Не ведаю, што менавіта ён табе сказаў, але думаю — праўду.

Хлопец сціснуў кулакі, у вачах заскакалі вар'яцкія агеньчыкі.

— Сем гадоў, Свят! Ты вучыў мяне змагацца з Пачварамі... А насамрэч Пачвара — ты!

— Вал, паслухай...

— Хопіць, наслухаўся!

Юнак рушыў да дзвярэй, але мужчына закрыў яму шлях:

— Не рабі таго, пра што пашкадуеш.

— Хто б казаў, — між пальцаў юнака складанымі перапляценнямі засвяціўся Арнамент моцы. — Пусці мяне, Святаслаў.

Ваяр сумна ўсміхнуўся.

— Да сустрэчы, свавольнік.

* * *

Слёзы цяклі па скронях, сцякалі на шыю, казыталі вушы. Яна ляжала на каленях у Васілісы і глядзела ў столь. У келіху плёскалася віно, пяшчотныя пальцы былой настаўніцы лёгка перабіралі валасы.

Апошні раз яна плакала ў чатырнаццаць. Яны з Багданам спрабавалі паўтарыць адзін баявы прыёмчык, падгледжаны ў старэйшых, ды ён крыху не разлічыў моц — зламаў ёй руку. Цяпер балела куды мацней, чым тады, бо балела не рука.

— Не ўсё, што адчуваеш, варта агучваць, ласачка. Тым больш што ты выдатна ведаеш законы. Ваярам нельга...

— Ненавіджу законы, — яна выцерла вочы. — Я не хацела маўчаць. Не магла больш... І я думала, што пераключу яго ўвагу хоць ненадоўга, бо ён хутка звар'яцее з гэтымі пошукамі. А ён вырашыў, што я здзекуюся, раззлаваўся. Сказаў: «Калі гэта жарт — перадай сваёй настаўніцы, што ён дурны. А калі ты сур'ёзна — дык перабаліць»...

Міраслава закусіла вусны, якія ўпарта дрыжалі, сціснула адной далонню іншую.

— Я разумею, чым цябе прывабіў Свят, ласачка. Ён прыгожы, мужны, прынцыповы. У яго свае погляды на ваярства і на настаўніцтва. А вочы якія, м-м-м... Але ты заблыталася, маленькая. Апынулася ў новых абставінах і знайшла моцнае плячо, на якое можна абаперціся. Так табе падалося. Святаслаў захапляе і зачароўвае, безумоўна, але гэта не каханне. Ты падманваеш сама сябе, а ён мае рацыю: перабаліць.

— Добра, але прычым тут ты?

Васіліса падліла ў абодва келіхі яшчэ віна, зрабіла са свайго некалькі глыткоў, сумна ўсміхнулася.

— Трэба было табе спачатку да мяне прыйсці, а мне трэба было цябе папярэдзіць. Ён быў маім Падмайстрам, калі я яшчэ вучыла Дану. Дужы хлопец, вельмі добра падрыхтаваны, выдатны Ваяр. Але ён умеў толькі ваяваць і выконваць загады, а хацеў іншага. Ён лічыў сябе няправільным, зламаным. Яму хацелася спрачацца з усім, што гадамі навязваў ягоны настаўнік, але ён не мог сабе гэтага дазволіць і вельмі пакутаваў праз гэта. Давялося вучыць яго не баяцца адчуваць штосьці, акрамя пакорлівасці і злосці...

— У цябе нядрэнна атрымалася. Ён цяпер зусім іншы.

— Гэта мая заслуга ў вельмі малой ступені — яго куды больш змяніла настаўніцтва... А мы толькі часам праводзілі разам ночы. Пілі віно, размаўлялі. Адной-

чы ён сказаў, што кахае мяне, і я адразу ж спыніла гэта ўсё, бо мы абодва рызыкавалі сваім становішчам. Мяне вось-вось павінны былі абраць у Раду, яго праз некалькі гадоў чакала атрыманне ступені майстэрства. Ён даволі цяжка перажываў маю адмову, не даваў мне праходу. Напэўна, думае, што я вырашыла яму адпомсціць, адправіўшы цябе яму ў Падмайстаркі.

— А насамрэч ты гэта навошта зрабіла?

— Ты ж сама хацела да найлепшага. Я ведаю толькі двух Ваяроў, лепшых за Святаслава. Адзін з іх загінуў, а другі — яшчэ дзіцё.

Крывавая Мэры

Флэты ў гэтай кватэры былі звычайнай справай. Здадзеныя сесіі, закрытыя залікі, абароненыя курсавыя, Хэлоўін, Новы Год і 1 Мая — збіраліся з нагоды і без.

Сёння нагода была сур'ёзная: Машцы спаўнялася дваццаць. Для цеснай аднапакаёўкі народу было зашмат. Сядзелі паўсюль: пяцёра на трохмеснай канапе, двое ў адным фатэлі, на хісткіх зэдліках з пераматанымі дротам ножкамі ды проста на падлозе.

Чутно было збольшага Міхася — зорку іх групы, таго яшчэ мажора. Ён не выпіў ні кроплі алкаголю і ўсё адно быў у цэнтры ўвагі. Распавядаў смешныя гісторыі пра выкладчыкаў, апісваў эпічныя здарэнні па-за ўніверам, пераказваў сюжэты любімых фільмаў, жартаваў. Дзяўчаты не зводзілі з яго вачэй. Хрысціне таксама падабаўся Міхась — за тры гады вучобы яна не сустрэла нікога, каму б ён не падабаўся. Заўсёды ўсмешлівы, ветлівы, гатовы дапамагчы. Але сэрца было занятае іншым. Менавіта таму яе бянтэжылі настойліва-зацікаўленыя позіркі Міхасёвага сябра, якога Машка запрасіла, «каб было больш хлапцоў». Што паробіш, калі на адвакатуры вучацца спрэс дзяўчаткі?

Усевалад быў спакайнейшы за Міхася, толькі часам кпіў з сябра ды стрымана адказваў зацікаўленым дзяўчатам. І глядзеў на яе.

Пасля другой «Крывавай Мэры», намяшанай гаспадыняй свята і выпітай у яе гонар, Хрысціне стала надта цесна, надта душна ў маленькай кватэры. Захацелася курыць, захацелася да яго.

Антось нібы чакаў яе, як заўсёды. Стаяў на агульнай лоджыі, глядзеў на зоры. Між пальцаў ззяў недапалак. Ён пяшчотна ўсміхнуўся.

— Тусіце?

— У Машы днюха, — яна зацягнулася. — Што ты там хочаш убачыць?

— Не ведаю, мабыць, НЛА? Жартую, проста задумаўся. Так шмат на зямлі недаследаванага, а нас усё ў космас цягне.

— Страшна быць самотнымі, напэўна.

— Хто мы такія? Толькі падарожныя, папутнікі сярод нябёс...* — ён пацепнуў плячыма.

— Ты гэта да чаго?

— Да таго, што мы ўсе — самотнікі.

— Ты сёння філосаф, — засмяялася Хрысціна.

Ён глядзеў на яе. Ласкава, захоплена, як толькі што на нябёсы. Але яшчэ ні разу, ніколі ён да яе не датыкнуўся, а так хацелася абдымкаў, пацалункаў. Яна падышла зусім блізка, заставалася толькі працягнуць рукі, калі на лоджыі з'явіўся Усевалад. Не ў час.

— Оў, я прашу прабачэння... Дазволіце далучыцца? — ён пацягнуўся да пачка цыгарэт, што ляжаў між імі.

— Бяры, вядома ж. Не думала, што ты курыш.

Усевалад дастаў з кішэні металічную запальнічку, зірнуў на Антося.

— Спаць не замінаем?

— Ды лухта. Хто спіць у суботу а першай ночы?

* М. Багдановіч — «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»

Усевалад задуменна ўздыхнуў, так і трымаючы запаленую цыгарэту між пальцаў.

— Ты год трэці ўжо не спіш, так?

Павісла маўчанне. Хрысціна асэнсоўвала дурное пытанне. Гэта ён так спрабуе пажартаваць наконт Антосевых сінякоў пад вачыма?

Усевалад нарэшце паднёс цыгарэту да вуснаў, шапнуў нешта. Ва ўсе бакі пырснулі іскрынкі, быццам з бенгальскага агню, дробнай жамярой замітусіліся ў паветры, палезлі Антосю ў твар.

— Што адбываецца? — разгубілася Хрысціна. — Што ты робіш? Усевалад!

Юнак яе праігнараваў, паспешліва шукаючы нешта ў кішэнях. На яе крык прыбег Міхась, кінуўшы сваю важную місію забаўляць народ.

— Пачакай! — тузануў сябра за плячо. — Хрысціна, ты даўно яго ведаеш?

— Антося? Паўгода — як засяліліся. Ён мой сябар!

— Чуеш, Вал? Ён бяскрыўдны. Пакінь.

— Пакуль бяскрыўдны, — мармытнуў Усевалад. — Ты калі з балкона ўніз выйшаў? Два гады таму, тры?

— Пазамінулай зімой. Я не суіцыднік, зразумела? Гэта быў няшчасны выпадак.

— Усё адно, — Вал звярнуўся да Міхася. — Раней ці пазней ён згубіць рэшткі чалавечнасці і пачне забіваць. Не факт, што побач апынецца Ваяр. Не, я больш смерцяў не дазволю, хопіць. Святаяннік з сабой?

— Вы калі-небудзь гублялі сяброў? — пачаў Антось, заўважыўшы, што Міхась вагаецца. — Вы разумееце, наколькі балюча зробіце гэтай чароўнай дзяўчыне?

Хрысціна плакала не стрымліваючыся.

— Вал, не кожны нячысцік — Пачвара, памятаеш?

— Памятаю. Я ведаю, што раблю, Міхась. Давай святаяннік альбо забірай дзяўчыну і сыходзь. Я ўпраўлюся без зёлак.

Іскрынкі, што раіліся вакол Антося надакучлівай жамярой, ператвараліся ў Сімвалы. Сімвалы спалучаліся, звязваліся адзін з адным, абвіваліся вакол мужчыны, утвараючы ланцуг.

Хрысціна закрывала твар рукамі. Каб не бачыць, каб толькі не бачыць.

Столькі вечароў было праведзена разам, столькі цыгарэт выпалена, столькі музыкі пераслухана... Столькі было сказана — і столькі яшчэ не было. Ён апынуўся прывідам, уласным ценем, і ўсё адно адпусціць яго не было моцы.

— Міхась?! — рыкнуў Усевалад.

Той адчайна хіснуў галавой, кінуў сябру льняны пакуначак. Пстрыкнула запальніца, падпаленыя кветачкі паляцелі ў бок Антося. Ланцуг з Сімвалаў загарэўся, нібы кнот. Антось збялеў, скура стала тонкая, амаль празрыстая, нібы папера, пад вачамі леглі цёмныя цені. Яшчэ больш цёмныя танцавалі вакол яго. Твар сказіўся грымасай болю і нянавісці.

— Хутка ўсё скончыцца. Табе мала засталося, Ваяр, — прасычэў ён, рассыпаючыся ў попел.

Голас у яго быў страшны, тагасветны, зусім не чалавечы.

— Табе меней.

Вулічныя Музыкі

Марк любіў разглядаць людзей: старога з маленькім неахайным сабакам, школьніка гадоў дзесяці, які заліпаў перад кіёскам з камп'ютарнымі гульнямі, зграйку дзяўчатак-старшакласніц, на якіх з кожным днём было ўсё больш касметыкі і ўсё менш вопраткі — усё ж такі лета. Ніхто з іх не кідаў грошай.

Марк лічыў іх трыа адным з лепшых вулічных гуртоў Мінска. Яны дзіўна выглядалі разам: Віталя — курчавы хіпі ў расцягнутай рознакаляровай майцы, увесь абвешаны фенечкамі, Максім — віяланчэліст у блакітнай кашулі, зашпіленай на ўсе гузікі, і ён, Марк, — брутальны гітарыст у чорнай скураной куртцы, якому нярэдка казалі, што ён падобны да Цоя. Вар'яцкі кактэйль, але ўтрох яны рабілі магію.

Міхась заўсёды з'яўляўся а восьмай вечара па серадах і пятніцах. Стомлены — ці то з якіх заняткаў, ці то з трэніроўкі. Кідаў рубель і ні разу, халера яго дзяры, ні разу не дастаў з вушэй навушнікі. Марк хацеў схапіць яго за локаць, выдраць іх, каб ажно вохнуў, і прараўці ў твар: «Стой і слухай, сволач!» Але толькі мацней сціскаў грыф.

Марк ведаў Міхася са школы, але яны не сябравалі. Міхась насіў фірмовыя гарнітуры, меў модную прычоску і дарагі тэлефон. У школу яго прывозілі на машыне. Сустракаўся то з адной прыгажуняй з паралелі, то з іншай. З настаўнікамі размаўляў пагард-

ліва-правакатыўна, але гэта не перашкаджала яму заставацца адным з лепшых вучняў. Маці была нейкай вядомай юрысткай, пра бацьку казалі, што ён паспяховы бізнесмен і жыве ў Еўропе. Марк даношваў і гарнітур, і тэлефон за старэйшым братам, хіба што прычоска была свая. Пад пінжак апранаў цішоткі з назвамі рок-гуртоў і праз гэта рэгулярна меў канфлікты з адміністрацыяй. Вучыўся кепска, бо ўвесь вольны час прысвячаў музыцы. Ягоная маці працавала ў дзіцячым садку, бацька — на заводзе. Марка такія, як Міхась, раздражнялі. Для Міхася такія, як Марк, былі пустым месцам.

У адзінаццатым класе штосьці змянілася: Міхась пачаў апранацца папрасцей, хадзіў у школу пешшу і паважліва кантактаваў з выкладчыкамі. Аднойчы Марк нават сутыкнуўся з Міхасём і ягоным бацькам на рок-канцэрце. Бацька, дарэчы, быў мала падобны да бізнесмена з Еўропы. Але пасябраваць Марк з Міхасём не паспелі, бо Марк быў заняты музыкай, а Міхась паступленнем на юрыдычны.

Цяпер два разы на тыдзень яны сустракаліся ў пераходзе. Міхась стрымана ківаў ды кідаў рубель, Марк стрымана ківаў у адказ. Ён спярша раззлаваўся: яму былі не патрэбныя падачкі «мажора». Тады ж распавёў сябрам і наступным разам хацеў папрасіць былога знаёмага больш не класці грошы. Але Максім сказаў, што грошы не пахнуць.

Сёння Міхась спыніўся, дастаў навушнікі і дачакаўся, пакуль яны скончаць кампазіцыю.

— Прывітанне, хлопцы. Дзе ваш віяланчэліст?

— А табе што за справа? — рыкнуў Марк. — Ты б хоць раз навушнікі зняў, мецэнат чортаў.

— Я вас і так выдатна чую, — ён амаль тэатральна паказаў на дысплэі прыпынены трэк. — Але ўтрох вы лепш заходзіце...

— Максім захварэў, — збянтэжана прамармытаў Віталя. — Вы прыходзьце праз тыдзень.

— На што захварэў?

— Ты што, лекар?! — Марка злавала гэтая раптоўная ўвага. — А ну валі адсюль, пакуль самому лекар не спатрэбіўся!

Міхась не зрушыў з месца, толькі здзіўлена ўзняў бровы.

— Лягчэй, Кіпелаў, — хмыкнуў ён. — Я ўсяго толькі хацеў прапанаваць дапамогу.

— Чым ты дапаможаш?! Яшчэ рубель кінеш, на аспірын?! Ідзі ты ў дупу, мажор, і дапамогу сваю туды ж засунь.

— Хоць «мажор», хоць «дырыжор», — пацепнуў плячыма Міхась, не хаваючы ўсмешкі. — Я магу дапамагчы. Калі зразумееш, што гатовы маю дапамогу прыняць, — звяртайся. Да сустрэчы.

Павярнуўся і пайшоў. Пруткай лёгкай хадой, быццам нічога ў гэтым жыцці не мела для яго вялікай значнасці.

* * *

Тэмпература не зніжалася. Не дапамагалі ні жарапаніжальныя, ні антыбіётыкі. Хуткую ён выклікаць не даваў, кідаўся ў істэрыку, крычаў, курчыўся, трызніў.

Марк упрасіў Віталю выйсці граць у пятніцу і ўвесь вечар разглядаў натоўп. Мужчына з неахайным сабакам — ёсць. Хлопчык-заліпончык — ёсць. Драпежныя дзяўчаты — тут. Ну, давай! Ён ішоў. Амаль на паўгадзіны пазней, чым звычайна, але ішоў. Нават не зірнуўшы ў іх бок, кінуў рубель.

— Міхась, чакай!

Юнак спыніўся, дастаў навушнік, з папрокам нахіляючы галаву набок:

— Яму не стала лепш?

Марк не ведаў, як папрасіць пра дапамогу, бо яму было сорамна. Чым больш ён думаў, чаму яго так раздражняў Міхась, тым больш відавочным здаваўся адказ — зайздрасць. У Міхася ўсё было выдатна: знешнасць, сям'я, розум — усё, прынамсі, на першы погляд. Зручна было лічыць яго хаця б вырадкам.

— Мы будзем вельмі ўдзячныя, калі вы дапаможаце, — выратаваў яго Віталя.

* * *

Марк і Віталя сядзелі на кухні. У пакой ён іх не пусціў, прамармытаўшы нешта пра тое, што «ўсё яшчэ горш, чым ён думаў» і «аднымі зёлкамі не абыдзешся». Віталя курыў, Марк нервова пагрукваў пальцамі па стальніцы.

— Калі пасля гэтага доктара Стрэйнджа яму не стане лепш — я выклікаю хуткую, — змрочна заўважыў Марк.

З пакоя Макса даносілася манатоннае мармытанне. Гэта ўсё пачынала раздражняць. Калі Міхась прапаноўваў дапамогу, Марк і падумаць не мог, што яна будзе нагадваць «Бітву экстрасэнсаў».

— Што ён там робіць, моліцца? Альбо закляцці чытае? Экспекта Патронум?

— Не лезь у фандомы, якіх не ведаеш, — скрыжаваў рукі Віталя.

Марк фыркнуў. Яму не падабалася Віталева захопленасць фэнтэзі і фантастыкай. Жыццё жорсткае і бязлітаснае, у ім няма месца цудам.

— Мы прыйдзем па цябе, Знахар! — данёсся з пакоя ледзь пазнавальны голас Максіма. — Я вярнуся з усімі сваімі сёстрамі!

Віталя разгублена зірнуў на сябра, прашаптаў:

— Гэта ўжо экзарцызм нейкі.



* * *

Усевалад стаяў, абапёршыся на падаконне, напружаны, гатовы ў любы момант дастаць зброю. Працінаў позіркам цемру за акном.

— Што здарылася?

Ледзь заўважна павёў плячом — не хоча размаўляць пра гэта.

— Ты чаго так позна? — замест адказу задаў пытанне.

— Затрымаўся на курсах па англійскай. Праект рабілі.

Міхась плюхнуўся на канапу, выцягнуў ногі.

— Цябе не заганяе гэты выпадак са Зданню? Ён амаль адкрытым тэкстам сказаў, што нешта ідзе…

— Тое, што ты гэта пачуў, не значыць, што ён гэта сказаў.

— Добра, — моцы спрачацца з ім усё адно не было. — Раз усё нармальна… Пайду паем.

Вал з'явіўся ў дзвярах кухні, калі Міхась дапіваў гарбату. Бровы зведзеныя, зубы сціснутыя, дыхае глыбока — сканцэнтраваны. Яму заўсёды было цяжка размаўляць, асабліва пра пачуцці. Міхась прызвычаіўся даваць яму час. Не ціснуць, не дапытваць, не прыспешваць і не ставіцца, як да лухты. Бо Міхась быў адзіным, з кім Усевалад увогуле мог пра гэта размаўляць.

— Я хачу завязаць.

Міхась закашляўся, адставіў кубак.

— Я з'ехаў у горад, каб пачаць новае жыццё, і ўсё ніяк. Хопіць.

— Ну, прывітанне. А хто будзе ў Мінску знішчаць Пачвар?

Усевалад пахістаў галавой. Пра гэта ён, ясная справа, не падумаў. Ён увогуле больш рабіў, чым думаў. Ваяры Навальніцы ў гарады завітвалі рэдка. Па-пер-

шае, тут раней амаль не было нячысцікаў, прынамсі, такіх, якія маглі б сур'ёзна нашкодзіць людзям. Падругое, Навальнічнікі не давяралі сучасным электронным прыладам: хто ведае, як яны паўплываюць на Энергію? Нават Вал доўга не згаджаўся купіць сабе мабільны тэлефон.

— Хто я, акрамя таго, што Ваяр?

— Фітнес-трэнер. Мой лепшы сябар. Стрэмка ў дупе.

Ён нібы не слухаў, заглыблены ўнутр сябе. Сціскаў правай рукой левае прыдалонне і механічна вадзіў вялікім пальцам па абрысах татуіроўкі.

— Нават для Апіўня відавочна: я нічога з сябе не ўяўляю.

Гэта не было блазенства і ён не набіваўся на лёсткі, але яму патрэбныя былі аргументы, каб Міхась упэўніў яго. Таму што самому аргументаў бракавала. Калі б насамрэч хацеў — завязаў бы, і ніякіх размоў не было б.

— Вал... — Міхась пацёр далонямі твар. — Ладна, хадзем.

Прыцягнуў у залю ноўтбук, пачак крэкераў для сябе і пару яблыкаў для яго.

— Сядай, будзем глядзець мульцік. Сядай! Інакш увесь наступны тыдзень гатуеш і прыбіраеш ты.

Вал фыркнуў, але сеў побач. Яны падзялялі абавязкі пароўну, але гатаваў усё ж часцей Міхась. Проста таму, што далёка не кожную страву, прыгатаваную Усеваладам, можна было есці.

— Калі гэта што-небудзь накшталт «Гравіці Фолз», я пас.

— «Гравіці Фолз» — афігенны мульт, а гэты яшчэ лепш.

Яны паглядзелі ўвесь першы сезон «Рыка і Морці», і калі Міхась ужо адчуваў, што ён вось-вось вырубіцца, Вал бадзёра пацікавіўся:

— Навошта ты мне гэта паказаў?

— Ты — Рык, — санліва прамармытаў Міхась. — Ты казёл, не ўмееш спачуваць, нікога не слухаеш, заўсёды лічыш сябе правым, але выдатна ведаеш сваю справу. І каб не ты... Свет быў бы іншы.

— Мне не вельмі падабаецца гэты персанаж.

Міхась ухмыльнуўся. Ясная справа, яму не падабаецца. Пацёр вочы кулакамі, пазяхнуў і, пляснуўшы крышкай ноўта, скіраваўся ў спальню.

— Пачакай, калі я Рык, ты...

Міхась зарагатаў і паказаў сябру сярэдні палец.

— Ты не на курсах затрымаўся, праўда?

— Мхм. Давай пагутарым пра гэта раніцай, Вал, — папрасіў юнак, сцягваючы кашулю.

— Дзе ты быў, Міхась?

— Выганяў Ліхаманку з аднаго музыкі. Задаволены?

Вал цыкнуў.

— Выгнаў?

— Выгнаў, — Міхась з галавой зарыўся пад коўдру, прыглушана дадаў. — Але не забіў.

— І пасля гэтага я яшчэ стрэмка ў дупе! Давай адрас. Наўрад ці яна сышла далёка.

Знаходзіць

Пяць гадоў таму

У лесе пахла ігліцай, зёлкамі і суніцамі. Пад нагамі пахруставалі сухія галінкі. Ноч была светлая, нябёсы абсыпаныя зорамі, яркімі-яркімі. Між тонкіх аблокаў плыла поўня, разліваючы вакол ледзяное святло. Міхась стаяў на лясной сцежцы, нясмела ўзіраючыся ў паўзмрок. Ён не мог паверыць у тое, што ўбачыў на возеры. Яму патрэбныя былі доказы, трэба было ўбачыць яшчэ раз. Каго-небудзь. Што-небудзь.

Між соснаў мільганула дзявочая постаць. Міхась зрабіў некалькі крокаў насустрач. Залатыя бранзалеты ды кветкавы вянок на галаве — усё, што на ёй было апранута. Светлыя доўгія валасы вадаспадамі сцякалі на плечы, прыкрываючы гнуткі стан. Яна танцавала, пагойдваючы сцёгнамі, і падыходзіла ўсё бліжэй, не зводзячы з яго вачэй.

— Міхась! Хадзі да мяне, Міхась, — пяшчотны голас зачароўваў. — Мы будзем разам заўсёды.

Яна абняла яго за шыю, прыціснулася ўсім целам. Хлопец разгублена паклаў рукі ёй на талію. Ад дзяўчыны пахла лясной свежасцю і мёдам, а зялёныя вочы зацягвалі, нібы гушчар.

— Ты хочаш, Міхась? Хочаш, каб мы былі разам? Тады пацалуй мяне.

У роце перасохла. Ён не мог думаць ні пра што, акрамя яе. Пакорліва пацягнуўся да вуснаў, але яна рассыпалася попелам проста ў яго руках.

Ля старой сасны стаяў змрочны юнак у чорным. Вакол выстаўленай наперад левай рукі круціліся, згасаючы, Сімвалы, між пальцаў бегалі блакітныя іскрынкі.

— Прабач, што перашкодзіў, — сур'ёзна сказаў ён, — але працяг быў бы так сабе.

— Ты забіў яе?!

— Ясная справа, інакш яна б забіла цябе. А ты думаў, яна што з табой збіралася рабіць?

Шчокі гарэлі ад сораму. Добра, што ў лесе даволі цёмна.

— Мне падалося, што яна хацела пацалунку, — прамармытаў ён.

— Каб праз яго высмактаць тваю Энергію. Гэта Зазоўка. Яны зацягваюць маладых мужчын у гушчар і забіваюць. Звычайна не кранаюць такіх, як ты, але гэтая, відаць, была дужа галодная.

— Такіх, як я?

— Малых.

— Ты сябе бачыў? — фыркнуў Міхась. — Ды ў табе пантоў больш, чым росту! Адкуль ты такі ўвогуле ўзяўся?

— Хадзем, давяду цябе да ўскрайку лесу, — юнак засунуў рукі ў кішэні чорнай скураной курткі. — Тут ёсць старая хата, ля ручая. Завітвай, калі хочаш.

— Яна хіба не закінутая?

— Напэўна не, раз я там жыву. Да сустрэчы.

* * *

Міхась усё часцей стаў знікаць кудысьці пад вечар. Раніцай дапамагаў па гаспадарцы: без лішніх размоў касіў, палоў, калоў дровы, мыў посуд. Удзень гуляў-

ся з сястрой і чытаў, а пад вечар напіхваў заплечнік ежай, якую не даеў на вячэры, і сыходзіў. Віктар не дапытваў куды. Сын сем гадоў жыў у стане татальнага кантролю — хай атрымлівае асалоду ад свабоды.

Сёння ён забыў дома тэлефон. Агнія ўвесь вечар праседзела на ганку, углядаючыся ў лес на гарызонце. Віктар тройчы спрабаваў пакласці яе спаць, але марна. Яна нібы прадчувала. Калі Міхась не прыйшоў а дзясятай — акрэслены бацькам дэдлайн — яна расплакалася, і мужчына не прыдумаў нічога лепш, чым узяць малую на рукі ды спяваць. Спяваў, што спявалася: Вайцюшкевіч, «Аукцыон», «Крама», «Сплін», Мельнікаў, Цой. Недзе на «Скоро кончится лето» малая нарэшце паснула.

Ісці яго шукаць было глупствам. У які бок? Віктар угаварыў сябе пачакаць яшчэ гадзіну. Рассыпаў зёлкі міма кубка, ледзь не апарыўся кіпнем — так трэсліся рукі. З сынам магло здарыцца што заўгодна. Міхась пра многае не ведаў, нават больш, чым Агнія. Не ведаў, бо не верыў.

Віктар злаваўся. На сябе. Жыццё дало яму яшчэ адзін шанс быць добрым бацькам, а ён нават не паклапаціўся расказаць сыну пра навакольны свет. Баяўся, што не паверыць, палічыць вар'ятам, як калісьці Ірына, і з'едзе. Віктар заўсёды быў баязліўцам. Праз страх ён ажаніўся з жанчынай, якую не кахаў, і апынуўся адзін на хутары. Праз страх ён не бачыў сына цэлых сем гадоў і нават не ведаў, што мае дачку. Праз страх ён цяпер мог згубіць усё, што толькі атрымаў.

Трэба супакоіцца, прымусіць сябе супакоіцца. Мужчына выйшаў на ганак, прыслухаўся. Начныя шапаценні і шолахі — не толькі вецер ды вожыкі. Ён сціснуў парэнчы, абапіраючыся, амаль павісаючы на іх.

— Калі ласка. Калі хто-небудзь мяне чуе. Дзе мой сын?

Цішыня. Шолах лістоты. Ціўканне птушак. І ледзь чутнае «чакай». А праз нясцерпна доўгія дзесяць хвілін — няўпэўненыя, але таропкія крокі па вільготнай ад расы траве. З боку лесу. Дзве напружаныя, напятыя постаці. Значыць, сябра сабе знайшоў...

Сын на Віктара не глядзеў — спалохана, сарамліва вывучаў наскі кедаў. А вось другі адразу смела сустрэўся з мужчынам позіркам. Вочы дарослыя, халодныя.

— Добры вечар, спадар Віктар. Я прашу прабачэння. Міхасёва спазненне — мая правіна.

— Вы ўтрымлівалі яго гвалтоўна? — іранічна пацікавіўся мужчына.

— Не, спадар Віктар. Але...

— У такім выпадку не бачу сэнсу працягваць размову. Хутка ў хату.

Сын імгненна ўзляцеў на ганак.

— Абодва, — сурова дадаў мужчына.

Юнак хацеў быў спрачацца, але злавіў умольны позірк Міхася і падпарадкаваўся.

* * *

Віктар засынаў, гонячы прэч думкі пра тое, што рабіць раніцай з двума шалапутамі. У хаце было ціха, толькі ледзь чутно гула на акне муха. Віктару было прахалодна і няўтульна, бо давялося паслаць сваю коўдру на падлозе ў дзіцячым пакоі, каб сябру Міхася было дзе легчы. Той, праўда, гатовы быў спаць нават на голай зямлі, але Віктар быў катэгарычна супраць.

Раптам слаба рыпнулі дзверы. Напэўна, начны госць вырашыў пазбегнуць адказнасці. Без сур'ёзнай прачуханкі — не выйдзе. Ды і не мог ён адпусціць дзіця невядома куды сярод ночы. Узняўся.

Уцекачом апынуўся не сябар Міхася, а ён сам. Стаяў на ганку, паклаўшы локці на парэнчы, закрываючы

далонямі твар. Плечы яго ледзь заўважна трэсліся, ён шмыгаў носам.

— Міхась, я не самы лепшы бацька, але... — ціха пачаў Віктар.

— Нават самы горшы бацька не заслугоўвае такога стаўлення, — юнак апусціў галаву яшчэ ніжэй, хаваючы слёзы. — І нават самы лепшы сын не заслугоўвае прабачэння за такое стаўленне.

Таму ён прабачэння і не прасіў. Лічыў, што не заслугоўвае.

— Глупства! — усю злосць як рукой зняло. — Самы лепшы, можа, не заслугоўвае, а ты заслугоўваеш, бо ты мой.

Ён акуратна прыціснуў сына да сябе.

— Я жудасна хваляваўся, Міхась. Агнія не хацела ісці спаць, плакала... Я не злуюся, але калі такое адбудзецца зноў, я палічу, што не спраўляюся з вашым выхаваннем, і вы паедзеце ў Мінск, да мамы. Гэта зразумела?

Міхася калаціла. Ён чапляўся за бацькаву спіну, як у першы вечар. Світар намок у тым месцы, дзе сын прыціскаўся тварам. Мужчына ведаў, што яго пагрозы зажорсткія, але як яшчэ ён мог упэўніцца, што гэтага не паўторыцца? Ён ускудлаціў сыну валасы.

— А тэлефон я да цябе клеем прыклею. Ці на самарэз пасаджу.

Міхась ледзь чутно хмыкнуў.

— Прабач мне, калі ласка.

— Прабачаю. Скажы мне, хто гэты сек'юрыці, якому я ранкам адкручу галаву?

— Ён заўтра распавядзе сам. Да таго, як ты адкруціш яму галаву.

* * *

— Дык ты забіваеш монстраў? Як Геральт? Ван Хельсінг? Паляўнічы на прывідаў?

Усевалад адставіў кубак гарбаты, зірнуў спачатку на сябра, потым на ягонага бацьку.

— Тата, ён гэтых параўнанняў ад мяне наслухаўся, — шэптам заўважыў Міхась. — І ніводнага не ведае.

— Я — Навальнічнік. Нас стварыў Пярун, каб мы знішчалі істот, якія перашкаджаюць людзям жыць.

— Але ж не ўсе істоты шкодныя, ці не так? — сур'ёзна спытаў Віктар. — Хатнікі, лесуны — яны нават карысныя...

Міхась закашляўся і здзіўлена ўтаропіўся ў бацьку.

— Вы іх бачыце? — напружыўся Усевалад.

— Бачу. А не павінен?

— Не. Дзеці гадоў да сямі бачаць Пачвар, потым сталеюць і ўсё. Ёсць некаторыя істоты, бачнасць якіх залежыць ад іх жадання. Прыкладам, зазоўкі. Але ёсць адораныя людзі — Ваяры Навальніцы, Знахары, Ведзьмары. Яны альбо не перастаюць бачыць з дзяцінства, альбо пачынаюць бачыць у нейкі момант... — хлопец задумаўся, звёў бровы. — Вы нядаўна пачалі іх бачыць, як і Міхась?

— Ды даўно. Ужо гадоў восем.

— Хм. Распавядзіце, калі ласка, як гэта адбылося. Гэта вельмі значна, спадар Віктар. Гэта можа паўплываць... — юнак заклапочана зірнуў на Міхася. — На жыццё вашага сына.

Віктар цяжка выдыхнуў, наліў сабе яшчэ кавы. Ён нікому яшчэ не распавядаў у падрабязнасцях, не агучваў усё тое, што адбывалася ў яго ў галаве, і не хацеў бы. Але калі яго аповед мог абараніць, уратаваць ад небяспекі Міхася, ён не меў права маўчаць.

— Міхасю было гадоў пяць, не больш, калі я згубіў сваіх бацькоў. Яны выправіліся ў лес, па журавіны, і не вярнуліся. Я прыехаў з горада іх шукаць. Тут былі і міліцыя, і МУС, і валанцёры... Праз тыдзень знайшлі ў дрыгве бацькаў бот. Адзін. І ўсё. Шукалі яшчэ тыдні два, нават дайвераў выклікалі — безвынікова. Раз'ехаліся... А з часам, я не ведаю, мабыць, гады два тады прайшло, пачаліся начныя жахі. Мроілася, як бацькоў цягнуць у багну агідныя ржавыя лапы, як бацька да апошняга дапамагае маці трымацца на паверхні, а яна кліча мяне, просіць дапамогі.

— Тата, чаму ты не распавядаў? — прыгаломшана спытаў Міхась. — Я таксама бачу жахі.

— Я баяўся, сынок. Баяўся, што ты будзеш лічыць мяне шызафрэнікам, як твая маці... Праз год ці каля таго я стаў чуць галасы. Яны клікалі мяне сюды, але я баяўся ехаць. Хацеў нават прадаць хату, але рука не ўзнялася... Іра прымусіла схадзіць да лекара. Той паставіў дыягназ, выпісаў лекі. Ад іх рабілася толькі горш, увесь час хацелася спаць. Засынаў — і бачыў жахі. Пачаў хадзіць у сне, ламаў рэчы, аднойчы ледзь не выйшаў у акно, іншым разам прачнуўся ў ванне, поўнай вады. З Ірай увесь час сварыліся: яна лічыла, што я магу нашкодзіць ёй ці табе. Хацела, каб я лёг у лякарню. Мы дамовіліся, што я з'еду сюды і больш не буду вас непакоіць. Навошта паспяховай адвакатцы муж-шызафрэнік? З'ехаў, пазнаёміўся з мясцовай фаўнай, так бы мовіць. Яны мне не шкодзілі, але і лепш не стала. Прачынаўся на паўдарозе да лесу. У мяне ёсць знаёмая... Я не ведаю: траўніца, шаптуха, вядзьмарка — яна называе сябе знахаркай. Я папрасіў яе прыехаць. Яна панавешвала зачураў па ўсёй хаце, мне намяшала зёлак — дагэтуль п'ю кожны дзень. Бачыць я не перастаў, але глюкі з галасамі і начнымі жахамі скончыліся.

Усевалад кіўнуў. У адрозненне ад Міхася ён не выглядаў ні здзіўленым, ні прыгаломшаным. Быццам пачуў тое, што і чакаў пачуць.

— А потым жахі пачаў бачыць Міхась... А цяпер — і Пачвар. Вось я ж адразу адчуў, што з ім нешта не тое, — задуменна прамармытаў ён. — Можна мне паглядзець зёлкі?

Віктар паставіў перад юнаком слоік. Той яго адкаркаваў, панюхаў, высыпаў перад сабой на стол, расклаў па купках.

— Тонкая праца, — заўважыў задаволена, падхапіўся. — Ні ў якім выпадку, ні пры якіх абставінах не адпускайце сына ў лес аднаго. Міхась, ты чуў? Ні нагой! Выклікайце Знахарку — хай складае збор для яго. Скажыце: ён павінен быць крыху іншы, больш моцны. Яна разбярэцца. Тэрмінова, бо вас хутка дастануць.

І вылецеў з хаты.

* * *

Светлая, усмешлівая жанчына раскладала па стале кветкі і травы. Рукі лёталі, танцавалі, ствараючы чароўны малюнак, зразумелы толькі ёй. Яна кідала цёплыя, цікаўныя позіркі на Міхася, які сачыў за яе працай.

Віктар сядзеў, утаропіўшыся ў камп'ютар, і рабіў выгляд, што вельмі сканцэнтраваны на кодзе. Як толькі Ядвіга ўвайшла ў хату, ён імгненна ператварыўся з ураўнаважанага, разумнага мужчыны ў натапыранага падлетка, старанна дэманструючы сваю абыякавасць.

— Ты не казаў, што ты бацька, — кпліва паведаміла яму Ядвіга.

— Неяк не заходзіла пра гэта размова, — змрочна адказаў Віктар.

Яна шматзначна павяла бровамі і вырашыла змяніць тэму. І суразмоўцу.

— У цябе ёсць талент, Міхась, як у твайго бацькі. Як у кагосьці з яго бацькоў і ў кагосьці з бацькоў яго бацькоў. Гэта спадчыннае.

— Я магу валіць Нячысцікаў?

— Ты не Ваяр, калі ты пра гэта. Навальнічнікі хоць ад пачатку і нараджаюцца ў звычайных сем'ях, усё ж такі... Іншая раса. Нашчадкі старажытнага боства. Мы з табой не нашчадкі багоў, нават калі твайму бацьку непрыемна гэта чуць, — яна гарэзліва зірнула на Віктара. — Мы звычайныя людзі, проста адораныя. Як мастакі альбо музыкі. Калі няма таго, хто навучыць, ад таленту мала сэнсу. Усё жыццё будзеш запарваць зёлкавыя гарбаткі і прыдумляць вершыкі, надзіва падобныя да замоў...

Значыць, яны з бацькам такія ж, як гэтая дзіўная жанчына? Хлопец задуменна зірнуў на мужчыну, які ўсё яшчэ неадрыўна глядзеў у манітор. Дваццаць першае стагоддзе — навуковы і тэхналагічны прагрэс, урбанізацыя, ГМА, віртуальная рэальнасць, а ягоны бацька — праграміст-знахар. Ачмурэць.

— Дык тата... — Міхась пакруціў пальцам каля скроні. — Таму што ў яго не было настаўніка?

— Не. Дар можа ўвогуле не прачнуцца, калі яго не абудзіць. Мяне з дзяцінства вучыла знахарству маці, але я тады і падумаць не магла, што мой вясковы сябар Вік такі ж, як я. Дар прачнуўся, калі яго паклікала Вядзьмарка. Тое ж самае цяпер адбываецца з табой, але гэта не значыць, што ты павінен абраць яе бок.

— У чым розніца паміж ведзьмаком і знахарам? У афарбоўцы?

— Можна і так сказаць. Вядзьмак карыстаецца чужой Энергіяй, амаль як Ваяры. Энергіяй Іншасвету — свету нячысцікаў і памерлых. Таму ён мацнейшы

за знахара, можа змяняць аблічча, кіраваць жывёламі. Самыя адораныя могуць нават лётаць, але ў канцы жыцця яны дорага за гэта плацяць. Вядзьмак павінен Іншасвету душу. Душы ведзьмакоў пасля смерці робяцца ератнікамі, лютымі нячысцікамі. Адзіная магчымасць пазбегнуць гэтага — перадаць сваю дамову, свой праклён спадчыннику. Знахар карыстаецца толькі сваёй Энергіяй і ведамі. Ён нічога не пазычае, а значыць, нічога не павінен. Ясная справа, знахары чаруюць рэдка, бо Энергія доўга аднаўляецца, — яна змоўкла на імгненне. — Міхась, табе не абавязкова абіраць. Можаш паспрабаваць жыць звычайным жыццём... Зёлкі прыбяруць «пабочку», начныя жахі, галасы ў галаве і ўсё такое, але рашэнне мусіш прыняць ты сам.

— Пачакайце. Калі гэта спадчыннае... І нас з бацькам кліча Вядзьмарка. Гэта... Можа быць яго маці, ці не так? — юнак узрушана закруціўся на крэсле.

Ядвіга звяла бровы, занепакоена зірнула на Віктара.

— Хутчэй за ўсё. Але гэта не значыць, што вы павінны...

— Гэта не мая маці, — Віктар нарэшце адарваўся ад камп'ютара, падышоў да сына, паклаў рукі яму на плечы. — Мая маці, як і мой бацька, знікла ў дрыгве шмат гадоў таму. Што б нас ні клікала, ні я, ні ты, сын, на гэты покліч не адгукнёмся.

* * *

Віктар трымаў руку над чырвонымі жарынкамі, што гарэлі адзінай яркай плямай сярод насычанай цемры ночы. Вакол было надзіва ціха. Тое, што трэба.

Ён заўсёды задаваў сабе шмат пытанняў і доўга, пакутліва шукаў на іх адказы. Чым складаней пытанне, тым лепш, бо тым даўжэй пошукі. Відавочныя адказы ён за адказы не ўспрымаў, бо так нецікава.

— Ты чаго не спіш? — пачуўся з цемры мяккі шэпт.

На сцежцы стаяла тая, праз каго ён калісьці меў самыя доўгія пошукі адказаў на свае пытанні. У простай белай сукенцы, з сабранымі ў касу светлымі валасамі. Ён дзівіўся яе шчырасці, празрыстасці. Яго ніколі не вабіла гэта ў людзях.

— Ідзі дадому, Ядзя. Ты змерзнеш.

— Будзь шчырым, Вік, цябе не хвалюе тэмпература майго цела. Ты ўсяго толькі хочаш быць адзін. Ва ўсіх сэнсах.

Яна не чакала адказу, бо гэта было не пытанне. Села побач. Віктар кінуў на вуглі крыху трэсак і паперы, дастаў з кішэні запалкі.

— Памятаеш, мы калісьці сядзелі вось так каля вогнішча і размаўлялі пра ўсякую лухту? — назіраючы, як разгараецца полымя, спытала яна.

— Тады па зямлі яшчэ хадзілі дыназаўры.

Яны праводзілі разам кожнае лета. Ён назіраў, як смешная нязграбная малая з дзьмухаўцом замест валасоў паступова ператвараецца ў прыгожую ладную дзяўчыну. Ён сам, наадварот, з кожным годам рабіўся горш: рукі задоўгія, спіна сутулая, нос з гарбінкай, потым яшчэ гэтыя жудасныя вусы, якія бацька забараняў галіць... Яна любіла прыгоды ды вандроўкі, таямніцы ды неверагодныя гісторыі. Ён быў скептыкам і дамаседам. Яна любіла шумныя кампаніі, танцы, жарты. Ён любіў быць адзін.

Яна ўвесь час тармасіла яго: трэба быць больш пазітыўным, лёгкім, адкрытым, рухомым, хопіць нудзіцца ды блукаць недзе ўнутры сябе. Яго гэта раздражняла, але ён трываў. Трываў, бо яна глядзела на яго так, як не глядзеў больш ніхто. Трываў, бо толькі яна магла бясконца слухаць яго нудныя разважанні пра ўладкаванне сусвету і недасканаласць чалавецтва. Трываў,

пакуль яна не распавяла, што ўсё больш складана, чым яму здаецца. Што існуюць адораныя людзі, якія павінны дапамагаць іншым, напрыклад, яна. І калі ён будзе з ёй, яна абавязкова яму дапаможа. Віктару не патрэбна была дапамога. Тады не патрэбна была.

— Што цябе непакоіць, Вік? Яго выбар? — спакойна пацікавілася Ядвіга. — Ён зробіць правільны. Ён цудоўны хлопец.

— Не мая заслуга, — адрэзаў ён і ціха ды задуменна працягнуў. — У яго шнар на каленцы, даволі вялікі, і на локці яшчэ. Напэўна, упаў з ровара, але я не ведаю. Ён ніколі не носіць скураныя рамяні, толькі з тканіны. І не спіць спінай да дзвярэй. Сваё становішча ў сне цяжка кантраляваць, але ў яго неяк атрымліваецца. Запытваю — аджартоўваецца. Я не кантактаваў з сынам сем чортавых гадоў! І цяпер нават сабе не магу патлумачыць чаму. Таму што Іра мне забараніла? Ды хто яна такая? Я проста... Кінуў яго, — Віктар раззлавана шпурнуў у полымя паленца.

— Міхась прабачыў табе, — яна ўзяла яго за руку. — У той самы момант, як ты зноў з'явіўся ў ягоным жыцці. Цяпер і ты павінен сабе прабачыць.

Мужчына вызваліў далонь, зарыўся пальцамі ў валасы. Яны пасварыліся, і на наступнае лета яна прыехала з хлопцам. Прыгожым дужым бландзінам, такім жа ўсмешлівым і шчырым, як яна сама. Віктар усю вясну падбіраў словы, каб папрасіць прабачэння. Апынулася — дарма. Ён для яе быццам знік. Хіба што віталася пры сустрэчы, гледзячы нібы скрозь яго.

Яшчэ праз лета яна не прыехала наогул. Бацькі сказалі, што яны з жаніхом з'ехалі жыць у Расію. У тое ж лета Віктар сустрэў Ірыну. Тады ён ужо вельмі няблага зарабляў, і яе, відавочна, цікавілі яго грошы крыху больш, чым ён сам. Але яго гэта не турбавала. Ірына была прыгажуняй, разумнай, але даволі халод-

най. Яна не лезла ў душу, не спрабавала яго выправіць, пакуль не прыйшло вар'яцтва... Тады ён проста ўцёк. Уцёк, бо Іра нічым не магла дапамагчы. Ніхто не мог, акрамя...

— Чаму ты заўсёды знаходзіш адказы на мае пытанні?!

— Таму што яны на паверхні, Вік, але ты не звяртаеш на іх увагі, — у яе голасе пачулася крыўда, яна ўзнялася. — Табе так нецікава. Дабранач.

Ён праводзіў яе позіркам. Нічога, у ёй абсалютна нічога асаблівага. Яна такая простая, такая звычайная.

Ядвіга вярнулася ў тое ж лета, калі Віктар з'ехаў на хутар. Нібы адчувала, нібы ведала, што яму неабходна дапамога. І дапамагла. Ён не распытваў пра яе сям'ю, яна — пра ягоную. Заходзіла рэдка — прыносіла зёлкі. Размаўляла мала, смяялася яшчэ менш і глядзела на яго так, быццам згубіла нешта каштоўнае. Так, як не глядзеў больш ніхто.

— Пачакай... Ядвіга, я хачу вярнуцца ў Мінск. Дамовіцца з Ірай, каб дзеці засталіся са мной. Ёй яны ўсё адно відавочна перашкаджалі ладзіць кар'еру і асабістае жыццё...

— Правільнае рашэнне. Калі табе, вядома ж, хопіць на яго смеласці, — праз плячо кінула жанчына.

— Я хачу... Ядзя, я хачу, каб ты з'ехала са мной. Калі ласка.

— Не тое, каб я была супраць, але дазволь удакладніць: ты хочаш, каб я расціла тваіх дзяцей ад іншай жанчыны?

Віктар закрыў твар далонямі. Ён хацеў бы, каб яна расціла яго дзяцей. Без дадатку пра «іншую жанчыну». Не, не так. Ён хацеў бы, каб яны ўдваіх расцілі дзяцей. Але для гэтага было ўжо надта позна. Альбо?..

— Я проста... Хачу цябе.

Яна таямніча ўсміхнулася і моўчкі сышла ў хату.

* * *

Міхась сядзеў на ганку і глядзеў у пустэчу. Хацелася курыць. Вэйп боўтаўся недзе ў заплечніку, але яны з бацькам паспрачаліся, хто сарвецца першым. Міхась саступаць не збіраўся.

Ён пачаў курыць назло маці. Яму патрэбна была хоць якая форма пратэсту. У яго пакоі панавала бездакорная чысціня. Ён насіў белыя адпрасаваныя кашулі і ўкладваў валасы так, як яна лічыла прыгожым. Ён граў на фартэпіяна, але хацеў бы на гітары. Ён займаўся баскетболам, але хацеў бы танцамі. Ён сябраваў з тымі, з кім яна хацела. Ён чытаў, глядзеў, слухаў тое, што яна лічыла падыходзячым. Напэўна — цяпер ён разумеў — яна думала, што кантроль і падпарадкаванне ўратуюць яе дзяцей ад спадчыннай хваробы. Толькі метады ў яе былі дурныя. Ды і хваробы ніякай не было.

Па дарозе павольна, нібы сумняваўся альбо асцярожнічаў, ішоў Юрась. Міхась не рады быў яго бачыць, але і гнаць прэч не збіраўся. Агнія зусім зажурылася без свайго фантастычнага сябра.

— Даўно цябе не было відаць, пацягайла…

— Не падумай, што я спалохаўся тваіх пагроз. Мяне куды больш напружваў твой новы сябар, — Юрась хіснуў галавой. — Што ён табе распавёў? Як яны смела і самаахвярна ахоўваюць вас ад стварэнняў ночы?

— Амаль слова ў слова, — хмыкнуў Міхась.

— Ён звычайны забойца. Магу паказаць табе «стварэнняў ночы». Агнію таксама бяры з сабой. Павер, яны не зробяць вам шкоды. Той выпадак з Азярніцамі… Гэта выключэнне. Нешчаслівае выключэнне, і я магу гэта давесці.

— Пачакай-пачакай. Спярша патлумач мне: што ты за стварэнне ночы?

— Пярэварацень, — развёў рукамі Юрась.

— То-бок цябе ўкусіў не ваўкалак, а... э-э-э... Каталак?

— Ніхто мяне не кусаў! Доўгая гісторыя, потым як-небудзь. Яшчэ пытанні?

— Чаму я бачыў цябе катом, пакуль не пачаў бачыць... Усіх астатніх?

Юрась закаціў вочы, крутануўся вакол сябе і ператварыўся ў таго самага ката, якога напачатку лета прыцягнула дадому Агнія. Зноў крутануўся і ператварыўся назад у чалавека.

— Пярэваратні бываюць розныя. Я з тых, хто можа змяняць аблічча. Для няздольных бачыць я заўсёды кот, для адораных — залежыць ад майго жадання.

— Як ты сказаў? «Няздольных бачыць»?

— Так іх называе мая гаспадыня. Пазнаёмлю вас крыху пазней. Дык вы ідзяце ці не?

* * *

Агнія з цікаўнасцю разглядала нячысціка, які сядзеў на паваленым дрэве і, павесіўшы нос, плёў лапці. Ён выглядаў зусім як чалавек, толькі між чорных валасоў шарэлі невялікія вострыя рожкі, а рукі здаваліся надзіва доўгімі. Нячысцік мармытаў пад нос журботную народную песеньку ды раз-пораз сумна ўздыхаў.

— Дзень добры, пан Шатан, — гарэзліва, але ветліва вымавіў Юрась.

— Каму добры, а каму зноў босым хадзіць, — неахвотна адказаў нячысцік.

— А куды ты шлях трымаеш?

— Нікуды. Нідзе мяне не чакаюць. Ніхто мне не рады.

Юрась красамоўна зірнуў на Міхася.

— Ты хоць на Рабінавую Ноч прыходзь...

— Не, туды не пайду. Там будзе натоўп. Танцы гэтыя, гульні, і Вядзьмарка твая будзе. Не люблю вядзьмарак. Каб мне хоць адна вядзьмарка што добрае ў жыцці зрабіла, яшчэ б падумаў, а так не пайду.

Юрась уздыхнуў і паматляў галавой, маўляў «хадзем адсюль».

— Хто яго пакрыўдзіў? — пацікавілася малая, калі яны адышлі падалей.

— Шатаны ўвесь час такія. Самотнікі, жудасна крыўдлівыя, бадзяюцца па свеце і шкодзяць па драбязе: там плот расхістаюць, тут яблыню абтрасуць. Іншых нячысцікаў трываць не могуць. Ды яны нават сябе з цяжкасцю выносяць.

— Карацей, так сабе нячысцікі, — Агнія расчаравана падціснула вусны. — Амаль як наш бацька.

Хлопцы зарагаталі.

— Нічога, наступныя спадары мусяць табе спадабацца, — праз смех вымавіў Юрась.

Між сініх ад ягад кустоў чарнічніку мітусіліся ды гайсалі невялічкія істоты, падобныя да катоў, што ходзяць на задніх лапках. Поўсць у іх была кароткая, хвосцікаў не было зусім, а тварыкі — дзіцячыя, з вялікімі гарэзлівымі вачамі. Яны гуляліся ў квача, куляліся і кідаліся адзін у аднаго саспелымі чарніцамі, але заўважыўшы гасцей, з радасным віскатам кінуліся абдымацца.

— Вітанкі, Шэшачкі. Вярніце, калі ласка, усё, што скралі падчас вашай ветлівай сустрэчы.

— Гэта ён пра што? — істоткі гарэзліва пераглядаліся.

— Міхась, Агнія, што ў вас знікла? — са штучнай суровасцю спытаў Юрась.

— Гадзіннік з рукі знялі, з кішэні тэлефон выцягнулі, — разгублена прамармытаў Міхась, абмацваючы вопратку.

— А ў мяне сцягнулі тры жалуды і аловачак.

— Вяртайце хутка, бо госці пакрыўдзяцца і сыдуць.

Нячысцікі мітусліва выклалі ўсе рэчы на пень і шчыра залыпалі вачамі на Юрася. Агнія хутка была зацягнутая ў гульню «злаві чарніцы ротам у палёце» і рагатала гучней за некаторых нячысцікаў. А юнакі апусціліся на траву і распачалі з Шэшкамі абмеркаванне розных лясных навін.

— Праўда, што ў лесе з'явіўся Навальнічнік? Ух, мы яму наваляем, гэтаму Навальнічніку! Мы у-у-у якія ваяўнічыя. Усім пакажам!

— Ваяр ужо сышоў, але калі раптам вернецца — вам лепш трымацца ад яго падалей, — сур'ёзна адказаў Юрась.

— Мы памятаем, якая бойка была ў мінулы раз, і больш так не хочам.

— Бойка? — перапытаў Міхась. — Усевалад нічога такога не распавядаў.

— Ну яшчэ б. Хочаш пачуць падрабязнасці?

* * *

Магутныя замшэлыя бярвенні, цёмны чарапічны дах, шырокі ганак у грамафончыках павою, а на ганку яна. Жанчына з яго начных жахаў. Маладая, прыгожая. Рудыя хвалістыя валасы, роўныя вузкія плечы, тонкія рукі, годна прыўзнятая галава.

— Заходзьце, мае залатыя, пачувайцеся як дома.

У хаце пахла камінам, зёлкамі і старымі кнігамі. Побач з апошнімі на паліцах стаяла процьма рознакаляровых бутэлечак. У іх не было ні сушаных мух, ні лапак павукоў, толькі нейкія каменьчыкі ды галінкі. Агнія аглядала хату з шырока адкрытым ротам.

— Міхась хоча пачуць праўду пра Ваяроў, — цвёрда, але быццам просячы вымавіў Юрась.

— Пачуе, калі хоча. Сядайце. Юрчык, зрабі нам гарбаты, калі ласка, — яна падышла, ласкава кранула шчаку Міхася. — Я так рада, што ты прыйшоў, што ты пачуў мяне. Вы — мае нашчадкі, мае спадчыннікі. Дарэчы, як там Віця?

Юнак адхінуўся, змрочна гледзячы на яе.

— Раней вас гэта не турбавала, — раздражнёна адказаў ён. — Вам павінна цяпер быць гадоў семдзесят. Чаму вы такая маладая?

— Таму што магу, — пераможна ўсміхнулася жанчына. — Што яшчэ цябе цікавіць, Міхась? Пытай, не бянтэжся.

— Усё. Я хачу разумець, што адбываецца. Як вы зніклі? Чаму бацька вас не знайшоў? Што здарылася з дзедам? Чаму вы не далі бацьку ведаць, што жывая? Навошта вы клікалі спачатку яго, а потым мяне? Што вам ад нас трэба? — хлопец ускочыў, захадзіў па хаце.

Яна засмяялася, звонка, залівіста.

— Ты цуд, Міхал. Мы з Жэнем збіралі журавіны, калі на нас напаў Аржавень. Яны рэдка кранаюць людзей, але гэты быў раз'ятраны, надта галодны, бо ў лесе перабілі ўсіх дзікоў, іх звычайную ежу. Нам не пашанцавала. Жэня да апошняга дапамагаў мне трымацца... Мяне выратавала цётка Марыся, матчына сястра, якая знікла ў лесе шмат гадоў таму. Яна ўзяла мяне ў вучаніцы, бо ёй патрэбна была дапамога.

— Няўжо нельга было неяк... Перадаць бацьку, што вы выжылі?! — абурана перабіў Міхась.

— Цётка прасіла пачакаць, не звязвацца ні з кім з сям'і. Казала, што гэта небяспечна, бо Навальнічнікам будзе прасцей нас знайсці. Яна хацела спачатку ажыццявіць рытуал, які б дазволіў трымаць усіх нячысцікаў гэтага лесу пад кантролем. Не знішчыць, не забіць і спаліць, як тое робяць Навальнічнікі, а проста кантраляваць, каб у лесе больш ніхто не паміраў...

Мы не паспелі. Ваяры даведаліся пра нашы планы. Яны не маглі згубіць уладу над цэлым лесам, таму прыйшлі паказаць, хто тут гаспадарыць. Разнеслі ўсё ў пыл, спалілі хату і частку лесу. Цётка ледзь паспела перадаць мне здольнасці, — Вядзьмарка выцерла вугалкі вачэй рукой. — Я вінаватая перад Віцем, вінаватая перад табой, Міхасёк. Мой покліч нарабіў бяды ў вашай сям'і, я ведаю, але ў мяне не было іншага выйсця. Мне патрэбна ваша дапамога. Яго, а лепш твая. Я абяцаю, што папрашу ў Віці прабачэння, я ўсё яму растлумачу, толькі потым, калі ўсё скончыцца. Я хачу паўтарыць рытуал, Міхась. Яны забралі рукапіс, але ў мяне атрымалася ўзнавіць усё па памяці. Мне трэба, каб ты мне ў гэтым дапамог. Ты — мой спадчыннік.

— Я... Адна Знахарка сказала, што ў мяне ёсць выбар...

— Тая дзяўчына майго сына, як яе? Ядвіга? Яна слабая, — жанчына адмахнулася. — Быў бы ў яе такі талент, як у нас з табой, яна б не раздумвала. Ці ты свядома хочаш быць слабым?

Міхась закусіў вусны. Чаго ён не хацеў, дык гэта быць слабым і безабаронным. Яму хапіла.

— Я згодны.

Перунова Зорка

Змрочныя цені хаваліся па кутах, глядзелі на яго. Злосна, помсліва, але дастаць не маглі. Хлопчык вільготнай далонню намацаў на грудзях драўлянае колца. Гарачае, значыць працуе, ахоўвае.

Яшчэ некалькі начэй таму ён не мог заплюшчыць вочы, бо баяўся. Апоўначы цень прыходзіў па яго. Прыходзіў калматым, парослым чорнай поўсцю страшыдлам, сядаў на грудзі і душыў. Моцы супраціўляцца не ставала. Ён засынаў — не мог зусім не спаць — і не спадзяваўся на раніцу расплюшчыць вочы. Аднак расплюшчваў.

Суседзі кпілі, выхавальніцы зацягалі па лекарах, думалі, астма. Дыягназ не спраўдзіўся, і яго больш не слухалі, бо не верылі. Стась вырашыў праблему радыкальна: аднойчы не пайшоў у спальню ўвогуле, не вярнуўся з вечаровага шпацыру.

Далёка не сышоў — страшна. Сядзеў на лаўцы ў адным з двароў-калодзежаў і глядзеў, як на светлых яшчэ нябёсах з'яўляюцца зоркі. Хутка яго пачнуць шукаць. Знойдуць — няхай, але сам ён туды не вернецца.

На вуліцы таксама былі цені ды іншыя начныя дзівоты. Яму нават падалося, што ў супрацоўніка «Зелянбуду», які вяртаўся з працы, з-пад капелюша вызіраюць рожкі. На шчасце, ніхто не цягнуў да яго прывідныя лапы і не набліжаўся чорным кудлатым ценем.

Да яго крочылі два мужчыны. Вулічныя цені расцякаліся ад іх па самых цёмных кутах. Адзін — высокі, хударлявы, усмешлівы, у фетравай клятчастай кашулі, другі — жылісты, хмурны, у чорнай байцы. Яго позірк нібы цвіком прыбіў хлопчыка да месца.

— Хэй, малеча, ты што тут робіш? — мякка пацікавіўся ўсмешлівы.

— Сяджу, — дзёрзка адказаў Стась.

— Чаму не дома? — сурова спытаў другі.

Хлопец скасавурыўся ў напрамку месца, у якое не планаваў вяртацца. Прынамсі, пакуль. Пацепнуў плячыма, змаўчаў.

— Дзе бацькі? — мужчына ўзняў голас, робячыся яшчэ большым ды страшным, гарой навісаючы над малым.

Усмешлівы тузануў яго за рукаў.

— Усевалад, хопіць, ты яго палохаеш, — прысеў, працягнуў руку. — Мяне завуць Міхал, а цябе?

— Стась.

— Што ў цябе здарылася, Стась?

Хлопчык ведаў фішку пра добрага і дрэннага копаў. Часам, калі Зінаіда Іванаўна засынала, яны з Пашам залазілі ў кабінет і глядзелі серыялы праз яе плячо. Тэлевізар быў стары, маленькі. Зінаіда Іванаўна гучна храпла, а падысці бліжэй яны баяліся. Усё, чаго не было чутно і бачна, яны дадумвалі ў сваіх гульнях удзень. Пакуль Пашу не забралі ў сям'ю.

— Усё нармальна.

— Хэй, я таксама часам баяўся вяртацца дадому, калі быў у тваім узросце. Але я тады нават не ўяўляў, наколькі небяспечна можа быць ноччу на вуліцы.

— Яны мяне не кранаюць, — неахвотна адказаў хлопчык.

— Пра каго гаворка? — насцярожыўся чалавек у чорнай байцы.

Стась зноў змаўчаў. Будзе здзекавацца ды называць дурнем, а то і ўвогуле надае кухталёў, як старэйшыя суседзі.

— Чаму ты не хочаш ісці дадому? Хто цябе палохае? — шэптам спытаў Міхась.

Хлопчык не хацеў адказваць. Але раптам яны дапамогуць? Раптам яны яго апошні шанс? Сіняком больш, сіняком менш — не страшна.

— Яно вялікае, калматае ды чорнае. Сядае мне на грудзі і не дае дыхаць.

Міхась зірнуў на сябра.

— Валасень?

Той моўчкі кіўнуў, нахіліўся да малога. Стась зазірнуў яму ў вочы: у іх не было злосці, не было пагрозы, у іх была туга. Усевалад апрануў хлопчыку на шыю амулет — драўляную шасціпялёсткавую кветку ў коле.

— Не здымай, нікому не давай, не дазваляй нават дакранацца. Зразумеў?

Малы паківаў, сціснуў амулет у руцэ. Сумненняў, што ён будзе працаваць, нават не ўзнікла.

— Колькі табе гадоў, Стась? — пацікавіўся Міхась.

— Дзесяць.

— Ого! Вал, ён не павінен…

Чалавек у чорнай байцы, які збіраўся сыходзіць, зноў нахіліўся да малога, тарганув амулет.

— Калі ўбачыш каго-небудзь з такім вось знакам на вопратцы — бяжы не азіраючыся, як мага далей.

— Вал…

— Яму пашанцавала, што яго не знайшлі, Міхась. Хадзем.

Ён усё яшчэ бачыў цені, але цяпер яны яго не краналі. Затое Стась штоночы мроіў чалавека ў чорнай байцы. Ён так хацеў бы ўбачыць яго яшчэ раз і спытаць. Пра многае.

Глыбіня

Вада. Сонца. Вада.

Лёгкі ветрык па паверхні, з берага цягне смажаным мясам. Зараз ён толькі даплыве. Хлопцы ўжо разліваюць па шклянках пеністае. Зараз.

Выдых. Удых. Выдых. Хвалі штурхаюць, не даюць наблізіцца да берага. Трэба крыху напружыцца. Ігар з дзяцінства добра плавае, старэйшы брат навучыў. Кінуў у ваду: жыць захочаш — выплывеш. Захацеў.

І цяпер хоча, толькі нешта цягне на глыбіню, хапае за лыткі. Не, побач нікога. Дзяўчаты ля берага, ходзяць у вадзе, падабраўшы спадніцы, нават не глядзяць у яго бок.

Вада. Сонца. Вада.

Пырскі ў твар. Закрычаць — не пачуюць. Закрычаць — няма моцы. Ён ціха сыходзіць пад ваду. Выплывае, хапае паветра з прысмакам шашлыкоў і піва. Няўжо ніхто не бачыць? Ды паглядзіце вы! Яго рэзка цягне ўніз, накрывае хвалямі. І панікай.

Вада. Вада. Вада.

* * *

Міхась схіліўся над мапай Мінска, у якую былі панатыканыя рознакаляровыя кнопкі. Пад кожнай — паперчына, на якой таропкім почыркам напісаная назва нячысціка. Ён акуратна цягнуў чырвоную нітку ад адной

кнопкі да іншай у тым парадку, у якім адбываліся нападзенні. Вакол былі раскіданыя кнігі: ад навуковых даследаванняў беларускай міфалогіі да замежнага фэнтэзі.

Усевалад вярнуўся з прабежкі, грукнуў дзвярыма ў ванную, уключыў ваду. Нават не павітаўся — значыць, нешта адбылося. Запытвацца бессэнсоўна, сам распавядзе, калі захоча. Выйшаў з душа, забразгаў посудам на кухні.

— У шафцы піражкі з грыбамі — Ядвіга прынесла, — максімальна звычайным тонам паведаміў Міхась, не адрываючыся ад мапы.

Усевалад прыйшоў у гасцёўню з кубкам гарбаты. Змрочны, бровы зведзеныя. Стомлена апусціўся ў фатэль побач з канапай.

— На Камсамольскім сёння патануў хлопец. Нельга купацца пасля Перунова дня, — цяжка ўздыхнуў. — Вадзянікі люцеюць.

Міхась крыху памаўчаў, потым рашуча пастукаў па сваёй мапе. Нуль рэакцыі. Пстрыкнуў пальцамі перад тварам Усевалада. Той коратка зірнуў на мапу, паматляў галавой.

— Ты марнуеш час.

— Я спрабую зразумець. Няўжо Вадзянік у Камсе, Лясун у цэнтры горада альбо Апівень, які прадае спайсы, гэта норма? Вал, яны сцякаюцца сюды! Нешта іх цягне.

— Чаго ты ад мяне хочаш? Каб я сказаў, што ты маеш рацыю?

— Вал, нехта альбо нешта за гэтым стаіць. Трэба выклікаць Ваяроў, каб яны разабраліся.

— Я сам разбяруся.

Не самы лепшы момант высвятляць адносіны, але яму надакучыла, што яго не слухаюць.

— Каму ты што хочаш давесці? Мне? Я і так ведаю, што ты круты. Ім? Ім пляваць. Калі цябе за столь-

кі гадоў ніхто нават не паспрабаваў за вушы прыцягнуць назад... Каму? Святаславу? Яму тым больш пофіг. Ён...

Усевалад наблізіўся хутчэй, чым Міхась міргнуў. Рука сціснулася на горле.

— Яшчэ хоць слова, — яго вочы свяціліся блакітнымі іскрынкамі.

Міхась прымірэнча ўзняў рукі. Усевалад яго адпусціў.

— Ты забываешся, Міхал.

— А ты — эгаістычны дурань, які ставіць уласную крыўду вышэй за праблемы цэлага горада.

— Ты звернешся да маці па дапамогу?!

— Гэта іншае, Вал!

— Тое ж самае. Калі я эгаістычны дурань, дык ты самаўпэўнены разумнік, які лічыць, што ведае лепш за іншых.

Гэта пачынала нагадваць дзіцячую сварку, але хоць якая магчымасць выказаць яму сваё меркаванне.

— А ты — няўдзячны вырадак!

Усевалад узняў на Міхася шчырыя зялёныя вочы, у якіх не было і намёку на хвілінны прыступ раз'юшанасці, збянтэжана ўсміхнуўся.

— Я — удзячны вырадак.

— Тады прыслухайся да мяне!

— Якое гэта мае дачыненне да ўдзячнасці? Міхась, я абяцаю, калі ўпэўнюся, што ўсё настолькі дрэнна, каб выклікаць Ваяроў, я адразу гэта зраблю. Абяцаю.

* * *

Вада. Сонца. Вада.

Лёгкі ветрык па паверхні. На лаве ля берага сядзелі дзяўчынка і мужчына. Задуменна назіралі за хвалямі.

— Мяне палохае тое, што ты плануеш, — сур'ёзна паведаміла малая.



Мужчына стрымана ўсміхнуўся.

— У мяне ўсё пад кантролем.

— А калі ты яго згубіш?

— Буду імправізаваць. Але я ўпэўнены, што яны прыйдуць у тую кропку, у якую мне трэба. І сённяшняя смерць іх да гэтага падштурхне.

Ён ласкава прытуліў да сябе дзяўчынку, не адрываючы вачэй ад вады.

Прымаць

Пяць гадоў таму

«Я б раіў вам, Міраслава, шукаць іншага Майстра». Так ён сказаў ёй на днях. Пад вачыма ў яго леглі цені, твар памарнеў, плечы апусціліся. Ён хаваў вочы ад паплечнікаў, бо ў іх стаяў адчай.

Усевалад сышоў амаль месяц таму. Першыя дні Святаслаў чакаў, што вучань вось-вось вернецца. Пазлуецца, папсіхуе — і вернецца. Потым стаў шукаць, сам, але беспаспяхова. Папрасіў дапамогі. Перавярнулі ўвесь Унутраны Свет. Балазе, не такі вялікі. Безвынікова.

— А ён мог патрапіць у Вонкавы Свет? — спытала тады Міраслава. — Хіба вучні ўмеюць адчыняць праход?

— Я яго гэтаму не вучыў. Велізар мог. Яму трэба было зразумець, наколькі малы сапраўды моцны. І адкрыццё праходу — выдатны для гэтага спосаб, — змрочна адказаў Святаслаў.

І параіў шукаць іншага Майстра. Больш яны не размаўлялі. Яна не збіралася шукаць іншага, бо не мела ў ім патрэбы. Міра была гатовая адмовіцца ад ступені майстэрства і быць звычайнай Ваяркай, усё жыццё працаваць у Камандзе ў Вонкавым Свеце, не мець ніякіх пасад і вучняў. Разумела, што гэта глуп-

ства, што будзе шкадаваць усё жыццё. Разумела, што трэба даць сабе час.

Цяпер часу хапала і праводзіць яго дома было немагчыма. Яна знаходзіла самыя бязглуздыя нагоды і дурныя заняткі, абы кантактаваць з ім як мага менш, абы не бачыць яго ў такім стане. Зранку трэніравалася з Багданам, увечары хадзіла да Златкі на вогнішча. А ўдзень... Збольшага — бадзялася.

Сёння ногі самі панеслі яе да Мяжы. Ланцуг магутных старых дубоў, і на кожным Сімвал шляху. У Вонкавым Свеце такія дубы былі раскіданыя па розных лясах. Толькі самыя вопытныя Майстры маглі з першага разу апынуцца там, дзе трэба.

Міраслава паклала далонь на Сімвал, заплюшчыла вочы. Энергія плаўна перацякала з усяго цела да далоні, з далоні да дрэва. Сімвал ледзь паярчэў ды згас. Яна задуменна вадзіла пальцамі па змяіных абрысах Сімвала. Раптам той засвяціўся пад яе рукамі. Міра адхінулася. Няўжо? У яе атрымалася? Добра, і што далей? Уявіць месца, у якое хоча патрапіць? Яна ж і не была ніколі ў Вонкавым Свеце...

Раней, чым яна паспела прыдумаць, што мусіць рабіць, з дрэва, нібы там і не было ніякага дрэва, выйшаў Усевалад.

— Ты?!

— Халера! Я ведаў, што Унутраны Свет маленькі, але каб настолькі... Значыць, так, у мяне тэрміновае паведамленне для Кіраўніка, таму абірай: альбо ты ідзеш са мной, моўчкі, альбо ты застаешся прывязанай да гэтага дуба і можаш рваць горла, колькі хочаш, — у яго між далоняў з'явіўся ланцуг Сімвалаў.

Ён ішоў так хутка і такімі заблытанымі шляхамі, што Міра ледзь за ім паспявала. Адчыняць праходы яго навучыў Велізар, і гэтыя таемныя сцежкі, відаць, таксама паказаў ён. Якія яшчэ веды яму перадаў былы настаўнік?

Яны выйшлі з тыльнага боку Рады Майстроў. За густым кустоўем хаваўся дадатковы ўваход. Юнак штурхнуў дзверы, але яны не паддаліся. Ён злосна пляснуў па іх далонню, пад якой выбухнуў чырвоным Сімвал адмыкання. У доўгім змрачнаватым калідоры ні разу не спыніўся і не запаволіўся, каб удакладніць шлях. Так жа пляснуў па чарговых, нічым не адметных дзвярах і заляцеў у шырокі светлы кабінет. Ля акна, заклаўшы рукі за спіну, стаяў Кіраўнік.

— Прывітанне, Усевалад. Дзень добры, Міраслава, — не паварочваючыся вымавіў ён.

— Кіраўнік, я прашу выслухаць мяне, не выклікаючы Майстра Святаслава. Хвіліна вашага часу — і я сыду.

— Я буду вырашаць, сыдзеш ты ці не. Слухаю.

— У Вонкавым Свеце з'явілася Вядзьмарка.

— Ты яе бачыў?

— Не, але яна спрабуе здабыць сабе Вучня. Хлопец майго ўзросту. Начныя жахі, галасы. Нядаўна пачаў бачыць Пачвар. Невядома, ці ёсць пагроза для людзей, але ў лесе падазрона шмат нячысцікаў. Неабходна накіраваць у гэтую кропку дадатковую Каманду, Кіраўнік.

— Так, Усевалад, я Кіраўнік, і я буду вырашаць, хто куды сыдзе і каго куды накіроўваць, — ён узняў голас. — Святаслаў, забірай свайго нягодніка!

Ён з'явіўся ў дзвярным праёме, скрыжаваўшы рукі, сутулячыся. Усевалад зірнуў праз плячо, пляснуў далонямі па стальніцы. З-пад іх разляцеліся блакітныя іскрынкі.

— Я ж прасіў!

— Я яго выклікаў да таго, як ты ўвайшоў у гэты кабінет, — спакойна адрэзаў Кіраўнік, але Міра зноў бачыла драпежніка за сталлю яго вачэй. — Да таго ж адну просьбу я выканаў — выслухаў цябе. Будзь удзячны і супакой сваю істэрыку, бо я перадумаю выра-

шаць гэтую справу ціха і ўчыню публічнае пакаранне. І табе, і твайму настаўніку. Дарэчы, Святаслаў, я цябе папярэджваў, што гэтым скончыцца?

Мужчына перасмыкнуў плячыма і выйшаў на сярэдзіну кабінета.

— Я прашу прабачэння, Кіраўнік.

— Адказвай на пытанні. Я папярэджваў?

— Так, Кіраўнік.

— Я казаў, што яго Энергію ўвесь час трэба трымаць пад кантролем? Я папярэджваў, што ты яго разбэсціш? Я прасіў сур'ёзна падыходзіць да яго выхавання? Я прасіў навучыць яго дысцыпліне? Альбо табе самому яе бракуе?

Тон Кіраўніка рабіўся ўсё больш жорсткім, а Святава «так, Кіраўнік» — усё больш ціхім ды вінаватым. Міраславе стала зусім няёмка, вушы і шчокі гарэлі. Так хацелася сарвацца, улезці, заступіцца за яго, а Усевалад нават знаходзіў гэта забаўным.

— Я магу разлічваць на тое, што ты саб'еш з хлопчыка пыху, калі застанешся настаўнікам?

— Ён не будзе маім настаўнікам! — улез Усевалад. — Ён забіў Майстра Велізара! А вы ведалі гэта! Ведалі і ўсё адно аддалі мяне яму!

Кіраўнік злосна грукнуў па стальніцы кулаком, вымушаючы ўсіх глядзець на яго.

— Слухай мяне, Святаслаў. Твой вучань пераходзіць да Людавіта, які будзе выхоўваць яго так, як лічыць патрэбным. Пакуль на месяц, потым паглядзім. А каб ты не хапаў Людавіта за рукі, выправішся ў Вонкавы Свет і разбярэшся, што там за Вядзьмарка і наколькі яна небяспечная. Што тычыцца вас, Міраслава, вы можаце абіраць: альбо быць Падмайстаркай у Людавіта, альбо прапусціць гэты месяц, можа, больш, калі я так вырашу, і адцягнуць свой пераход да наступнай ступені навучання. Усё зразумела?

— Кіраўнік, я вельмі вас прашу! Я буду настолькі суровым, наколькі неабходна, і выпраўлю ўсе хібы ў выхаванні, абяцаю, — Святаслаў умольна глядзеў на мужчыну. — Не аддавайце яго Людавіту, калі ласка. Я... Я ўсё яму патлумачу.

— Патлумачыш. Але майго рашэння гэта не зменіць: вам трэба пабыць на адлегласці. А ты, Усевалад, яго выслухаеш, бо ён гэтага заслугоўвае. І не спрабуй уцячы — каля Мяжы цяпер варта. Спецыяльна для цябе.

Усевалад дэманстратыўна закаціў вочы і фыркнуў. Кіраўнік гэта праігнараваў, зноў звярнуўся да настаўніка.

— А яшчэ ты яго пакараеш за апошні выбрык, бо на той момант ты быў за яго адказны. Праз месяц мы сустрэнемся на гэтым жа месцы, і я вырашу, ці гатовы ты быць настаўнікам, Святаслаў. І ці заслугоўваеш ты такога настаўніка, Усевалад. Цяпер усё, вольныя.

* * *

Людавіт сядзеў на ганку, адразаў ад яблыка кавалачкі і задуменна адпраўляў у рот.

— Глядзіце, хто знайшоўся! Я думаў, ты мне раней прыйдзеш твар біць, Свят. Бачыш, нават пагаліўся, ды ўжо зноў шчэць адрасла.

— Я хачу папрасіць прабачэння, Людавіт, — ціха пачаў мужчына. — Ты не павінен быў пацярпець праз тое, што я хаваў праўду ад свайго Вучня.

— Ну, цяпер ён мой вучань, і цярпець давядзецца яму, — крыва ўсміхнуўся мужчына.

— На месяц.

— Мне месяца хопіць, каб навучыць падпарадкоўвацца. Кіраўнік сказаў штосьці пра апошняе — і першае, відавочна — пакаранне ад цябе. Патрэбна мая

дапамога? — Людавіт дэманстратыўна пачаў размінаць рукі.

— Дзякуй. У цябе свае метады, у мяне свае, — Святаслаў сустрэўся з Вучнем позіркам. — Усевалад, ты абразіў Майстра Людавіта падчас бойкі і цяпер мусіш пачысціць, натачыць, прывесці ў належны стан любое ўзбраенне, якое абярэ Майстар Людавіт. Хоць усё. Пакаранне скончыцца, калі ты скажаш, што гатовы мяне выслухаць.

— Ды я гатовы!

— Не, свавольнік, я пачую, калі гэта будзе шчыра, — ён мякка падштурхнуў юнака да ганка. — Адмовішся — я проста сыду. Назаўсёды.

Усевалад рашуча скінуў куртку і закасаў рукавы кашулі, смела зірнуў на Людавіта. Святаслаў апусціўся на траву перад хатай, прапанаваў Міраславе сесці побач.

— Мы будзем чакаць тут? — удакладніла яна.

— Надоўга яго не хопіць. Ён стомлены, узбуджаны навінамі пра Вядзьмарку, на эмоцыях. А гэта яго давядзе. Надта ганебна.

— Што ганебнага ў тым, каб чысціць зброю? — разгублена пацікавілася Міра.

— Што ганебнага ў тым, каб чысціць зброю ворага?

Зусім сцямнела. Людавіт некалькі разоў выходзіў на ганак з выразам твару «ў мяне хутка зброя скончыцца», а Усевалад усё не здаваўся.

— Вось жа ўпартае дзіця, — нарэшце ўзняўся Святаслаў.

Усевалад сядзеў на падлозе і вастрыў кідальныя нажы, якімі Людавіт відавочна вельмі даўно не карыстаўся. Пазяхаў, прымушаў сябе не сутуліцца, не спыняцца надоўга, не заплюшчваць вочы. Рукі чырвоныя, на пальцах мазалі. Святаслаў сеў побач на кукішкі і ўзяўся дапамагаць.

— Цікавыя ў цябе метады, — лянотна прамармытаў Людавіт, які сядзеў у куце ля печы і сачыў за юнаком. — Пайду зірну, як там Ян...

Святаслаў кінуў кароткі позірк на Усевалада. Ён выглядаў зусім згубленым. Усміхаўся, тут жа закусваў вусны, ссоўваў бровы, хаваў вочы, цёрся шчакой аб плячо.

— Прабач, я павінен быў распавесці адразу, — ціха пачаў Святаслаў.

— Дык чаму не распавёў?

— Баяўся, што не зразумееш, не прабачыш. Чакаў, пакуль ты яшчэ крыху пасталееш. І не чакаў нажа ў спіну, — ён пакасіў вокам туды, дзе нядаўна сядзеў Людавіт.

— Я гатовы выслухаць.

— Пасля таго, як папросіш прабачэння ў Майстра Людавіта.

— Гэта ў дамову не ўваходзіла, — мармытнуў Усевалад.

— А павінна было? — холадна і сурова пацікавіўся Святаслаў.

* * *

Яны разам сядзелі на ганку, апусціўшы босыя ногі ў вільготную халодную траву. Людавіт надзіва тактоўна прыняў выбачэнне Усевалада і сышоў у свой пакой. Міраслава таксама раптам заспяшалася дадому пасля таго, як Святаслаў тонка намякнуў, што хацеў бы паразмаўляць з Вучнем сам на сам.

Усевалад задуменна разглядаў свае новыя мазалі на далонях. Свят напружана шукаў, з чаго пачаць размову.

— Ты памятаеш што-небудзь пра Велізара?

— Ён быў жорсткі, і я ненавідзеў яго. Але ж гэта не нагода забіваць!

— Вядома ж, не нагода, Вал… Велізар быў выдатным Ваяром. Напэўна, найлепшым, але на гэтым яго станоўчыя якасці заканчваліся. Яму заўсёды было мала. Ён лічыў сябе куды больш вартым пасады Кіраўніка. Займаў месца ў Радзе, але яму ўсё адно здавалася, што яго недастаткова шануюць і паважаюць іншыя Ваяры. А я… Я наогул быў ягоным найвялікшым расчараваннем. Недастаткова смелы, моцны, упарты, паслухмяны, працавіты і што заўгодна яшчэ. Я ніколі не адпавядаў яго патрабаванням, але ім проста немагчыма было адпавядаць… Людавіт панабіраўся гэтага ад яго, калі быў ягоным Падмайстрам. Праз гэта ж у вас пачаўся канфлікт, ці не так? Ты зноў на выпрабаваннях управіўся лепш за Яна?

Усевалад кіўнуў, сутаргава сціснуў кулакі.

— Ён крычаў, што для мяне заніжаюць патрабаванні і завышаюць адзнакі, што я не настолькі асаблівы, наколькі гэта выстаўляе мой настаўнік. Я адказаў, што некаторыя настаўнікі выхоўваюць вучняў замест таго, каб катаваць іх. І тады ён раз'юшыўся. Сказаў, што я нічога не ведаю пра свайго настаўніка. Сказаў, што… Ты звычайны забойца, якога чамусьці абараняе Кіраўнік. І што Велізар быў вырадкам, але нават ён не заслугоўваў балта ў спіну, — Вал пацёрся шчакой аб плячо. — Тады я агаліў меч.

— Люд дзіўны чалавек. У яго своеасаблівае ўяўленне пра справядлівасць… Але вернемся да Велізара. Я ўжо атрымаў ступень майстэрства і ўвайшоў у асноўны склад Каманды Вітольда, калі мы наткнуліся на Вядзьмарку з вельмі амбітнымі планамі. Яна знайшла недзе рытуал, які дазваляе забіраць Энергію ў жывых істот. Адразу шмат, за раз і пад нуль. Яна вырашыла «праглынуць» усіх нячысцікаў свайго лесу. Мы ўчас сцямілі, паведамілі Кіраўніку. Ён даслаў нам на дапамогу лепшых Ваяроў: Васілісу, яе першую вучаніцу

Дану, Людавіта і, ясная справа, Велізара. Ды яшчэ і сам пацягнуўся з вучнем. Тады гэта была звычайная практыка — браць вучняў у Вонкавы Свет. Правілы змяніліся адразу пасля таго выпадку. Дана, як і вучань Кіраўніка, Юры, абодва загінулі. З Каманды Вітольда ацалелі толькі ён і я... Вядзьмарку мы спынілі, рукапіс з рытуалам узяўся знішчыць Велізар. Насамрэч ён захаваў яго для сябе, — Святаслаў на імгненне перарваўся, гледзячы ў нябёсы, сумна выдыхнуў. — Вітольд набраў новую Каманду, я стаў ягонай «правай рукой». Браў самыя рызыкоўныя заданні і лез у самыя небяспечныя сутычкі. Я планаваў памерці да сарака. Кожны Майстар мусіць выхаваць хаця б аднаго вучня. Першага ён можа ўзяць не раней, чым адпрацуе ў Камандзе пяць гадоў, не ўлічваючы два гады практыкі, але не пазней, чым у сорак. Я не збіраўся рабіцца настаўнікам. Я ні імгнення не хацеў быць на месцы Велізара.

— Ты зусім іншы, — ціха прамармытаў Усевалад.

— Так, я цябе разбэсціў, — хмыкнуў Святаслаў. — Велізар шукаў цябе мэтанакіравана. Я потым бачыў яго запісы: ён меў цэлы спіс «адораных» і ніяк не мог абраць самага моцнага. Пакуль не знайшоў цябе... Табе было шэсць — рана, каб забіраць. Але ён баяўся, што цябе забярэ нехта іншы, таму хутка прыцягнуў сюды. Давялося чакаць, пакуль дар раскрыецца напоўніцу... На шчасце... Я працаваў чацвёрты год. Мы з Камандай вярнуліся, каб крыху адпачыць пасля няпростага задання. Тады да мяне прыйшоў Люд, распавёў пра цябе, пра планы Велізара. Не ведаю, чаму той увогуле вырашыў імі падзяліцца хоць з кім-небудзь. Напэўна, выхваляўся. Яны з Людавітам заўсёды былі на адной хвалі. Відаць, Велізар думаў, што былы Падмайстар і тут яго падтрымае, але Люд за любы гвалт, за любыя здзекі — пакуль яны не прыводзяць

да смерці. Ён любіць прыніжаць ды падпарадкоўваць, але ён ніколі не забярэ чалавечае жыццё.

— Я не разумею... Прабач, што перабіваю. Я проста не разумею. Велізар хацеў ажыццявіць са мной вядзьмарскі рытуал?

— Менавіта. Ён хацеў забраць твае здольнасці. Тады б ужо ні ў кога не ўзнікала пытання, хто павінен быць Кіраўніком... Ваяру гэта прасцей зрабіць, чым Вядзьмарцы. Вядзьмарцы трэба спярша стаць «пустой» — аддаць сваю Энергію спадчыннику, потым напоўніцца новай, а разам з тым і вярнуць ад спадчынніка сваю. Ваяру трэба проста добра патраціцца на які-небудзь складаны Арнамент, каб стаць «пустым» амаль пад нуль. Я не мог яму дазволіць. Па-першае, гэта б цябе забіла. Па-другое, такая моц канчаткова знесла б яму дах. А ён і без таго адэкватнасцю не вылучаўся. Люд, напэўна, думаў: я пайду да Кіраўніка. Думаў: Кіраўнік мяне паслухае, бо ён заўсёды ставіўся да мяне неяк па-асабліваму. Але я разумеў: доказаў у нас няма, калі раптам што — Велізар іх паспее знішчыць, ды і Рада не будзе разважаць, на чый бок стаць. Перамагчы Велізара ў двубоі ў мяне таксама не было ніводнага шансу. Давялося па-здрадніцку стрэліць у спіну з арбалета. Я не магу дараваць сабе гэта, але...

Хлопчык раптам прыціснуўся да пляча настаўніка і нястрымана заплакаў.

— Цішэй, Вал, цішэй... Я адразу пайшоў да Кіраўніка і ўсё распавёў. У кабінеце Велізара мы знайшлі дастаткова доказаў таго, што ён планаваў зрабіць. Кіраўнік сцёр табе памяць пра той дзень — тым жа рытуалам, якім сціраюць памяць пра мінулае жыццё дзецям, якія робяцца Ваярамі. Ён абяцаў замяць гэтую справу, але з адной умовай: я вазьму цябе ў Вучні.

Усевалад рашуча ўзняўся, выцер вочы. Святаслаў узняўся следам, яны сустрэліся позіркамі.

— Свят, даруй мне, калі ласка, — выдыхнуў юнак, стрымліваючы дрыжанне ў голасе. — І... Я прашу прабачэння, Настаўнік.

Мужчына сціснуў хлопца ў абдымках, ласкава ўскудлаціў валасы.

— Чаму нельга было выслухаць мяне адразу, Вал?

— Таму што тады я б не даведаўся пра Вядзьмарку, — шмыгнуў носам Усевалад.

* * *

Ян, ураўнаважаны светлавалосы хлопец, крыху маладзейшы за Усевалада, старанна адпрацоўваў удары мячом на саламяным пудзіле. Усевалад страляў з арбалета па навешаных на дрэва льняных пакуначках з зёлкамі. Дробных, цёмных, амаль незаўважных на фоне лістоты. Ён выглядаў стомленым, нават выматаным. Левае запясце было шчыльна забінтаванае. Тым не менш ён беспамылкова збіваў пакуначкі адзін за адным. Міраслава ціха назірала за трэніроўкай праз плот.

— Яшчэ два крокі назад, Усевалад.

— Надта далёка.

— Выконвай загад.

— Ды з такой адлегласці нават вы не пацэліце!

Людавіт імгненна наблізіўся да юнака, схапіў за каўнер.

— Ты прызвычаіўся, што ў цябе ўсё атрымліваецца з першага разу. Вось табе выклік. Збярыся і паднапружся — пацэліш яшчэ і не з такой адлегласці.

Усевалад сціснуў сківіцы, пацёрся шчакой аб плячо, кіўнуў. Перахапіў арбалет пазручней, зрабіў два крокі назад. А Людавіт заўважыў Міраславу і скіраваўся да яе, павольна, неахвотна.

— Я пакуль не магу прыняць такое рашэнне. Трэба было згаджацца адразу.

— Вы пра што?

— Вы ж прыйшлі прасіцца да мяне ў Падмайстаркі, ці не так? Мне трэба падумаць…

— Не! Мне не патрэбны іншы Майстар, акрамя Святаслава.

— Дачакайцеся яго вяртання, каб так казаць, — Людавіт іранічна скрывіў вусны.

Міра разглядала яго худы твар з рэзкімі тонкімі рысамі ды вузкімі, поўнымі пагарды, цёмнымі вачыма. І так хацелася ў гэты твар даць, але Усевалад і так не ў самых лепшых умовах, не варта псаваць яму жыццё яшчэ больш.

— За што вы яго так ненавідзіце?

— Я яго не ненавіджу. Мяне абураюць яго паводзіны і стаўленне Кіраўніка. Святаславу можна ўсё: стрэліць у спіну аднаму з самых моцных Ваяроў, быць у складзе Рады Майстроў, не маючы на гэта права. Яму даруюць сур'ёзныя хібы і памылкі ў выхаванні вучня. Пасля чарговай правіны замест таго, каб паказаць усім, што бывае з парушальнікамі правіл, яму даюць важнае заданне ў Вонкавым Свеце, — Людавіт нервова загінаў ударлявыя крывыя пальцы. — Мяне абурае несправядлівасць, Падмайстарка Міраслава. Законы для ўсіх роўныя.

— Законы створаныя, каб іх парушаць.

— Словы чалавека, не здольнага адказваць за свае ўчынкі. Законы створаныя, каб іх прытрымлівацца. Святаслаў разбэшчаны сам, разбэсціў вучня, дык цяпер і вы гэтай бздуры нахапаліся.

— Хопіць! — побач з імі з'явіўся Усевалад. — Вы проста нахабны зайздрослівы тыран! Не вам яго судзіць і не вам судзіць, наколькі добра ён мяне выхоўвае.

Мужчына схапіў юнака за плячо, прыцягнуў да сябе.

— Ды па табе ўсё відаць! Ніякай дысцыпліны і самакантролю. Ніякай павагі да старэйшых. Яшчэ раз

сабе такое дазволіш — такога чосу дам, на ўсё жыццё запомніш. Ты зразумеў мяне? Не чую! Зразумеў?

— Зразумеў. Прашу прабачэння, Майстар Людавіт.

— Вяртайся да трэніроўкі, — мужчына павярнуўся да Міраславы. — Вам варта сысці.

— Калі вы ўзнімеце на яго руку — Святаслаў вам гэтую руку адкусіць...

— Святаслаў мне яшчэ «дзякуй» скажа. Часам «нахабныя зайздрослівыя тыраны» куды лепш даюць рады выхаванню, чым адораныя самаахвярныя дурні. Ваяр, які не ўмее падпарадкоўвацца, — мёртвы Ваяр. Спытайце ў Майстаркі Васілісы пра яе першую вучаніцу, калі я для вас проста «тыран»... Бывайце, Міраслава. І не прыходзьце больш. Толькі правакуеце хлопца на канфлікты.

Вера

Настасся таропка крочыла ўздоўж яра, папракаючы сябе за затрымку. Надта загаварылася з айцом Мікалаем, не заўважыла, як сцямнела. Абняла далонню крыжык на грудзях. Ніхто яе не кране, бо яна сціплая дзяўчына, добра апранутая, увагу не прыцягвае, ідзе сабе ціхенька.

На дарогу перад ёй выйшаў жабрак. Брудны, худы, скура шэрая, у вачах нездаровы бляск. Настасся вохнула і пачала маліцца. Мужык зрабіў да яе крок, другі, спыніўся і працягнуў руку, каб дакрануцца. Між імі існавала нябачная сцяна. Настасся паспрабавала ісці і маліцца. Збілася, спынілася. Мужык цягнуўся за ёй, паказваючы надзіва вострыя, драпежныя зубы. Енчучы ды пагыркваючы, хадзіў вакол, нібы шалёны сабака.

Пакрысе яна збочвала да добра асветленай вуліцы, па якой хоць і рэдка, але праязджалі машыны. Адчувала, што голас сядае. Словы блыталіся, язык заплятаўся. Жабрака гэта весяліла, і ён шчэрыўся ўсё больш.

Непадалёк спынілася машына, апусцілася шкло.

— Хэй, спадарыня, у вас усё норм? — з акна высунуўся малады мажор з тых, што часта заляцаюцца да сціплых дзяўчат, каб паздзекавацца.

Ды ёй зараз было ўсё адно хто, абы дапамог. Папрасіць пра дапамогу яна не магла, бо жабрак толь-

кі і чакаў, каб яна спыніла малітву. Юнак выйшаў з машыны, следам выскачыў яшчэ адзін.

— Міхась, хутка назад!

У наступнае імгненне вакол жабрака, які ўжо скіраваўся да юнакоў, успыхнула чырвонае кола. Ён кідаўся ўнутры, не здольны пакінуць межы, ды раззлавана шыпеў.

— А, Навальнічні-і-ік! Давай, забі мяне! Знішчы. Спапялі. Вы ўсе захлыняцеся ў крыві. Ніякі Пярун не дапаможа.

Міхась акуратна ўзяў Настассю за плечы.

— Вы вельмі смелая дзяўчына, але вам лепш хутчэй дабрацца да дому і забыць пра гэта ўсё. Падвезці?

— Дзякуй. Мне блізка, — коратка адказала яна і пабегла прэч.

* * *

— Чаму ён не змог ёй нашкодзіць? — не адрываючыся ад дарогі, пацікавіўся Міхась.

— Вера, — коратка кінуў Вал, гледзячы ў акно.

— Хрысціянства ратуе ад Пачвар?

— Справа менавіта ў веры. Хоць ты ўвесь абвешайся крыжамі ды абразамі — без веры сэнсу нуль. Звычайныя бірулькі. А вось шчырая малітва, як бачыш, неблагі сродак абароны. Па сутнасці, гэта нешта накшталт замовы.

— Тады чаму Вупыр не знік? — нахіліў галаву Міхась.

— Таму што ў хрысціянскіх малітваў іншая мэта — выгнаць альбо не пусціць д'ябла. Знішчыць яго немагчыма, сам разумееш. Збочвай тут.

— Дарога амаль зарасла, Вал! Пашкадуй маю машыну. Што ты ўвогуле плануеш рабіць? Навошта мы едзем у лес з Вупыром у багажніку?

— Лепш бы спытаў да таго, як мы выехалі за межы Мінска, — хмыкнуў юнак. — Добра, тармазі, пройдземся пешшу.

Усевалад ускінуў непрытомнага нячысціка на плячо. Нават без дадатковага цяжару па цёмным яловым лесе з перарытай каранямі зямлёй ісці было няпроста, але Вал быццам шпацыраваў па праспекце. Міхась за ім ледзь паспяваў.

Нарэшце Усевалад прыхіліў Вупыра да старога дрэва. Чырвоная стужка Сімвалаў абвіла шырокі ствол, прывязваючы да яго нячысціка. Ваяр паклаў рукі на зямлю. Па далонях пабеглі блакітныя іскрынкі. Ён задаволена ўздыхнуў, выпрастаўся, дакрануўся да лба Вупыра, прымушаючы апрытомнець.

— Я чуў, што паводле законаў вы не бераце палонных і намагаецеся прынесці як мага менш болю тым, каго знішчаеце.

— Уражаны, што ты ведаеш законы, але на мяне яны не распаўсюджваюцца, — змрочна выплюнуў Усевалад.

Сімвалы бізуном леглі ў кулак.

— Вал! Не-не-не! Ты з глузду з'ехаў?!

— Не лезь пад руку, Міхась, — няўважліва кінулі яму. — Што значылі твае пагрозы?

— Няўжо гэта трэба тлумачыць, Навальнічнік? Блізіцца вайна.

— Вы і дня не пратрымаецеся…

Вупыр гідка засмяяўся. Бізун рассек яму скуру на плячы. Смех змяніўся шыпеннем.

— Што вы задумалі? У чым план?

Вупыр маўчаў. Усевалад ударыў зноў, і яшчэ раз. Міхась адчуваў, як пазногці прабіваюць скуру ў сціснутых кулаках. З кожным ударам дыханне перахоплівала ўсё больш, перад вачыма паплылі выявы, якія ён не жадаў успамінаць. А Усевалад і не думаў спыняцца.

— Я не ведаю, не ведаю! Я ўсяго толькі жаўнер!

— Хто вамі кіруе?

— Вам усё адно нас не спыніць. Можаш рабіць са мной, што хочаш, Навальнічнік. Гэты боль вернецца табе, памножаны ў сотню разоў. Мы вып'ем кроў з кожнага, каго ты любіш, у цябе на вачах.

— У попелу няма крыві, — горка адрэзаў Усевалад.

Арнаментаваная стужка зацягнулася на шыі Вупыра. Нячысцік шыпеў так, быццам вось-вось перастане дыхаць.

— Досыць, Усевалад! Калі ласка! — папрасіў Міхась.

Вал толькі патрос галавой, быццам ля вуха звінеў камар.

— Хто вамі кіруе? Хто плануе вайну?

— Ты будзеш здзіўлены, калі ён будзе перагрызаць табе горла.

— Я яго ведаю?

Нячысцік шыпеў ад болю, але вусцішная ўсмешка не спаўзала з твару. Міхась адвёў вочы. Замова забярэ ў яго шмат Энергіі, але іншага выйсця не было. Ён дастаў з кішэні кудмень, сціснуў у далоні, заплюшчыў вочы. Абы Усевалад не азірнуўся.

Пачаў мармытаць замову. Шчасце, што Вал не паставіў абарону — Міхась бы не прабіўся. Спіна спацела, кашуля прыліпла да скуры, дыханне збілася канчаткова, яго калаціла. Ён выплюнуў апошнія словы з адчуваннем, што разам з імі выплёўвае лёгкія. Па ігліцы вакол Вупыра распаўзалася полымя.

— Табе не перамагчы, Ваяр. Ты не бачыш таго, што адбываецца ў цябе за спінай.

І рассыпаўся ў попел. Усевалад павярнуўся да Міхася, усё яшчэ сціскаючы бізун з Сімвалаў. Міхась сціснуўся, хаваючы вочы. Ад сябра можна было чакаць чаго заўгодна, у тым ліку ўдару.

— Прабач, я не мог глядзець…

Усевалад прыбраў бізун, скіраваўся да дарогі.

— Не выбачайся, гэта мой касяк. Трэба было пакінуць цябе ў машыне.

Міхась фыркнуў. Ён не рэч, каб яго пакідаць.

— Вал, самы час выклікаць Ваяроў!

— Я знайду яго, — адрэзаў Усевалад.

— Каго «яго»? Гэта армія. Армія, якая збіраецца абвясціць вайну людзям!

— Ты пераглядзеў Marvel. Гэта ўсяго толькі купка дурнаватых Пачвар, якія чамусьці думаюць, што змогуць навесці ў горадзе свае парадкі. Я вынішчу іх па адным. Сам.

— Сам?

— Так. А ты збярэш шмоткі і з'едзеш да бацькі.

— Ну не!

Усевалад паглядзеў на яго, стомлена, цяжка, амаль адчайна.

— Мы не будзем працаваць разам, Міхась. Гэта было памылкай ад самага пачатку. Усё.

— Тады бывай.

Юнак сеў у машыну. Усевалад тарганўў ручку — дзверы не адчыніліся. Горка ўсміхнуўся, пагрукаў у шкло.

— Можа, хоць да горада падкінеш?

— Аўтаспынам даедзеш. Сам.

Аскепкі

Міхась нервова пабарабаніў па стырне, уключыў музыку. Што ўзбадзёрыць лепш за бацькаву падборку старога рока? Яго хіліла на сон, вочы заплюшчваліся, па целе разлівалася слабасць. Надта шмат Энергіі згубіў. А ці варта было?

Добра, ён сёння ж збярэ рэчы і з'едзе. Хай Усевалад робіць, што хоча. Хай хоць захлынецца ў крыві нячысцікаў. Не, гэта эмоцыі, трэба супакоіцца. Сёння пераначуе ў бацькі, а заўтра вернецца дадому, і яны ўсё вырашаць. Пацягнуўся зрабіць музыку гучней, але пальцы не слухаліся. Яго ахутвала нешта цёмнае і халоднае, нябачнае, пагрозлівае. Бракавала паветра.

Усевалад сто разоў прапаноўваў паставіць абарону на машыну, хоць бы які кудмень павесіць, але Міхась не слухаў. Трэба іншых ратаваць, а не пра сябе думаць. Ды і «пыжыка» яны рэдка бралі на паляванні — нячысцікі звычайна хаваліся там, дзе машына не праедзе.

Міхась пачаў шаптаць — на адну абарончую замову Энергіі мусіла хапіць, — але вусны таксама перасталі падпарадкоўвацца.

Не дарэмна апошнім часам яму было неспакойна. Яны чакалі, даўно былі побач. Адзіныя нябачныя нават Знахарам духі, паралікі. Чакалі, пакуль ён застанецца адзін, без аховы Ваяра. Альбо гэта Ваяр спусціў іх з павадка? Ці згубіў кантроль?

Думкі прыносілі фізічны боль. Машына неслася наперад. Цела амаль не слухалася. На імгненне заплюшчыў вочы. Прыгадаў, як з'ехаў да бацькі, выратаваў Агнію ад азярніц, пазнаёміўся з Вядзьмаркай, сустрэў Усевалада. Мільярд выпадковасцей, якія прывялі яго сюды.

Навошта ён Усеваладу? Прыкрываць? Ды не, ён адзін раз паспрабаваў — атрымаў па твары. Гатаваць зборы зёлак? Вал і без іх упраўляўся б. Замовы чытаць? Ён іх лепш за Міхася ведае. Дык навошта? Каб не было нудна?

Ён нічога не цэніць. Ні сяброўства, ні адданасць, ні жыццё. І нікога не любіць. Як там? «У попелу няма крыві»? Цяпер яму, напэўна, не нудна...

Набраў у грудзі паветра, столькі, колькі яшчэ мог, мацней ухапіўся за стырно і з крыкам выцінуў тормаз.

* * *

Хацеў падскочыць, але ў галаву нібы бетону налілі. Павольна выдыхнуў, агледзеў рукі. Левая ўся ў драпінах, парэзах ад аскепкаў, правая ў гіпсе. Не сон, гэта быў не сон. Мітуслівая медсястра, якая завіхалася ля нейкіх прыбораў, расплылася ва ўсмешцы.

— Міхал Віктаравіч! Як пачуваецеся?

Ён слаба кіўнуў.

— Да вас тут паломніцтва. Спачатку бацька, сястрычка і мачаха...

Гэта яна пра Ядвігу? Хай будзе мачаха.

— Бацька не мог сабе месца знайсці, мачаха ўсё малілася, а сястра паклала вам рукі на лоб і кажа: «Як ачуняеш — з цябе вядро жэлацінак».

Міхась усміхнуўся. Як жа дзіўна яго сям'я выглядае збоку.

24:00

— Потым прыходзіла маці. Ну і жанчына! Як крычала, божухна... Усю лякарню на вушы паставіла. Вы прабачце, што я так кажу. Патрабавала лепшую палату, лепшага лекара, лепшую медсястру, — яна развяла рукамі. — Неяк выбіла гэта ўсё ў загаддзялення, а да вас так і не зайшла.

Усё нармальна. Нічога дзіўнага.

— Як маці сышла, дык прыйшоў ваш... Сябар? — яна падазрона скасавурылася на яго. — Сядзеў тут, пакуль прыёмныя гадзіны не скончыліся.

Міхась толькі цяпер заўважыў, як падміргваюць яму з кутоў палаты абарончыя Арнаменты.

— А потым я выходжу а дванаццатай на вуліцу, а ён на лаўцы сядзіць. Сышоў толькі тады, калі я сказала, што міліцыю выклічу.

Міхась хмыкнуў. Хвалюецца ці адчувае віну?

* * *

Усевалад нясмела ўвайшоў у палату, сціскаючы ды расціскаючы кулакі. Касцяшкі збітыя, пад вачамі цені.

— Трэба было давезці мяне да горада, — прамармытаў ён.

Міхась прыўзняў бровы — ад такога простага руху ў галаве імгненна выбухнуў феерверк.

— То-бок я яшчэ і вінаваты?!

— Не, Міхась, вінаваты я, — Усевалад цяжка выдыхнуў. — Я павінен быў улічыць.

— Улічыць што? Што зашмат на сябе бярэш? Што не зможаш кантраляваць столькі пачвар?

— Да чаго ты вядзеш? — ён схмурнеў.

— Не рабі выгляд, што не разумееш, Вал! У горадзе стала шмат нячысцікаў праз цябе.

— Міхась, я тут ужо гадоў пяць.

— Спачатку ты вучыўся, потым працаваў, а потым табе надакучыла, ты знудзіўся. Тваёй Энергіі не было выхаду. Ты Ваяр, Вал, сам казаў.

— Я прыцягваю ў горад пачвар, каб не сумаваць? — хмыкнуў Усевалад. — Ты добра галавой выцяўся, братка.

— Ты адмаўляў, што ўсё звязана, і не хацеў звяртацца да Ваяроў. Чым яшчэ гэта патлумачыць?

— Навошта я тады Вупыра катаваў, Міхась? Каб ён маё імя назваў? Я цябе не слухаў, бо я самаўпэўнены няўдзячны выродак — вось табе і ўсё тлумачэнне.

Ён выйшаў, пляснуўшы дзвярамі.

Навальнічнікі

Чаму Усеваладу так тэрмінова спатрэбілася, каб ён забраў рэчы? Знайшоў новага суседа па кватэры? Альбо суседку? З'язджае? Сыходзіць ва Унутраны Свет? Не важна. Хай робіць, што хоча. Міхасю ўсё адно. Ключ у левай руцэ дрыжаў, не слухаўся, доўга не мог трапіць у замок.

У калідоры ля люстэрка — пяць пар скураных ботаў. На цвічках — курткі з «Перуновымі Зоркамі». Ды няўжо?

Усевалад выйшаў у калідор. Ускудлачаны, разгублены і знерваваны. Пад вачыма цені, яшчэ цямнейшыя, чым тыдзень таму ў лякарні. Рукі ў кішэнях.

— Дзякуй, што прыехаў, — прамармытаў ён. — Мне патрэбна твая дапамога.

— Мне здавалася, што табе патрэбна, каб я рэчы забраў.

— Я баяўся, што ты адмовіш, калі я адразу скажу.

Міхась пахістаў галавой.

— Мяне бацька ў машыне чакае. Давай хутка. Што трэба?

Усевалад запрасіў яго ў гасцёўню, дзе сядзелі трое мужчын, юнак і дзяўчына. Яны ўзнагародзілі Міхася кароткімі пільнымі позіркамі і адразу згубілі цікавасць. Толькі адзін — старэйшы і, відавочна, галоўны — наблізіўся. Цёмныя валасы, сівыя скроні, пацучыныя рысы твару, халодныя, калючыя вочы.

— Майстар Людавіт, — крыху нахіліў галаву.

— Міхал, Знахар, — ён са шчырай усмешкай працягнуў далонь.

Яе не паціснулі.

— На цябе працуе Знахар? — пагардліва перапытаў Людавіт.

— Мы працуем разам.

— Ён больш слабы, значыць, працуе на цябе.

Усевалад, на дзіва, не стаў працягваць спрэчку.

— Дазвольце Міхасю абмаляваць сітуацыю, — яшчэ крыху, і гэта гучала б як просьба.

Што гэта з Валам здарылася?

* * *

Ваяры ўтаропіліся ў зробленую Міхасём мапу. Ён прычапіў апошнюю паперчыну недалёка ад уезда ў Мінск. Паралікі.

— Гэта нападзенні Пачвар за апошніх месяцаў семвосем.

— Больш за паўгода! — Людавіт сурова зірнуў на Усевалада. — І ты толькі цяпер нам паведаміў?

Міхась шматзначна павёў бровамі.

— Усе гэтыя нападзенні звязаныя між сабой, — ён тарганyў чырвоную нітку. — Яны ўсе спланаваныя, скіраваныя кімсьці адным. Калі Вал... Гхм. Калі мы спыталі ў аднаго нячысціка, ён сказаў, што ў іх ёсць «бос» і мы будзем здзіўленыя, калі ўбачым яго.

— Спыталі ў нячысціка?

— Я катаваў Вупыра, — спакойна паведаміў Усевалад.

Мужчыны ўтаропіліся ў яго. Дзяўчына закрыла рот далонню.

— Законы Ваяроў забыліся? — жорстка спытаў Людавіт.

— Я даўно не Ваяр!

— А хто ты?!

Цішыня. Наэлектрызаваная, нібы ў пакоі вось-вось пачнуць біць маланкі.

— Гхм. Вупыр абяцаў вайну, — зноў уступіў Міхась. — Да гэтага яшчэ некалькі нячысцікаў кідаліся фразамі пра «рэкі крыві» і «смерць у пакутах». Пакуль не позна, неабходна знайсці таго, хто ўсім кіруе. Таго, хто сцягвае Пачвар у горад.

— Зразумела. Міраслава, Багдан — патрулявацъ вуліцы. Праз некалькі гадзін Ян і Ціхамір вас зменяць. Потым мы з Усеваладам. Звяртаць увагу на ўсё: канцэнтрацыю Энергіі, падазроных людзей, дзіўных жывёл.

Міраслава і Багдан моўчкі выправіліся выконваць загад.

— Гэта так не працуе, — Усевалад стомлена пацёр лоб. — Тут Войска Ваяроў патрэбнае, каб патруль меў вынікі. Мінск не вёска. Гэта як... Як удваіх патруляваць лес! Нават больш складана. У лесе няма людзей. Калі б яго можна было знайсці такім чынам, я б ужо знайшоў.

— У цябе ёсць іншыя прапановы? Не? Ясная справа. Можа, у твайго Знахара ёсць?

— «Ягонаму» Знахару час ехаць дадому, — ад напружання ў Міхася разбалелася галава.

* * *

Усевалад назіраў за тым, як Міхась сутаргава скідвае рэчы ў торбу. Неахайна, бо правая рука ўсё яшчэ загіпсаваная. Кашулі, канспекты, кеды, любімыя кнігі, ваўняныя шкарпэткі, расцягнутыя футболкі са смешнымі прынтамі.

— Ты не мог бы заўтра ненадоўга зайсці? — кусаючы вусны, спытаў Усевалад.

— Навошта?

— Ты думаеш не так, як мы. Мабыць, нешта прыйдзе табе ў галаву.

— Калі «нешта» прыйдзе — я патэлю, — ён закінуў сумку за плячо. — Бывай.

Усевалад выскачыў за ім на лесвічную пляцоўку.

— Міхась, пачакай! Я так і не сказаў. Прабач, што не слухаў цябе. Прабач, што праз мяне ты патрапіў у аварыю. Прабач, калі ласка, за ўсё.

Ён толькі кіўнуў.

— Мабыць... Мабыць ты хочаш вярнуцца?

— Не хачу. Мы больш не будзем працаваць разам, Усевалад, — знутры закіпала крыўда. — Гэта было памылкай ад самага пачатку.

— Беражы сябе.

Вырашаць

Пяць гадоў таму

Рабінавая Ноч набліжалася. Стаяла такая спёка, што на ганку можна было смажыць яечню. Дзень праз дзень Міхась цягаўся да бабулі. Бацьку хлусіў: казаў, што збіраў маліны, ездзіў на возера, гуляў па вёсцы. Бацька ці то верыў, ці то папускаў, але Міхась разумеў: аднойчы ён альбо патрапіцца на чымнебудзь, альбо ў яго скончацца варыянты. Таму падбіраў словы, як бацьку распавесці пра сваё рашэнне так, каб ён яго прыняў. Але ўсё адно патрапіўся раней, чым падабраў словы.

— Ты не п'еш зёлкі, — заўважыў Віктар, зазіраючы ў амаль поўны слоік.

— Мне перасталі мроіцца жахі, дык і не п'ю, — абыякава пацiснуў плячыма хлопец.

— Міхась, ты іх выпіў хіба разы тры. І ўсё, падзейнічала? Каму ты гэта распавядаеш?

— Тат, я не ведаю, як гэта працуе, — ён усё яшчэ спрабаваў пазбегнуць сваркі. — Мабыць, я больш устойлівы, чым ты.

— Альбо ты згадзіўся быць вучнем Вядзьмаркі.

— Што? Не!

— Міхась! Хопіць хлусіць, калі ласка, — бацька казаў сур'ёзна, нават жорстка.

— Дык і што, калі згадзіўся? Я хачу быць моцным! Хачу мець магчымасць абараняцца!

— Табе больш не трэба абараняцца, сын.

— Таму што ты побач?! — раззлаваўся Міхась. — А колькі яшчэ гэта працягнецца? Я не збіраюся вяртацца да яе, зразумела?

— Міхась, вы застаняцеся са мной, — цвёрда сказаў Віктар, хоць сам не быў так упэўнены ў сваіх словах.

Сын на імгненне разгубіўся. Пакруціў галавой.

— Я табе не веру. Ты ў любы момант можаш псіхануць і кінуць нас, як ужо зрабіў аднойчы. Альбо адправіць да яе. Я зрабіў свой выбар, як ты зрабіў свой сем гадоў таму. Вярнуся ўвечары, — і сышоў, ляпнуўшы дзвярамі.

Больш яны пра гэта не размаўлялі. Ды і ўвогуле амаль ні пра што не размаўлялі. Зранку віталіся, увечары жадалі адзін аднаму добрай ночы. Бацька чакаў, што Міхась адумаецца, але той не хацеў мяняць рашэнне. Агнію бацька з Міхасём не пускаў. Яна пакуль не наважвалася аспрэчыць бацькаў аўтарытэт, ды і сам Міхась лічыў, што дома ёй больш бяспечна. Ён нават дазволіў Юрасю бавіць з ёй час, каб яна не знудзілася.

Міхась рыхтаваўся да Рабінавай Ночы — ночы, калі ўсе нячысцікі збіраліся разам і развітваліся з летам. Менавіта на яе бабуля планавала перадаць яму здольнасці. Ён не разумеў, чаму менавіта тады. Яна тлумачыла гэта ўмовамі рытуалу, праўда, падрабязнасцей пакуль не распавядала. Казала: яшчэ рана, ён яшчэ не гатовы. Міхась паслухмяна праводзіў дні за старымі вядзьмарскімі кнігамі, засвойваючы тэорыю.

У той дзень ён вывучаў чароўныя расліны, калі ў хату ўварваўся дзіўнага выгляду стары. Ён быў нізенькі, скручаны, з доўгай сівой барадой. За сабой ён

на вяроўцы цягнуў чалавека. Міхась ціха вохнуў, бо пазнаў таго, каго прыцягнуў нячысцік, нават з мехам на галаве.

* * *

Усевалад напружана глядзеў на Міхася спадылба, пакуль нячысцік прывязваў яго да крэсла. Міхась адчуваў, як кроў прылівае да твару.

— Што менавіта ў загадзе трымацца падалей ад Вядзьмаркі табе было незразумела? — выціснуў Ваяр нарэшце.

— Ціха! — штурхануў яго нячысцік.

Міхась адвёў вочы.

— Вы — забойцы, Усевалад.

— Я гэтага і не хаваў! Я табе не хлусіў. А што табе распавяла Вядзьмарка?

— Я сказаў, змоўкні!

— Ды адчапіся ты ад мяне, Хапун! — рыкнуў Ваяр. — Я адсюль усё адно нікуды не дзенуся.

— Вы забіваеце, а мы будзем кантраляваць. Яна ажыццявіць рытуал, я буду дапамагаць.

— Гэты рытуал забярэ Энергію ва ўсіх нячысцікаў, якія будуць побач, ідыёт, і перадасць Вядзьмарцы. А ты будзеш працаваць транзітам. Яна скіне табе сваю Энергію, каб атрымаць новую, а потым забярэ назад. Гэта значыць, па-першае, яна будзе самай моцнай Вядзьмаркай на гэтых землях з часоў варажбіта Ліздзейкі*, а па-другое — ты памрэш. Віншую.

— З чаго ты вырашыў?

Усевалад грукнуў звязанымі рукамі па стальніцы.

* Ліздзейка — легендарны паганскі жрэц вялікага князя Гедыміна.

— Я гэта навыдумляў, прыдурак! Трэба ж мне нечым заняцца ў чаканні, пакуль Вядзьмарка дашле мяне перадаць прывітанне бацьку Перуну!

Юнак хацеў дадаць яшчэ нешта, але ў гэты момант у хату ўвайшоў Юрась.

— Здароў, Хапун. Прабач, што прымусілі чакаць. Былі неадкладныя справы. Панна хутка падыдзе... Ачмурэць, каго ты нам прывёў! Ты ж толькі дзяцей хапаеш.

Усевалад замёр, нізка апусціўшы галаву, закусіўшы вусны. Па шчоках пайшлі чырвоныя плямы.

— Хто я такі, каб не выканаць просьбу Панны? — задаволена буркнуў нячысцік. — Тым больш калі яна дае сродак, здольны схапіць Навальнічніка.

— Ой, ну крапівой ты яго сцябаў яўна не па просьбе Панны. Сцябаў жа?

Нячысцікі перазірнуліся ды агідна зарагаталі. Усевалад тарганууся, каб вырвацца з вяровак.

— Спакойна, Ваяр. Я ўпэўнены, ты і горшае трываў. Навальнічнікі вучняў не крапівой выхоўваюць, — Юрась паляпаў Усевалада па плячы.

— Табе адкуль ведаць?

— Я быў адным з вас.

— Ваяр не можа стаць нячысцікам!

— Можа-можа, — у дзвярах з'явілася Вядзьмарка. — Трэба ўсяго толькі ведаць патрэбную замову і валодаць дастатковай моцай.

Яна круціла між пальцаў тонкую спіцу. Усевалад некалькі імгненняў вывучаў Вядзьмарку, потым зноў вярнуўся да Юрася.

— Няўжо гэтаму немагчыма супраціўляцца?

— Не ведаю, не спрабаваў. Мой настаўнік кінуў мяне паміраць, ратуючы чужога вучня.

Вядзьмарка ўчапілася ў валасы Усевалада, тарганула галаву назад, прымушаючы прыадкрыць вусны. Заліла ў рот нейкае зелле, пракантралявала, каб праглынуў.

— Развяжыце яму рукі. Смялей, ён вам нічога не зробіць.

Юнак адразу ж паспрабаваў утварыць хоць які Сімвал, але з пальцаў зляцелі толькі бляклыя іскрынкі. Вядзьмарка схапіла яго левую руку, павярнула запясцем уверх. Татуіроўка чырванела і, відавочна, прыносіла Усеваладу боль.

— Як жа мне пашанцавала, што гэта ты... Міхась, падыдзі, паглядзі. Гэта чараўніцтва сувязі. Такое можа зрабіць толькі вядзьмарка, моцная, вопытная. Цікава, што з ёй стала пасля таго, як яна зрабіла твайму настаўніку паслугу? Не ведаеш? Упэўнена: ён забіў яе. А вы больш нічога не ўмееце — толькі забіваць. Вам усё адно каго, усё адно, ці справядліва гэта, — Вядзьмарка крыва ўсміхнулася ды рэзка паласнула спіцай праз татуіроўку.

Юнак ціха вохнуў ад болю. На паверхні татуіроўкі выступілі кроплі крыві, а сама яна стала падобная да распаленага дабяла металу. Жанчына перастала яго трымаць, і ён закрыў татуіроўку далонню, нібы спрабаваў схаваць яе, супакоіць.

* * *

— Ён набліжаецца, Панна, — ціха адзначыў Юрась.

— Адчыняй, — жанчына паднесла спіцу Усеваладу да горла.

Праз хвіліну на ганку з'явіўся дужы ўзброены Ваяр, напружана аглядаючы прысутных, разлічваючы сваю моц.

— Прывітанне, Ваяр. Твая прынада цябе ўжо зачакалася.

— Адпусці яго! — між далоняў у мужчыны ззяў Сімвал маланкі.

— Адпушчу. Потым. Калі ты зараз вып'еш настой, складзеш зброю, сядзеш вось на гэтую лаву і будзеш добрым хлопчыкам, ажно пакуль я не правяду рытуал. Пасля гэтага я дазволю вам абодвум сысці.

Святаслаў злавіў кінутую Юрасём бутэльку, адкаркаваў яе.

— Рады цябе бачыць, Юры.

— Не ўзаемна, — па-кашэчаму прашыпеў Юрась.

Ваяр паднёс бутэльку да вуснаў.

— Не! Святаслаў, не! — тарганууся да яго Усевалад.

Вядзьмарская спіца падрапала шчаку. Юнак замёр, сціснуўшы сківіцы. Святаслаў за раз праглынуў вадкасць з бутэлькі, кінуў на падлогу меч, арбалет і абарончы кудмень. Павольна апусціўся на лаву побач з Міхасём.

— Тое, што ты збіраешся зрабіць, можа скончыцца непрадказальна, — звярнуўся ён да Вядзьмаркі. — Ты разумееш, чым рызыкуеш? Ты ўяўляеш, колькі жыццяў забярэш дзеля сваёй эгаістычнай мэты?

— Я ведаю, што раблю. Я пазбаўлю гэты лес ад пачвар усіх відаў. Тут не будзе ні нячысцікаў, ні Ваяроў.

— Ты будзеш уладарыць пустэльняй. Я разумею, нячысцік забіў твайго мужа, мы — тваю цётку. Толькі ў чым вінаватыя гэтыя дзеці? Ты ж і ў іх забярэш Энергію. Добра, Юры — былы Ваяр, але Міхась твой унук!

— За ўсё ў жыцці трэба плаціць, — спакойна адказала жанчына.

— Дык ты мне хлусіла! — падскочыў Міхась. — Ды як...

— А як яшчэ?! — раззлавана гыркнула Вядзьмарка. — Як яшчэ мне было цябе ўпэўніць? Я павінна адпомсціць. Яны зруйнавалі маю сям'ю!

— А маю сям'ю зруйнавала ты!

На гэта Святаслаў і разлічваў: хлопчык адцягнуў яе ўвагу. Вядзьмарка крыху адсунулася ад Усевала-

да і глядзела толькі на Міхася. Святаслаў падхапіўся і кінуў у Вядзьмарку бутэльку з-пад настою, якую дагэтуль трымаў у руках. Патрапіў у галаву. Жанчына пахіснулася і ўпала. Спіца пакацілася па драўлянай падлозе. У той жа момант Усевалад крутануўся на крэсле, схапіў Юрася і прыклаў скронню аб стол. Нячысцік згубіў прытомнасць. Святаслаў выцягнуў з-за пояса паляўнічы нож, перарэзаў вяроўкі, якімі юнак быў прывязаны да крэсла.

— Забірай гэтага недаведзьмака і прэч адсюль! Я скончу сам.

— Нават не падумаю.

Настаўнік прыцягнуў вучня да сябе і жорстка вымавіў:

— Ты мала праблем наствараў? Пачні нарэшце падпарадкоўвацца!

Усевалад пакрыўджана падціснуў вусны, павярнуўся да Міхася.

— Хадзем.

Святаслаў прыціснуў напаўпрытомную Вядзьмарку да сцяны. Яна не спрабавала супраціўляцца. Прыставіў да шыі нож, замёр на імгненне, рыхтуючыся забраць жыццё. Вядзьмарцы гэтага імгнення хапіла. З вузкага рукава сукенкі выслізнула яшчэ адна спіца і ўторкнулася між рэбраў Ваяра. Той адхіснуўся.

— Люблю рабіць з Ваяроў нячысцікаў, — задаволена ўсміхнулася Вядзьмарка. — Ёсць у гэтым нешта іранічнае.

Яна рушыла да хлапцоў, якія замёрлі на ганку.

— Міхась, прэч! — коратка кінуў Усевалад.

Засвяціліся між далоняў Сімвалы. Спачатку невыразна, паміргваючы, губляючы форму, але саслабелы ад вядзьмарскай атруты юнак напружыўся, сканцэнтраваўся і разгарнуў абарончы Арнамент, які збіў Вядзьмарку з ног. Падскочыў да настаўніка. Той апус-

ціўся на падлогу, слаба ўсміхаючыся. Працягнуў хлопчыку нож.

— Я павінен... забіць Вядзьмарку? — ціха спытаў Усевалад, прымаючы зброю.

— Спачатку ты павінен забіць мяне, — яшчэ цішэй адказаў Святаслаў. — Праз лічаныя хвіліны я перайду пад яе ўладу, і ўся мая Энергія дастанецца ёй. Гэтага нельга дапусціць, Вал.

— Я не магу.

— Падумай пра маю годнасць. Я не хачу быць нячысцікам.

— Кіраўнік гэта выправіць!

— Калі б Кіраўнік мог гэта спыніць, спыніў бы шмат гадоў таму, — Святаслаў кіўнуў у бок непрытомнага Юрася.

Юнак зарыўся пальцамі ў валасы. Замітусіўся па хаце.

— Гэта ўсё праз мяне, я ва ўсім вінаваты. Навошта я пайшоў за табой? Баяўся, што з табой нешта здарылася. Я не мог у гэтай невядомасці... Думаў, што змагу дапамагчы, і толькі сапсаваў усё. Ты маеш рацыю, ад мяне адны праблемы.

— Усевалад! Паглядзі на мяне. Для мяне вельмі шмат значыць тое, што ты прыйшоў за мной. Што б я ні казаў, я рады, што ты не бяздумны і бязвольны паслухмяны жаўнер. Для мяне вельмі шмат значыць, што ты слухаеш сябе. А цяпер паслухай сябе яшчэ раз і зрабі гэта, Вал. Я хачу, каб гэта быў ты. Калі ласка.

Хлопец апусціўся на калені побач з мужчынам, сціскаючы ў руцэ нож.

Бізнес

Міхась мыў посуд, гатаваў сняданкі, дапамагаў Ядвізе рабіць саленні на зіму, а бацьку — нарыхтоўваць дровы для каміна. Дапамагаў Агніі вучыць урокі, аднагрупнікам — пісаць працы, абы чым-небудзь сябе заняць.

— М-м-м, Міхась, тосты — проста космас.

— Агеньчык, ты спознішся ў школу, — усміхнуўся ён, дамываючы апошнюю талерку.

— Ты зануда, Міхась, але я рада, што ты вярнуўся.

— Давай не будзем пра гэта.

— Можа, ты мяне да школы падкінеш?

— Ах ты падліза! — ён зарагатаў і паспрабаваў шлёпнуць сястру ручнікам.

— Пачакай-пачакай! — яна адхінулася і ўтаропілася ў экран тэлевізара, што працаваў у бязгучным рэжыме.

— Не сыходзь ад адказнасці. Ручнік справядлівасці ўсё адно дастане цябе.

— Міхась! Гэта матчын былы залётнік, — дзяўчо ўключыла гук.

«Хваля вусцішных нападзенняў накрыла сталіцу. Чарговай, пятай за два тыдні, ахвярай стаў знакаміты мінскі бізнесмен Альберт Шнайдар, які валодаў сеткай сталічных кавярань. Ён быў знойдзены задушаным на ганку свайго дома. Вядзецца следства».

— Я табе кажу: гэта мамін «Алік дурацкі шалік». Памятаеш?

Міхась памятаў. Гэты спадар чамусьці лічыў, што павінен выхаваць з Міхася «сапраўднага мужчыну», хоць маці была для яго шараговай каханкай. Сродкі выхавання ў яго былі прыкладна такія ж, як у маці. Але калі матчыну руку Міхась часам мог спыніць, дык з Альбертам рады не даваў. Потым Алік знайшоў сабе маладую дзяўчынку і знік з іх жыцця, пакінуўшы маці яшчэ больш няшчаснай ды азлобленай. Калісьці Міхась марыў, каб спадара Альберта атруцілі канкурэнты альбо каб ён разбіўся на сваёй супердарагой спартыўнай машыне, якой увесь час выхваляўся. Цяпер яго смерць не прыносіла нічога, акрамя смутку і неспакою. Юнак выцягнуў з кішэні мабільны.

— Ты каму, маме?

— Не, іншаму ідыёту. Усевалад, прывіт. Я бачыў навіны толькі што. Не лезьце туды. Я ведаю, што трэба агледзець цела ці хаця б месца здарэння, але варта тваёй бандзе байкераў без байкаў там з'явіцца, як міліцыя адразу займее падазраваных. Я вырашу праблему.

— Ты не проста зануда, ты бесхрыбетны зануда, — працягнула сястра. — Ты ж казаў, што ўсё скончана.

— Усё скончана. І ўсё складана.

— Здаецца, толькі што стала яшчэ больш складана, бо я ведаю толькі аднаго чалавека, які можа дапамагчы «вырашыць праблему».

— Слухай, разумняшка, ці не пайсці б табе ў школу?

— Дык не падкінеш?

— Метро падкіне. Машына ўсё яшчэ не на ходу.

Сястра каротка пацалавала яго ў шчаку.

— Надзяры ім усім дупы.

— Каму «ўсім»?

— Не ведаю: Усеваладу, маме, нячысцікам, трупу Альберта — усім. Бывай!

Міхась цяжка выдыхнуў. Яго не крыўдзілі абразы Агніі, бо гэта былі ўсяго толькі жартачкі малодшай

сястры. Але кожны жарт — толькі напалову жарт. І ў дадзены момант, гартаючы спіс кантактаў на літару «М», ён адчуваў сябе бесхрыбетным. Ён быў гатовы тэлефанаваць каму заўгодна: аднагрупніцы Машы, механіку Пашы альбо на мыйку машын. Прасіць пра што заўгодна, толькі не пра гэта.

І таму зрабіў адзінае, што магло быць горш за званок.

* * *

— Ірына Генадзеўна сёння не прымае, — сур'ёзна вымавіла маладая сакратарка.

Усё ў ёй было бездакорна: залізаны пучок на галаве, адпрасаваная белая блузка, акуратны някідкі манікюр. Міхасю зрабілася млосна, і ён нацягнуў самую нахабную з усіх магчымых усмешак.

— Можа, зробіце дзеля мяне выключэнне?

Яна разгублена залыпала злёгку падфарбаванымі вочкамі, адсунулася.

— Не. Я прашу прабачэння, але не.

— Вы баіцеся мяне? Альбо сваёй кіраўніцы? — ён дадаў у голас пяшчоты. — Можаце не адказваць. Гэты ваш стыль... Наўрад ці я б убачыў вас такой, калі б запрасіў на спатканне.

Падміргнуў. Яна падхапілася, піскнула:

— Што вы сабе дазваляеце? — косячы вокам на дзверы кабінета, што няўмольна адчыняліся.

— Лера, што тут... Міхал?!

— Салют, мам.

Сакратарка войкнула ды села на месца.

— Ты фліртаваў з маёй супрацоўніцай?

— Хацеў высветліць, наколькі ты зацюкала дзяўчо. Яна на мае правакацыі не павялася — можаш выпісаць ёй прэмію.

Маці скрыжавала рукі.

— Навошта ты тут, Міхал?

Ён рухам запрасіў яе ў кабінет, быццам той належаў яму. Нахабства надзейным шчытом ахоўвала ад хвалі дзіцячага жаху, што ўзнімалася ад аднаго яе позірку.

— Валерыя, два кубкі гарбаты. Мне як заўсёды, яму чорную, і два кавалачкі цукру. Нічога ж не змянілася?

— Не, мам, нічога не змянілася, — цяжка выдыхнуў ён, але адразу ж пераключыўся, гарэзліва падміргнуў сакратарцы. — Дзякуй, Лера.

Яна прыбрала са стала стос папер, расклала па належных месцах асадкі і алоўкі, працерла рукі антыбактэрыяльным гелем.

— Што гэта за цырк, Міхал?

— Не ўтрымаўся. Яна проста такая... Правільная, — ён тэатральна скрывіўся.

— Што трэба?

— Мне трэба ў морг.

— Тады сядзь яшчэ раз за стырно а дванаццатай ночы!

— Ого, ты жартуеш. Залік, мам. Але мне рэальна трэба агледзець адзін труп. Гхм. Твайго былога. Спачуваю, дарэчы, — без намёку на спачуванне вымавіў Міхась.

— Альберта? Навошта? Толькі не кажы, што па вучобе — не паверу.

— Ты ў любым выпадку не паверыш. Давай, называй сваю цану, бізнесвумен, і разыдземся.

— Вось табе мая цана: я хачу ведаць навошта.

Міхась закрыў твар рукамі. Чаму ўсе кажуць не тое, што думаюць? Замест «я баюся быць адзін» — «ты не мог бы заўтра зайсці», замест «я раўную да Усевалада» — «ты бесхрыбетны». Замест «я хачу ведаць, чым жыве мой сын» — «я хачу ведаць навошта». Ён ціха засмяяўся ў далоні.

— Окей, я папярэджваў. Горад у небяспецы. Усе гэтыя нападзенні за апошнім часам — гэта не маньяк-псіхапат, а пачвары. Монстры, ваўкалакі, вупыры. Не такія, як у «Прыцемках», але нешта каля таго. Каб знайсці і спыніць таго, хто забіў твайго Аліка, мне трэба агледзець труп.

— Я табе скажу, хто гэта быў, Міхал. Чалавек. Такі ж хворы на галаву, як вы з бацькам.

— Мам! Ну вось. Ты не верыш, і гэта нармальна. У гэтым няма нічога дзіўнага. Справа толькі ў тым, што калі людзі любяць, то яны дапамагаюць. Нават калі не вераць, не разумеюць, не згаджаюцца. Але каго ты ў гэтым жыцці любіла?

Ён узняўся, грымнуўшы крэслам, скіраваўся да выхаду, лічачы пра сябе крокі. Дзесяць. Дзевяць. Восем. Сем.

— Стой! Я ведаю, як на ўсіх дзейнічаюць твае палымяныя прамовы, Міхал. Хлопчык з няпростым дзяцінствам і высокімі ідэаламі любові ды справядлівасці, — яна адрывіста пісала на адваротным баку візіткі. — Толькі вось ты — мой сын. Я пазнаю свае фішкі і бачу, што ўсё гэта, улічваючы флірт з сакратаркай, — прадуманая маніпуляцыя. Брава, хлопчык. Не ведаю, навошта табе гэта насамрэч, але трымай сваю ўзнагароду.

Ён акуратна зацісну ў візітку між указальным і сярэднім пальцамі, стрымана ўсміхнуўся.

— Дзякуй, мам. Магчыма, гэта і маніпуляцыя, але я не схлусіў ні ў адным слове.

Міхась зачыніў дзверы, не чакаючы адказу. Сакратарка праводзіла яго зацікаўленым позіркам.

* * *

Усевалад схіліўся над трупам, косячы вокам на пільнага супрацоўніка морга. Акуратна дакрануўся да

шыі ў фіялетавых кровападцёках. Наблізіўся яшчэ, так што ледзь не кранаўся цела носам. Міхась ціха стаяў збоку і намагаўся не глядзець у бок мерцвяка. Ледзь стрымліваўся, каб не выйсці ў калідор. Памерлыя яго не палохалі, пакуль яны былі незнаёмыя. А цяпер ён глядзеў на кровападцёкі, узгадваў тыя, што непазбежна заставаліся на ягонай скуры кожны раз, калі Альберт завітваў да іх на кватэру, і яго выварочвала.

Нарэшце Усевалад задаволена вымавіў:

— Пазногці! Дзякуй, мы ўбачылі ўсё, што хацелі. Хадзем, Міхась.

Горад віраваў. Людзі спяшаліся па сваіх справах, заглыбленыя ў асабістыя праблемы, нават не ўяўляючы, што адбывалася зусім побач з імі: у родным горадзе, на паралельнай вуліцы, у доме насупраць, у суседнім пад'ездзе. Людзі раздражнёна абміналі двух юнакоў, якія спакойна шпацыравалі да метро.

— Дзякуй за дапамогу, — задуменна прамармытаў Усевалад.

— Я не дапамагаў. Я прадухіляў праблемы, якія ты непазбежна настараў бы.

Вал толькі ўсміхнуўся. Кіўнуў у бок сініх і чырвоных агеньчыкаў бургернай.

— Не хочаш перакусіць? Я пачастую.

Міхась падціснуў вусны. Зноў тое самае. Але з гэтым маніпуляваць было бессэнсоўна — не пройдзеш. З гэтым трэба было называць усё сваімі імёнамі.

— Скажы, што хочаш правесці са мной час, і я згаджуся.

— Добра. Я хачу правесці з табой час. І з'есці бургер.

Усевалад паставіў перад ім паднос — замовіў сам, нават не пытаючы. Паводле ўсіх намінацый трапіў у яблычак. Яны елі разам у фаст-фудзе хіба разы тры за ўсе пяць гадоў, так што яго ўважлівасць прыемна здзіўляла.

— Як ты атрымаў дазвол на агляд цела?

— Папрасіў у маці, — закідваючы ў рот некалькі бульбяных долек, адказаў Міхась.

— Сур'ёзна? Ты звярнуўся да маці, каб дапамагчы мне?

— Я ўжо казаў: я не дапамагаў табе.

— Хопіць на мяне злавацца, Міхась. Я папрасіў прабачэння. Я выклікаў Ваяроў. Я...

— Ты катаваў жывую істоту, Усевалад!

— Ты разам са мной іх заваліў не менш за сотню і нешта раней не быў такім міралюбівым.

— Гэта іншае.

— Якое «іншае», Міхась?! Што з імі здараецца пасля смерці ад рук Ваяроў? Ты ведаеш? Я не. Можа, яны вечнасць гараць у Перуновым полымі? — Усевалад сціішыўся, бо людзі пачалі азірацца. — Ах, так, ты ж гэтага не бачыш. Ты злуешся не таму, што яму было балюча. Ты злуешся, бо табе было балюча. Ну, прабач, што ў той момант я не думаў пра твае душэўныя пакуты! Ты ўвесь час тыкаў мяне ў тое, што я эгаіст. Толькі вось я і не прыкідваўся нікім іншым. А ты не толькі эгаіст, ты яшчэ і крывадушнік, — Усевалад скіраваўся да выхаду.

Міхась глядзеў у стол. Ён пераймаўся наконт таго, што ўсе кажуць не тое, што думаюць. Але чым ён лепшы? Ён не толькі казаў не тое, што думаў. Ён яшчэ і рабіў не тое, што хацеў.

— Вал! Хто забіў Альберта?

Сябар спыніўся, выдыхнуў.

— Ератнікі. Надзіва чыстая праца, быццам спецыяльна хацелі выдаць за простае забойства. Яны звычайна пускаюць кіпці ў ход напоўніцу.

— Магу я дапамагчы табе ў паляванні?

Падземка

Крок улева, крок управа — цемра. Дзіна рухалася асцярожна, адчуваючы мяккасць вільготнай глебы пад красоўкамі. Тут холадна, але ў крыві столькі адрэналіну, што яна вось-вось закіпіць.

— Баішся, Мелінда?

— Чаго тут баяцца?

— Напрыклад, прывідаў цягнікоў.

Аднойчы яна бачыла нешта. На закінутых могілках у Чарнобылі. Нешта, чаго не магла, не павінна была бачыць. Нешта, чаго не бачыў больш ніхто. З тых часоў да яе прыляпілася мянушка «Мелінда Гордан» — са старога серыяла пра спадарыню, якая гутарыла з прывідамі. Дзіну гэта больш здзіўляла, чым раздражняла. Адкуль хлопцы ведаюць такую «мыльную оперу»? У кампаніі Лупатага, Танка і Шэрага быць Меліндай не так ужо і дрэнна.

— Метро толькі будуецца. Калі тут і ёсць які прывід, дык гэта прывід своечасовага адкрыцця.

Шэры і Лупаты не пераймаліся наконт таго здарэння. Яны ўвогуле мала наконт чаго пераймаліся. А вось Танк згадваў пры любым зручным выпадку. Ён тады спалохаўся не менш за саму Дзіну: яму давялося амаль кіламетр цягнуць напаўпрытомнае дзяўчо на сабе, слухаючы яе мармытанні пра здані ліквідатараў.

Наперадзе мігцелі два ліхтары. Адзін з іх дакладна Танкаў, другі, відавочна, Лупатага. Ён у іх кампаніі самы высокі.

— Хлопцы! А дзе Шэры?

Яны разам павярнуліся назад. Промні высвецілі ў цемры фігуру сябра. Ён сядзеў на кукішках і апантана рыў пальцамі сырую глебу.

— Шэры, ты што робіш?

Ён узняў уверх руку. Між пальцаў праз слой бруду пабліскваала даволі вялікая манета.

— Тут павінны быць яшчэ!

— Кінь дурное, — фыркнуў Танк. — Рабочы згубіў. Не хапіла потым паўрубля на півас, ну.

— Не-е-е. Яна старая. І тут ёсць яшчэ, я ведаю.

Дзіна не бачыла ў цемры, але ёй гэта і не трэба было, каб зразумець, што Лупаты закаціў вочы, а Танк незадаволена падціснуў вусны.

— Шэры, ты ўсіх затрымліваеш.

— Дык дапамажыце мне! — яго вочы шалёна блішчэлі.

Хлопцы ўздыхнулі, але скіраваліся да сябра, а Дзіна не магла зрушыць з месца, бо цень ад ліхтароў за Сержуковай спінай павялічваўся. Рос, змяняўся, набываў вычварныя рысы: канічны капялюш, доўгі кій з вялікай булдавешкай, боты з закручанымі насамі. Урэшце цень набыў не толькі рысы, але і колеры. Ён ззяў і пераліваўся. На галаве і на нагах — золата, срэбная світка, падперазаная цэпам. Кій — таксама золата.

Цень навіс над Шэрым.

— Знайшоў, знайшоў! — выбухнуў сябар.

І ў гэты ж момант цяжкі кій апусціўся яму на макушку.

— Сяржук!

Танк і Лупаты здзіўлена азірнуліся на яе. Яны не бачылі, што адбылося, і не маглі зразумець, чаму ся-



бар раптам пачаў падаць. Шэры павольна завальваўся на бок, раскінуўшы рукі. Істота скіравалася да сяброў.

— Хлопцы! Бяжыце!

Дзіна кінулася да іх, паспрабавала падштурхнуць да выхаду, але яны нібы аслупянелі. Яна ў адчаі вылецела на вуліцу. Тут мусіць быць дапамога. Хай хоць міліцыя, абы выцягнулі адтуль гэтых ідыётаў.

* * *

На вуліцы нікога, цішыня. Цемра — гэта можна было б назваць цемрай, калі б Дзіна толькі што не была пад зямлёй. Дзяўчына прабегла крыху менш за квартал, калі нарэшце ўбачыла двух маладых людзей. Яны выглядалі не надта прыязна, але ёй было ўсё роўна.

— Чакайце! Дапамажыце! — яна пачала сумбурна тлумачыць сітуацыю.

Яе прымуць за вар'ятку, за наркаманку, за п'яную. Альбо не прымуць?

— Прыглядзі за дзяўчынай, — загадаў Усевалад і скіраваўся ў тунэль.

Міхась глядзеў на яе зацікаўлена, уважліва. Разглядаў у святле ліхтара і мякка ўсміхаўся.

— Вы нармальна сябе адчуваеце?

— Я бачыла тое, што не магу патлумачыць, — у яе дрыжаў голас. — Яно... Вы ж таксама іх бачыце? Таму і згадзіліся дапамагчы.

Ён пасадзіў дзяўчыну на лаўку. Дастаў з заплечніка невялікую пляшачку.

— Гэта дапаможа супакоіцца. На вас напаў Кладнік, бо вы абудзілі яго, калі ваш сябар знайшоў манету. З гэтымі істотамі лепш не звязвацца, бо ўратавацца ад іх амаль немагчыма: надта агрэсіўныя. Але звычайныя людзі іх не бачаць, нават калі тыя нападаюць. Толькі адораныя.

— Я «адораная»?

— Вы — Нязнойдзеная. У вас дар Ваяра Навальніцы. Яны палююць на нячысцікаў. Але вас не знайшлі і не навучылі ім карыстацца своечасова.

— Дык вы кшталту братоў Вінчэстараў? — акуратна адпіваючы з пляшкі, пацікавілася Дзіна.

— Ага. Толькі не браты, — Міхась засмяяўся.

Хлопец сеў на лаўку побач з Дзінай, зусім блізка. Ад яго пахла добрай парфумай і цеплынёй. Ад яе, напэўна, сырасцю і падземкай. Яна няёмка адсунулася.

— І шмат вас такіх? Ёсць нейкая арганізацыя? Людзі ў чорным?

— Скажам так, арганізацыя ёсць, але не ў Мінску, таму мы да яе не належым.

— Калі ў Мінску няма ніякай арганізацыі, а жудасныя монстры ёсць... — яна сцялася. — Вам варта яе стварыць. Такое... Не павінна адбывацца.

— Мы падумаем, — ён працягнуў ёй мабільны. — Напішыце мне, калі ласка, ваш нумар. І як вы ў інсце падпісаная.

Яна збянтэжана ўсміхнулася, узяла тэлефон.

— Будзеш сачыць, ці не з'еду я з глузду?

— Не. Запрашу на спатканне.

— Оў.

З цемры да іх выйшлі пагойдваючыся Танк і Лупаты. У першага цёк па лбе струменьчык крыві, было разбітае брыво, рассечаныя вусны. Другі мог ісці, толькі абапіраючыся на плячо першага. Міхась адразу ж кінуўся да іх, дапамог сесці. З яго заплечніка з'явіўся тузін каляровых бутэлечак ды льняных пакуначкаў. Юнак апрацоўваў раны і паіў хлапцоў дзіўнымі вадкасцямі.

— Дзе Шэры?! — Дзіну захліснула паніка.

Танк узняў поўныя болю вочы, моўчкі пацісну плячыма.

— Міхась, ён жывы? Якія шансы, што ён жывы?

Той прыпыніў працу, узяў яе за плечы.

— Дзіна, ты павінна супакоіцца. Ты — асаблівая, яны — не. З імі альбо пры іх лепш не размаўляць пра тое, што ты бачыла, калі не хочаш у вар'ятню. Зразумела? А цяпер дазволь мне дапамагчы тваім сябрам. Я буду ўдзячны, калі ты выклічаш Хуткую.

Ён працаваў, але ўсё часцей кідаў напружаныя позіркі ў бок тунэля. З кожным разам глядзеў усё даўжэй, уздыхаў усё цяжэй. Нарэшце, скончыўшы з Танкам і Лупатым, выпрастаўся. Сябры спалі, прыхіліўшыся адзін да аднаго. Міхась цвёрда рушыў да тунэля, але не паспеў зрабіць і дзесяці крокаў — з'явіўся Усевалад, перапэцканы ў зямлі, ускудлачаны, стомлены. На руках — непрытомны Шэры.

Дзіна пабегла да сябра, але Міхась схапіў яе за руку, надзіва рэзка ды моцна. Прыціснуў да сябе, і яна зразумела — Шэры не непрытомны. Закрычала, паспрабавала вырвацца. Калаціла Міхася рукамі і наступала на ногі, а ён проста трымаў. Пакуль Усевалад апускаў цела на зямлю, пакуль клаў адну далонь на пажухлую лістападаўскую траву, а другую — Шэраму на грудзі. Блакітныя іскрынкі цяклі па руцэ, быццам ён выцягваў іх з глебы, і сцякалі на цела Сержука. Аднак гэта нічога не змяніла. Толькі пажухлая трава пад рукой юнака высахла канчаткова. Удалечыні чулася завыванне хуткай дапамогі.

Міхась выпусціў яе з абдымкаў, дазваляючы кінуцца да сябра. Яна ўпала побач з ім на калені, усё яшчэ спадзяваючыся, што ён расплюшчыць вочы.

— Вал, — жорстка вымавіў Міхась. — Усё, нам трэба сыходзіць.

* * *

Усевалад піў трэці кубак зёлак і глядзеў у столь. Міхась ведаў, што размовы пра «мы не можам уратаваць усіх» бессэнсоўныя. Міхась ведаў, што Усевалад яшчэ доўга сабе не даруе. Усё, што Міхась мог, — паспрабаваць адцягнуць увагу.

— Глядзі, я накідаў некалькі варыянтаў візітак.

— Варта?

— Гульня слоў. Варта як ахова і варта як «варта гэта зрабіць». Разумееш?

— Разумею, Міхась, але думаю, што не варта. Я... Планую вярнуцца ва Унутраны Свет, — у яго позірку зусім не было ўпэўненасці. — Я належу таму свету, а не гэтаму. Да таго ж мне бракуе ведаў, бракуе падрыхтоўкі і дысцыпліны. Быў бы на маім месцы Людавіт — ды хоць Ян, — чалавек бы застаўся жывы. Я павінен вярнуцца.

— Вал, ты жартуеш!

— Не, Міхась, не да жартаў.

Міхась замаўчаў. Усевалад адпіў гарбаты, задумена разглядаючы папяровыя прастакутнікі з надпісам «Варта».

Бегчы

Пяць гадоў таму

Кіраўнік бачыў гэты сон надта часта. Яму мроілася вёска, старая, амаль закінутая. Жылых двароў засталося тры-чатыры. Астатнія альбо зарастаюць пустазеллем, альбо ажываюць толькі летам, калі ў гарадскіх жыхароў з'яўляецца жаданне пабываць на прыродзе. За зіму ў гэтых хатах разводзіцца процьма шкоднай дробязі, таму даводзіцца чысціць. Яго Каманда правярае закінутыя хаты па двое. Ён сам — з Велізарам, ягоным блізкім сябрам, які нядаўна атрымаў ступень майстэрства.

Хата. Жылая, але недагледжаная. На старым сырым ганку хлапчук гадоў сямі гуляецца з драўляным колам. Перунова Зорка. Ён калісьці падарыў такое дзяўчыне. Раптоўная сустрэча. Выпадковая сувязь. Ваяры часам такое сабе дазваляюць. Ва Унутраным Свеце няма адносін, няма кахання, але целу не загадаеш.

Малы апынаецца назіральным. «Добры дзень! Гэта вы забілі тую пачварную жанчыну ўчора ўночы?» «Гэта была лойма, — адказвае Велізар і, нахабна пляснуўшы сябра па плячы, дадае: — Пайду агледжу двор, а ты пагутары яшчэ з малечай». Быццам здагадаўся, быццам ведае. Цікаўныя шэра-блакітныя вочкі свідруюць яго, вывучаючы кожную рысу. Робіцца

няёмка. «Як цябе завуць?» — «Святаслаў. Бабуля кажа — у гонар бацькі...» — «У гонар бацькі, значыць... Жанчыны-жанчыны, — мармыча ён невядома каму. — А дзе ж мама?» — «Бабуля кажа — з'ехала грошы зарабляць». Малы раптам узнімаецца і падыходзіць да плота. «Я таксама хачу меч». Кароткі лёгкі паляўнічы нож выслізгае з-за пояса ды кладзецца хлопчыку ў руку. «Меч табе пакуль ранавата».

Кіраўнік прачнуўся рэзка, быццам мроіў жах. Сэрца калацілася, мужчыну ахапіў неспакой.

Нож хутка зноў зменіць гаспадара. Іншы хлопчык працягне яго Кіраўніку дрыготкімі рукамі, бо яго неверагодна цяжка трымаць. А ён пакуль не ведае, што вага не ў метале. Ён пакуль зусім нічога не ведае, таму Кіраўнік не возьме.

* * *

На старым вязе непадалёк ад вядзьмарскай хаты ўладкавалася маленькая чарнявая істотка з рожкамі на лбе і, паціраючы лапкі, агідна рагатала. Хіхітун — прадвеснік бяды. Кіраўнік не цэлячы даслаў у нячысціка Сімвал полымя. Неспакой не пакідаў яго. Святаслаў доўга не вяртаўся. Усевалад неяк схітрыўся знікнуць. Кіраўнік памятаў, чым скончылася сутычка з Вядзьмаркай у гэтым самым лесе. Ён ведаў, што часам гісторыя паўтараецца.

Хата гарэла. Буйныя пачварныя языкі полымя лізалі неба. Вогнішча раўло, люцела, ірвалася ва ўсе бакі, але яго трымалі. Усевалад не дазваляў яму распаўзацца. Блакітныя іскрынкі сцякалі з яго рук, Арнаментам апяразвалі полымя. На такое трэба было шмат, вельмі шмат Энергіі. Хлопчык хістаўся ад стомы. Кіраўнік далучыўся да пляцення, падхопліваючы ўзор, забіраючы на сябе палову працы.

— Што тут здарылася?

— Мы біліся з Вядзьмаркай. Энергія выйшла з-пад кантролю.

Юнак, змораны, збялелы, з жудаснымі ценямі пад вачыма глядзеў у бок хаты. Па шчоках цяклі слёзы.

— Дзе Святаслаў?

— У яго патрапіў Праклён Вядзьмаркі. Я... Мне давялося забіць яго.

— Якой халеры вас увогуле сюды панесла без Каманды?!

— Праз мяне. Гэта я вінаваты... Вось. Забярыце, — хлопец вызваліў адну руку ад пляцення і працягнуў мужчыне нож. — Я... Я яго не варты.

Раней ці пазней гэта павінна было здарыцца. Кіраўнік рыхтаваў сябе да гэтага з таго самага дня, як аддаў малому зброю. Кіраўнік намагаўся не прывязвацца з таго самага дня, як аддаў малога ў вучні Велізару. Дзеля яго Кіраўнік парушаў правілы і рызыкаваў становішчам. Дзеля яго Кіраўнік ахвяраваў жыццём свайго Вучня, але не збярог...

— Пакінь сабе, Усевалад. Дзе вучань Вядзьмаркі?

— Яна не паспела перадаць здольнасці. Я яго адпусціў.

— Сыходзь. Я скончу тут сам, — полымя пакрысе меншала. — Табе нельга вяртацца ва Унутраны Свет.

— Я і не збіраўся, — спакойна адказаў юнак і разарваў Арнамент.

Кіраўнік чуў, як ён сыходзіць. Павольна, але рашуча. Раптам крокі замёрлі.

— Кім былі мае бацькі, Кіраўнік? Я не буду іх шукаць, не пераймайцеся... Свят казаў, што ў Велізара былі запісы.

— Я не памятаю іх імёнаў, Усевалад... Ён забраў цябе з поўнай сям'і. Мы рэдка так робім, але Велізар не цікавіўся нічым, акрамя твайго дару. Ён нават

памяць бацькам не сцёр, бо для гэтага патрэбны непасрэдны кантакт вочы ў вочы, а ў яго выпадку гэта было надта небяспечна. Цябе маглі не аддаць. Я даведаўся пра гэта, калі Велізара ўжо не стала. Свят намовіў схадзіць, праверыць іх... Твой бацька вельмі шмат піў, а маці чакала дзіця. Цяжарным нельга сціраць памяць — гэта можа справакаваць выкідак. Твая маці была Нязнойдзенай, Усевалад. У Ваяроў рэдка нараджаюцца дзеці з дарам. Гэта адна з нагодаў, чаму ва Унутраным Свеце забаронены сувязі такога кшталту. Але калі нараджаюцца, дык вельмі адораныя.

Кіраўнік змоўк, думаючы пра іншага адоранага сына Ваяра. І пра тое, чаму яшчэ Ваяры не заводзілі сем'і. Ваяры забівалі і паміралі, бязлітасна і бясстрашна. Смерць сябра можна перажыць. Смерць каханай альбо каханага — больш складана, але таксама можна. Але смерць дзіцяці...

— Як мяне назвалі бацькі?

Полымя зусім сцішылася. Кіраўнік прыбраў Арнамент і павярнуўся да юнака.

— Якая розніца, Усевалад? Ты — Ваяр. Колькі ні намагайся, сваёй сутнасці ты не зменіш.

— Я не буду насіць гэтае імя. Мне проста трэба ведаць.

— Зміцер. Цябе звалі Зміцер.

Юнак удзячна нахіліў галаву.

— Усяго найлепшага, Кіраўнік. Даруйце за ўсё.

* * *

Міраслава сядзела на каленях ля Слупа, безуважна глядзела ў самае сэрца полымя. Знутры разрасталася пустэча. Больш страшная, чым тая, што цяпер панавала ў хаце Майстра Святаслава. Міра хапала ротам

паветра, але ўздыхнуць напоўніцу ў яе не атрымлівалася.

Ваяры ставіліся да смерці будзённа. Штодня хто-небудзь паміраў... У страўні ўсё так жа стаяў гоман. Вучні гарэзнічалі, настаўнікі іх утаймоўвалі, Падмайстры збіраліся на вечаровыя вогнішчы, Майстры абмяркоўвалі навіны Вонкавага Свету. Толькі двое, акрамя яе, на тры дні знялі зброю ў знак жалобы: Кіраўнік і Людавіт.

На другі дзень Людавіт прапанаваў Міраславе перайсці ў Падмайстаркі да яго. Ён казаў пра яе выдатны патэнцыял, які шкада будзе згубіць, пра свой цяжкі нораў, які давядзецца крыху патрываць, каб атрымаць ступень майстэрства. Не казаў толькі пра тое, што гэта можа выратаваць іх абодвух ад смутку. Смутку па тым, побач з кім было няпроста. Па тым, без каго было невыносна. Ён не казаў, але Міраслава разумела, толькі не верыла, што гэта дапаможа.

Тупы боль не супакойвалі ні трэніроўкі, ні віно, ні сон. Кожны куточак яе невялікага Свету, кожная рэч, кожная дробязь нагадвалі пра яго. У кожным твары яна бачыла знаёмыя рысы. У кожных аддаленых кроках чула ягоныя. Яна сказала Людавіту, што павінна падумаць, але цяпер яе займала толькі адна думка: «Не веру».

Міра выйшла з тыльнага боку Рады Майстроў. За густым кустоўем хаваўся дадатковы ўваход. Штурхнула дзверы, але яны не паддаліся. Пляснула па іх далонню, пад якой выбухнуў чырвоным Сімвал адмыкання. У доўгім змрачнаватым калідоры ні разу не спынілася і не запаволілася, каб удакладніць шлях. Так жа пляснула па чарговых, нічым не адметных, дзвярах і заляцела ў шырокі светлы кабінет. Ля акна, заклаўшы рукі за спіну, стаяў Кіраўнік.

— Зусім не абавязкова рабіць усё дакладна як ён, Падмайстарка Міраслава. Можна было проста пагру-

каць. Вы прыйшлі параіцца наконт прапановы Людавіта? Я б на вашым месцы яе прыняў.

— Прашу прабачэння, Кіраўнік. Я прыйшла спытаць, што здарылася на самай справе. Там, у Вонкавым Свеце. Я не веру, што яны абодва... — слёзы душылі словы. — Загінулі.

Кіраўнік павярнуўся. Паглядзеў на яе, стомлена, цяжка.

— Апошнім часам мне задаюць зашмат складаных пытанняў, — нарэшце выдыхнуў ён. — У Святаслава патрапіў праклён Вядзьмаркі. Усевалад забіў яго — не было іншых варыянтаў. Але Ваяр, які забраў жыццё іншага Ваяра, павінен аддаць сваё. Так што я... Адпусціў яго. Я Кіраўнік, але мне не ўтрымаць маіх людзей ад ажыццяўлення закону. Вядома ж, можна было зноў правярнуць тое ж самае, што з Велізарам. Сведкаў усё адно няма. Якая іронія... Не, Усевалад бы не здолеў хаваць тое, што столькі гадоў хаваў Святаслаў, а яго здольнасцямі нельга ахвяраваць праз глупства. Яны нам яшчэ спатрэбяцца. Таму хай жыве пакуль у Вонкавым Сусвеце, а потым паглядзім...

— Як ён там будзе жыць? — прыгаломшана перапытала Міра. — Дзе? Ён жа зусім нічога не ведае!

Яна пакуль да канца не ўсвядоміла сэнс сказанага Кіраўніком і таму задавала такія дурныя пытанні.

— Людзі — дзіўныя істоты. Яны так прагнуць зведаць свой лёс, але паміж пэўнай будучыняй і невядомым працягам так часта абіраюць невядомасць...

* * *

Далягляды знікалі за спінай, як і гэтае лета. Іх чакаў горад і новае жыццё. Жыццё, да якога Міхась не быў гатовы. На заднім сядзенні Ядвіга ласкава перабірала рудыя кудзеркі Агніі, якая ціха сапла ў яе на каленях.

Нарэшце яна супакоілася. Агнія плакала цэлы дзень, пакуль яны збіраліся ў горад. Плакала, бо не развіталася са сваім лепшым сябрам, Юрасём. Ён больш не прыходзіў на хутар. Міхась не сказаў ёй чаму.

Бацька кідаў на яго заклапочаныя позіркі. Міхась некалькі разоў прызнаваў сваю віну і прасіў прабачэння. Яны шмат гутарылі апошнім часам, толькі Міхасю ад гэтага лягчэй не рабілася. Ён памыліўся, жудасна памыліўся, павёўся на танную маніпуляцыю. Цяпер усё станавілася на свае месцы. Тое здарэнне з Азярніцамі было падладжанае, каб Міхась пачаў бачыць. Ён ніколі не распавядзе гэта сястры, але нават знаёмства Агніі і Юрася было спланаванае. Выпадковасцю было толькі адно: іх знаёмства з Усеваладам. Невядома, чым бы гэта скончылася, калі б не ён. Двойчы. Свет нібы спецыяльна сутыкаў іх, калі Міхась быў на скрыжаванні, калі ад Міхася патрабавалася правільнае рашэнне.

— Бацька, тармазі! — выгукнуў юнак.

Уздоўж трасы павольна, кульгаючы ішоў Усевалад. Ускудлачаны, змораны, з чорнымі ценямі пад вачыма. Скураную ваярскую куртку ён недзе згубіў. Ільняная вышыванка перапэцканая, падраная. Левае запясце заматанае нейкай анучай.

— Хэй! — Міхась высунуўся з машыны. — Хэй, Вал, стой! Куды цябе падкінуць?

Ваяр зірнуў на яго спадылба.

— Зноў ты?!

Вучань

Агідны восеньскі вецер дзьмуў у твар, закідваў за каўняры ледзяныя пырскі, прымушаў рухацца надта хутка, няўважліва, мружыць вочы. Усевалад накінуў капюшон байкі, схаваў рукі ў кішэні курткі. Ян жа выглядаў так, быццам яму зусім не холадна: скураная куртка, пад ёй кашуля з вышыўкай. Роўныя плечы, цвёрдая хада, пільны позірк. Толькі зубы зведзеныя так, што пабялелі скулы.

— Я бачыў запісы Знахара, — раптам пачаў Ян. — Пра філіял «Навальнічнікаў» у Мінску…

— Хочаш распавесці Людавіту — валяй. Мне ўсё роўна. У любым выпадку гэта ў мінулым.

— Не! Я наадварот, — юнак спыніўся, нервова правёў далонню па вільготных кароткіх валасах. — Я хацеў сказаць, што гатовы далучыцца. Я хачу далучыцца. І Міра з Багданам. Яны… З задавальненнем засталіся б. Чаму гэта ў мінулым?

— Не думаю, што нам варта, — Усевалад шматзначна хмыкнуў, — пакідаць наш Свет. Пярун стварыў яго не дарма.

— Перуну — калі ён увогуле ёсць — даўно пляваць на нас і наш Свет.

— Дзёрзка. Спадзяюся, твой настаўнік не ведае пра твае рэлігійныя погляды…

— Ён мне даўно не настаўнік, — рэзка адказаў Ян. — Насамрэч справа не ў Людавіце. Справа ў Све-

це. Які ў цябе першы ўспамін? Маўчы, я сам скажу. Пасвячэнне ў Ваяры. Як ва ўсіх. Мы не памятаем сваіх каранёў, свайго мінулага. Мы ўмеем толькі трымаць у руках зброю і ствараць Сімвалы. Мы ўсе аднолькавыя: носім стандартную вопратку, размаўляем завучанымі фразамі. Усё наша жыццё — адзін суцэльны рытуал. Я так зайздрошчу, што ты своечасова з гэтага вырваўся. Ты такі... Іншы.

Усевалад пахістаў галавой. Лістападаўскі вецер свістаў у галлі дрэваў. У галаве свістаў бізун, што рассякаў скуру вупыра. Юнак глядзеў на свае рукі, сціскаў ды расціскаў кулакі.

— Я адрозніваюся ад Майстра Людавіта куды менш, чым табе здаецца, Ян.

* * *

Міхась гіпнатызаваў мапу Мінска, жуючы аловак.

— Я прыйшоў папрасіць прабачэння... — збянтэжана пачаў Усевалад.

— Ш-ш-ш! Потым папросіш. Я думаю.

— Колькі можна? — Вал асуджальна зірнуў на мапу, быццам яна ўтрымлівала Міхася гвалтоўна.

— Глядзі, нападзенні адбываліся ва ўсіх раёнах Мінска. Паўсюль, акрамя гэтага месца, — ён тыцнуў пагрызеным алоўкам у мапу.

— Ты думаеш, што Пачвары хаваюцца ў Палацы Незалежнасці?

— Было б забаўна, — засмяяўся Міхась. — Не, тут яшчэ ёсць парк атракцыёнаў Dreamland. Вада, дрэвы, цёмныя месцы. Лёгка схавацца. Каго мы не заўважаем у парках, на вуліцах? Хто застаецца без увагі ва ўсіх на вачах?

— Хто? Гандляр марозівам? Білецёр?

— Не, там трэба працаваць. Нячысцікі хутчэй будуць імітаваць чалавечую дзейнасць, чым нешта насамрэч выконваць. Яшчэ варыянты?

— Ты гуляеш са мной? Я не ведаю... Дворнік?

— Нядрэнна. Толькі, на маю думку, у нячысцікаў надта высокая самаацэнка. Яны б абралі штосьці больш блізкае да прыроды, каб не прыбіраць чалавечы бруд. Напрыклад...

Усевалад развёў рукамі, запытальна гледзячы на Міхася.

— «Зелянбуд»!

— Оў, гэта тыя, у зялёных куртках? Я бачыў аднаго ў Лошыцы, калі паляваў на лойму. І потым, калі хлопец на Камсе патануў, яны там кветкі перасаджвалі ці што...

— Вось яно, Усевалад! — ён захоплена пляснуў у далоні. — Мы ведаем не толькі «дзе», мы ведаем «каго» шукаць!

— Раптам ты памыляешся?

— Сапраўды, я ж памыляўся, калі казаў, што ўсё неяк звязана. А потым памыляўся, калі прасіў цябе выклікаць Ваяроў. Чаму б мне мець рацыю на гэты раз?!

— Прабач.

— Хопіць выбачацца, Вал! Проста пачні ўжо мне давяраць і папрасі свайго змрочнага боса выклікаць яшчэ Ваяроў.

— Колькі?

— Усіх.

— Міхась, гэта немагчыма. Мы не ведаем, хто там, што там. Нам трэба спачатку высветліць...

— Спалімся. Што тут высвятляць, Усевалад? Колькі бутэлечак з попелам твае Ваяры прыцягнулі за апошні тыдзень? Пяць? Сем? А ведаеш, колькі адбылося нападаў? — ён павярнуў да сябра ноўтбук. — Два-

ццаць! Дзікія жывёлы, шалёныя сабакі, самагубствы, забойствы пры дзіўных абставінах. Дзеці, якія выйшлі пагуляць і не вярнуліся. У нас няма ніводнага шансу на памылку. Калі ні ты, ні твой Любавід не ў стане давесці гэта Кіраўнікам, відаць, я мушу гэта зрабіць!

— Цябе ніхто не будзе слухаць. Я паспрабую дамовіцца, Міхась. Ён, дарэчы, Людавіт. Можа пакрыўдзіцца, калі ты назавеш яго ў твар так «ванільна».

— Ды пляваць я хацеў! — Міхась, не звярнуўшы ўвагі на кпін сябра, зноў схіліўся над мапай.

Усевалад апусціўся на падлогу побач з Міхасём, абхапіў калені рукамі, збянтэжана зірнуў спадылба.

— Паслухай, Міхась, я не вярнуся ва Унутраны Свет. Я люблю гэты горад і хачу рабіць сваю працу тут. Таму калі ты не перадумаў, я б абраў першы варыянт візітак, — ён уздыхнуў, усміхнуўся. — Міхась, я не ведаю, як што складзецца далей, але ў мяне ёсць да цябе адна просьба.

* * *

Яны абмяркоўвалі нешта з дырэктаркай ля веснічак. Гэта дакладна былі яны, Стась не мог памыліцца. Ён прыціснуўся лбом да халоднага шкла, ускараскаўшыся на падаконне. Прыгледзеўся — яны. Кінуўся ўніз па лесвіцы, штурхаючы локцямі старэйшых.

— Гэта па мяне! Па мяне!

— У Беларусі нельга, каб было два таты! — у спіну яму пругка ўдарыў рогат.

Гэта зайздрасць. Яны і тады кпілі з яго, а ён меў рацыю: пачвары існавалі.

Пакуль ён дабег, да гутаркі далучыліся Зінаіда Іванаўна, высокі хударлявы мужчына ў чорным паліто і светлая ўсмешлівая жанчына. Стась замёр на ганку. Можа ўсё ж не па яго? Так, напэўна, параілі знаёмым

дзіцячы дом альбо палююць на пачвар, высочваюць кагосьці. Апошнім часам Стась шмат чытаў пра розных паляўнічых і экзарцыстаў, спрабаваў знайсці адказы на свае пытанні. На ўсе тыя, што так хацеў задаць Усеваладу, але не мог.

Ды адкуль ім увогуле ведаць, што ён дзетдомавец? Гэта проста супадзенне. Альбо яго шукалі мэтанакіравана? Мабыць, абярэг падказаў, дзе ён? Стась сціснуў Перунову Зорку ў далоні, заплюшчыў вочы, каб стрымаць слёзы.

— Табе не холадна? — пачулася зверху.

Толькі цяпер ён зразумеў, што вылецеў на вуліцу ў майцы і шортах, але яму не было холадна. Наадварот — кінула ў жар.

— Ты прыйшоў па мяне?

— Хадзем, пагутарым. У мяне ёсць да цябе прапанова.

— Я згодны.

— Паслухай спачатку, — усміхнуўся Усевалад, сядаючы на лаўку.

— Я ведаю, хто вы. Вы, як...

— Не! Ніякага «Звышнатуральнага», ці што ты там хацеў сказаць. Вы нібы з глузду паз'язджалі з гэтымі серыяламі. Усё больш складана, Станіслаў. Я хачу, каб ты ўсведамляў, на што згаджаешся. Віктар і Ядвіга возьмуць цябе ў сям'ю. Яны добрыя людзі. Думаю, вы хутка паразумеецеся, а я буду вучыць цябе карыстацца здольнасцямі.

На далоні хлопчыка расцвіла вогненная кветка, але адразу ж згасла. Па целе разлівалася прыемная цеплыня, абараняючы ад холаду.

— Большую частку дзяцінства ты правядзеш у трэніроўках. Будзе цяжка і, даволі часта, балюча. Таму я хачу, каб ты прыняў гэтае рашэнне свядома. Ты будзеш першым такім, Стась. Ні ў кога з нас не пыта-

лі, ці хочам мы быць Ваярамі. Ніхто з нас не памятае першую сустрэчу з настаўнікам. Так што... Я не ведаю, як гэта будзе. Магчыма, невыносна.

Ён шчыра глядзеў хлопчыку ў вочы. Зайздрослівы натоўп інтэрнатаўцаў пляткарыў, сцябаўся ды рагатаў за іх спінамі. Нішто не магло быць больш невыносным, чым гэта.

— Магу я збіраць рэчы?

— Не так хутка, свавольнік, — ён некалькі разоў міргнуў, нібы ў вочы нешта патрапіла. — Горад у бядзе, таму табе пакуль лепш пабыць тут. Тым больш трэба аформіць паперы.

Стась уявіў плынь здзекаў, якая абрынецца на яго сёння ж увечары. Апошнія дні ў інтэрнаце для ўсіх былі найгоршымі. Ён памятаў, як пакутаваў Пашка, а Стасю нават не сказалі, колькі канкрэтна ён мусіць гэта трываць. У носе заказытала, вочы звільгатнелі, голас па-здрадніцку задрыжэў.

— Навошта ты прыйшоў зараз?

— Каб ты падумаў. Яны забяруць цябе ў любым выпадку, Стась, гэта вырашана. Але ці будзеш ты маім вучнем — вырашаць табе.

— Гэта не ўсё.

— Што, прабач?

— Ты б мог прыйсці і пазней, калі горад ужо не будзе «ў бядзе». Чаму менавіта цяпер?

— Ого, Шэрлак.

— Ты штосьці казаў пра серыялы.

— Гэта кніжны персанаж... У горадзе цяпер даволі шмат Ваяроў. Я не хачу, каб яны забралі цябе, не хачу, каб ты рос так, як рос я. А з іншага боку, не хачу, каб ты ўсё жыццё пакутаваў праз тое, што бачыш, праз тое, што ўмееш. А яшчэ... Я хачу, каб было да каго вяртацца. Міхасю без мяне толькі лягчэй зажывецца... — ён задумаўся. — Задаволены?

— Завесці Вучня перад боем — даволі паслядоўна. Што, калі ты не вернешся?

— А ты дзёрзкі, — ён злёгку пстрыкнуў яго па носе. — І разумны. Я ведаю, што гэта бязглуздзіца. Але... Абяцанне можна стрымаць, толькі даўшы яго. Таму я абяцаю табе, свавольнік, што вярнуся за табой. І буду рады пачуць любы адказ.

Стась пацiснуў плячыма.

— Тады вяртайся хутчэй.

Знахар

У парку цішыня. Ні шчаслівага рогату, ні захопленага віскату, ні гулу атракцыёнаў, ні вокрыкаў гандляроў шарыкамі і папкорнам. Толькі шапацеў у галлі дрэваў вецер ды парыпваў пад ботамі снег.

Пад сотняй ботаў.

Людавіт моўчкі падаваў сваім людзям знакі, размяркоўваючы іх па тэрыторыі. Усевалад ціха стаяў побач, уважліва гледзячы ў цемру. Яму заставалася толькі здагадвацца, чаму камандзір пакінуў яго пры сабе. Чаму не Багдана альбо Ціхаміра, чаму не свайго былога вучня Яна. Тых ён паставіў кіраваць групамі, а яго дагэтуль лічыў дзіцём, не давяраў. Усевалад злаваўся, але цяпер было не да асабістых рахункаў, не да высвятлення адносін. Трэба было працаваць.

— Чаму ты выклікаў Людавіта? — Міра нібы незнарок затрымалася, калі група рушыла наперад. — Тобок, чаму папрасіў у Кіраўніка менавіта яго Каманду?

Усевалад не хацеў размаўляць, але яна б не адчапілася.

— Ён лепшы пасля Свята.

— Ведаеш, я спытала ў яго, чаму ён зрэагаваў на твой выклік, паверыў табе адразу, — яна задуменна хмыкнула. — Ён сказаў: Усевалад — разбэшчанае, самаўпэўненае дзіця, але ён лепшы Ваяр пасля Святаслава.

Усевалад змаўчаў. Пільна азірнуўся па баках.

— З часам не стала лягчэй?

— А табе?! — рыкнуў ён.

— Крышачку, — яна быццам не адчула яго раздражнення. — Ян сказаў табе? Пра мяне і Багдана? Мы раслі ў суседніх хатах. Ён мой лепшы сябар, так што калі ён прызнаўся... Я не здолела адмовіць, не хацела, каб ён адчуваў, як гэта... А цяпер ён прапанаваў застацца тут, разам.

— Калі ты сама гэтага не хочаш — не трэба.

— Ты ж застаўся дзеля Знахара.

— Прычым тут Міхась? Не буду хлусіць, мне вас не хапала, але там я ніколі не адчуваў сябе так, як тут, — свабодным. Тут я раблю сваю справу, як лічу патрэбным, а ты ў дадзены момант мне перашкаджаеш. Так што будзь ласкавая, займі сваё месца і не прымай рашэнняў, з якімі не зможаш жыць.

Міраслава рушыла наперад, потым зноў затрымалася.

— Калі б была такая магчымасць — ты б абраў іншы шлях?

— Займі. Сваё. Месца.

* * *

Ні шчаслівага рогату, ні захопленага віскату, ні гулу атракцыёнаў, ні вокрыкаў гандляроў шарыкамі і папкорнам. У левым сектары мільганула ў нябёсах Перунова Зорка. Небяспека. Нападзенне. Усевалад замёр.

— Майстар Людавіт!

— Я бачу. Самі разбяруцца.

— У той групе Міхась.

— Твайму Знахару трэба было ў хаце сядзець. Вырашыў ісці з намі — хай упраўляецца.

Гэта была ўмова Людавіта: яны мусілі быць у розных групах. Відаць, каб Усевалад думаў пра працу, а не пра бяспеку Міхася. Толькі гэта мала дапамагала. Юнак закусіў вусны. Майстар меў рацыю. Усевалад быў супраць, каб Міхась удзельнічаў у аперацыі, але спрачацца з сябрам было бессэнсоўна, ды і не хацелася. Колькі разоў той меў рацыю, колькі разоў рызыкаваў дзеля Усевалада.

Ваяр скіраваўся туды, дзе нядаўна мігцеў сігнальны Сімвал. Сціскаючы кулакі, стрымліваючыся, каб не перайсці на бег, бо падчас аперацыі Майстар мае права спыніць Ваяра, які не падпарадкоўваецца. Любымі сродкамі. Але Людавіт толькі загадаў групе рушыць далей.

Міхась напаўляжаў, абапіраючыся спінай на стары каштан. Вусны разбітыя, вільготныя валасы наліплі на лоб; далонямі заціскаў рану на жываце, стрымліваў стогны.

— Як ты? Чаму цябе пакінулі аднаго?!

— Трымаюся. Астатнія рушылі далей, — слаба прамармытаў хлопец. — Ціхамір толькі пусціў сігнал дзеля мяне. Усевалад, паслухай, трэба сыходзіць. Іх надта шмат. Нам не спыніць... Паслухай...

— Людавіт меў рацыю. Трэба было пакінуць цябе дома. Усё будзе добра, Міхась, — ён пацягнуўся, каб аддаць спалоханаму сябру крышачку Энергіі.

Левае запясце працяў востры боль. Ён адсунуўся, тарганув рукаў курткі. Татуіроўка, што не працавала пасля смерці настаўніка, цяпер распалілася амаль дабяла ды патыхала жарам, быццам яго дагэтуль ахоўвалі. Папярэджвалі з Іншасвету? Якой жа павінна быць пагроза, каб адтуль даляцела перасцярога? Усевалад здзіўлена зірнуў на сябра.

— Ты... Ты не Міхась! — з рук імгненна зляцелі Сімвалы.

Рассыпаліся вакол палымянымі пырскамі, не зрабіўшы істоце насупраць ніякай бяды.

— Чаму ж тваё чараўніцтва не можа мне нашкодзіць? — хлопец пагардліва скаліў зубы. — Ты не можаш зрабіць мне балюча. Як зрабіў Святаславу.

Усевалад прыціснуў да шыі юнака паляўнічы нож.

— Я не ведаю, чаму не спрацавалі Арнаменты, але ў мяне ўсё яшчэ ёсць зброя.

Рука дрыжэла, далонь павільгатнела. Нож падаўся неверагодна цяжкім і слізкім.

— І чаму ты не можаш яе ўтрымаць?

Ён асеў на зямлю насупраць сябра, не зважаючы на холад.

— Што адбываецца, Міхась?

— Пачвары маюць такое ж права на існаванне, як людзі. Людзі знішчаюць іх месцы жыхарства, пазбаўляюць іх хат. Людзі перасталі баяцца, перасталі шанаваць прыроду. А вы абараняеце толькі адных. Павінен быў хтосьці паглядзець на ўсё з іншага боку.

— Ты дапамагаў мне!

Віхорам пранесліся ўспаміны. Колькі разоў Міхась хапаў яго за рукі, колькі разоў павісаў на плячы. «Не кожны Нячысцік — пачвара».

— Ты доўбень, Усевалад. Ты заўсёды спачатку робіш, потым думаеш, калі ўвогуле думаеш. Але я не ўлічыў тваёй упартасці... Інакш бы Ваяры былі тут куды раней.

Гэта пастка! Ва Унутраны Свет не патрапіць нават Знахару.

— Ты прымусіў мяне выклікаць іх сюды. Ты спецыяльна патрапіў у аварыю!

— Давялося імправізаваць. Што я зрабіў, як я зрабіў — ты задаеш не тыя пытанні, як заўсёды. Ты павінен спытаць: што далей?

— І што далей?

— Далей Ваяры Навальніцы перастануць існаваць — дастаткова мне сказаць з дзясятак слоў. А ты не будзеш мне перашкаджаць. Бо, па-першае, ты і сам гэтага хочаш. Ты ведаеш, што так будзе правільна. А па-другое, для цябе гэта адзіны шанс застацца жыць. Звычайным жыццём, як ты марыў. Сыходзь.

Усевалад выпрастаўся, сціскаючы кулакі.

— Не.

— Ну і дурань. Памрэш разам з астатнімі, — Міхась таксама ўзняўся.

Крывавай раны на жываце больш не было.

— Вал, улева! — прагучала ззаду.

Ён імгненна падпарадкаваўся, хоць не разумеў каму. Арбалетны болт з глухім гукам захрас у дрэве. Там, дзе толькі што стаяў Міхась, — пуста.

— Ты ў норме? — да яго падбег Ян.

Усевалад пацёрся шчакой аб плячо. Выдыхнуў.

— Ты чаму сваю групу пакінуў?

Ян быў увесь падрапаны, збіты. На пальцах — апёкі Энергіі. Правае плячо наспех заматанае анучай, якая набрыняла кроўю.

— Няма больш групы. Засталося чацвёра разам са мной — я накіраваў іх да Багдана, а сам рушыў да Майстра. Але заўважыў цябе...

— Чацвёра з пятнаццаці? Як гэта адбылося, Ян?

— Вупыры. Не ведаю колькі. Трыццаць-сорак. Увесь парк поўны рознай поскудзі... Нам трэба спяшацца.

У гэты ж момант у нябёсах расцвілі Перуновы Зоркі.

— Гэта пастка. Які ж я ідыёт. Доўбень...

— Не ведаю, якое дачыненне да гэтага мае Знахар, але наступным разам я не прамахнуся.

Усевалад спыніў Яна, пільна паглядзеў у вочы.

— Не. Міхась мой. Я сам яго заб'ю.

Навальніца

Бажэна. Дабраслаў. Радаўлад. Сняжана. Ціхамір. Багдан. Васіліса. І яшчэ з тры дзясяткі тых, каго ён не ведаў асабіста. Старэйшых. Малодшых. Амаль палова. Палова ўсіх, хто прыйшоў у Вонкавы Свет. Праз яго. Праз тое, што ён прыслухаўся да Міхася.

«Ты будзеш здзіўлены, калі ён будзе перагрызаць табе горла».

— Якой халеры твой Знахар нападае на маіх людзей? — першае, што Усевалад пачуў ад Людавіта, калі ўсе групы сабраліся ў адной кропцы.

Там, куды іх сціскала няўмольнае лютае кола Пачвар. Усевалад не ведаў, што адказаць. Не разумеў. Не верыў...

Вакол ляскат мячоў, свіст арбалетных балтоў, выбухі Энергіі, вокрыкі, стогны. Усевалад рушыў наперад, упэўнена і цвёрда. Туды, дзе за спінамі пяці моцных вядзьмарак, якія надзейна ахоўвалі яго ад Арнаментаў і любой іншай зброі, чараваў Міхась. Мармытаў замову, абкладзены амулетамі і вядзьмарскімі прыладамі.

— Што ён робіць? — разгублена прашаптаў Ян.

— Адчыняе Наўе.

— Ты адкуль ведаеш? — ашчэрыўся Людавіт.

— Пазнаю рытуал. У Майстра Велізара была змястоўная бібліятэка. А вось адкуль ён ведае? Адцягніце ўвагу Вядзьмарак.

Між далоняў рос складаны, поўны перапляценняў Арнамент. Энергія пульсавала, ірвалася вонкі, апякала пальцы. Гэтага мусіла хапіць, каб хоць на час збіць вядзьмарак, знішчыць абарону. Арбалетныя балты Яна і Людавіта разляталіся на падлёце. Урэшце Майстар выцягнуў чацвёрку кідальных нажоў. Тыя самыя. Усевалад успомніў, як чысціў іх разам са Святам, усміхнуўся. Энергія палілася з рук, Арнамент складаўся прасцей, лягчэй.

Вядзьмаркі не атакавалі — толькі абараняліся, ашчаджалі моц. Усевалад закусіў вусны, прымушаючы сябе сканцэнтравацца. Не думаць пра Міхася, не ўспрымаць яго як Міхася.

«Табе не перамагчы, Ваяр. Ты не бачыш таго, што адбываецца ў цябе за спінай».

Сімвалы зляцелі з рук пругкай хваляй. Вядзьмаркі паваліліся на зямлю, нават Ваярам няпроста было ўтрымацца на нагах. Яго накрыла слабасць, але ён прымусіў сябе ісці наперад. Да Знахара, які стаяў на каленях, упіраючыся далонямі ў зямлю. Яго плечы злёгку трэсліся. Ён смяяўся?

— Позна, Ваяр.

Пад яго рукамі распаўзаўся па зямлі жудасны чорны цень. Шырыўся, выпроставаў, цягнуў па зямлі дзясяткі драпежных лап. Хапаў вядзьмарак за лыткі, за шыі, за валасы, зацягваў унутр сябе, праглынаў.

— І рукі не давялося пэцкаць, — задаволена зазначыў Міхась, назіраючы за гэтым.

Выпрастаўся, гледзячы як Усевалад цэліць у яго з арбалета.

— Ты не стрэліш, — спакойна паведаміў ён. — Ты можаш забіваць Пачвар, бязлітасна і жорстка, але ў цябе не ўзнімецца рука на чалавека. Тым больш на мяне.

Усевалад спрабаваў супакоіцца. У гэтым няма нічога складанага: арбалетны болт між вачэй — і ўсе

справы. Не, іх праблемы ўжо не вырашыць, але ён павінен гэта зрабіць.

Ад ценю аддзяляліся асобныя жудасныя стварэнні. Доўгія лапы хапаліся, адрывалі адна адну, распаўзаліся па баках чорнымі ненажэрнымі плямамі. У адрозненне ад Нячысцікаў імі не кіравала помста. Яны не жадалі Ваярам смерці, а проста хацелі есці.

— Ну, страляй ужо, — фыркнуў Міхась. — Ты ж біў мне твар. Гэта не нашмат складаней. Святаслаў цябе не асудзіць.

Усевалад цыкнуў і апусціў арбалет. Немагчыма. Павярнуўся да Яна і Людавіта, каб прызнаць сваю слабасць ды папрасіць дапамогі. Ян змагаўся з чорнымі ценямі, Людавіт ляжаў на зямлі, непрытомны. Давядзецца самому...

Міхась гучна крыкнуў. Усевалад здзіўлена павярнуўся назад. Міхась глядзеў на ўласныя грудзі, па якіх расплывалася барвовая пляма. Ваяр вохнуў, на аўтамаце зрабіў крок насустрач, каб падхапіць сябра, але Знахар упаў і рассыпаўся ў попел. За дзесяць крокаў, у цені дрэва, нязграбна абапіраючыся на ствол левай і сціскаючы ў правай арбалет, стаяў...

— Міхась?! — захлынуўся Усевалад.

Вусны разбітыя, вільготныя валасы наліплі на лоб, кашуля пад расшпіленым паліто наскрозь мокрая ад крыві.

— Які ж ты доўбень, Вал, — шэптам вымавіў юнак, кіўнуў на цень, што рабіўся ўсё шырэй. — Можаш гэта неяк спыніць?

— Не, — ён закрыў твар далонямі, але адразу ж прымусіў сябе сабрацца. — Нам застаецца толькі адбівацца і ўтрымліваць іх тут.

* * *

Заканчэння няма. Час, нібы кроў, што гусцее ў паветры. І ў роце таксама прысмак крыві. Рукі стаміліся трымаць меч. Такога не можа быць, Ваяр не павінен стамляцца. Ён бачыў, як меншала людзей вакол. Яны гублялі Энергію, выпускалі з рук зброю, падалі, знікалі ў ненажэрных пашчах Наўя.

Калі чалавек жыве і памірае спакойна і чыста — пасля смерці ён атрымлівае чысціню і спакой. Апякуецца сваім родам, прыходзіць да нашчадкаў, калі патрэбна парада альбо абарона, але не ўмешваецца ў чалавечае жыццё. Для яго яно завершанае.

Калі чалавек памірае ў пакутах, калі нехта праклінае альбо штосьці трымае яго тут — пасля смерці ён робіцца нячысцікам. Раней ці пазней абалонка разбураецца, застаюцца толькі рэшткі душы. Скатаваныя, разбітыя, азлобленыя, галодныя. І тады душа трапляе ў Наўя, робіцца ім. Усё, што рухае Наўя, — голад.

— Няўжо няма сродкаў гэта спыніць? — адстрэльваючыся з арбалета, спытаў Міхась.

Ён згубіў нямала крыві і быў ужо нездарова бледны, але яшчэ больш-менш трымаўся на нагах. Ён распавёў, як іх групу захапілі Пачвары. Як Ваяры падалі, нібы падкошаныя, ахопленыя ліхаманкамі. Як Хут забраў яго знешнасць і ўспаміны — з дапамогай нейкага вядзьмарскага рытуалу. Як яго пакінулі непрытомным, лічачы, што ён ужо не ачуняе.

— Я такіх не ведаю, — Усевалад раскручваў перад імі шчыт з абарончых Арнаментаў.

Ім патрэбна было адхланне. Яму і самому ўжо бракавала Энергіі.

— Насамрэч, ёсць адзін, — выдыхнуў Людавіт.

Майстар ужо ледзь трымаў у руках зброю, кульгаў на левую нагу, хрыпеў — відаць, былі зламаныя рэбры.

— Ага, Бог... Пачакайце, вы ж не сур'ёзна?

— Паслухай мяне, Усевалад, — Людавіт сціснуў пальцы ў яго на плячы. — Калі і ёсць хтосьці, здольны звязацца з Перуном і спыніць гэты жах, дык гэта ты.

— Я... — юнак пакруціў галавой. — Мне не хопіць Энергіі.

Міхась моўчкі працягнуў яму далонь. Энергія жывых істот перацякала да Ваяроў, засвойвалася лягчэй за ўсё, але Ваяры рэдка пазычалі такую Энергію, бо спыніцца ў час было не так проста.

— Ты з глузду з'ехаў! Гэта можа цябе забіць!

Юнак тыцнуў пальцам у зграю чорных драпежных ценяў.

— Гэта можа забіць нас усіх! Трымай!!!

* * *

Білі маланкі. Грымела так, што хацелася заціснуць вушы. Вакол шэрасць і наэлектрызаваныя іскрынкі Энергіі, нібы ён апынуўся ўнутры навальніцы. Вялікі згустак іскрынак набліжаўся і ракатаў так, быццам намагаўся нешта распавесці.

— Пачакай, вось так лепш, — згустак раптам набыў абрысы Святаслава.

— Настаўнік?!

— Оў, не, проста першы вобраз, які я выцягнуў у цябе з галавы. Усе гэтыя ідалы — малюнкі, што выяўляюць мяне брутальным мужыком з доўгімі валасамі і залатой барадой, жудасна мяне стараць.

Усевалад нарэшце ўсвядоміў, хто перад ім, пакорліва апусціўся на калені. Бог падышоў бліжэй.

— Што трэба?

— Пачвары выйшлі з-пад кантролю, Бог Маланак і Навальніцы, — не ўзнімаючы вачэй, адказаў Усевалад.

— Ды няўжо? Якія нечаканыя навіны. Я хачу пачуць Першы закон, Ваяр.

Юнака працяла токам, быццам хтосьці тыцнуў у спіну вельмі моцным электрашокерам.

— Падтрымліваць раўнавагу паміж людзьмі і нячысцікамі.

— І дзе раўнавага ў тым, каб бесперапынна знішчаць адных, ратуючы іншых?

Усевалад змаўчаў.

— Давай-ка яшчэ Пяты…

Ён зноў ператрываў удар току, да скрыпу сціскаючы зубы.

— Ніколі не прывязвацца да тых, каго мусіш ахоўваць.

— Гэта датычыцца ўсіх, але цябе — у першую чаргу.

— Я… Міхась толькі…

І зноў удар току. Больш моцны. На гэты раз ён не вытрываў і застагнаў.

— Паверыць не магу. Ты збіраўся схлусіць БОГУ?!

Злосць і шчырае непаразуменне хутка змяніліся на пагарду.

— Вы такія ж, як яны… Звычайныя людзі. Ніякім полымем не выпаліць з вас тыя недахопы, што ён заклаў.

Юнак здзіўлена ўзняў вочы.

— Што? Не верыш жа ты насамрэч, што гэта я вас стварыў. Не ведаю, што ў вас там цяпер напісана ў рэлігійных падручніках — гэта такая ненадзейная справа — але я, прынамсі, ніколі такога не сцвярджаў. Даваць жыццё падуладна аднаму Творцу. Я ўсяго толькі ўдасканаліў некаторых, надзяліў кавалачкам сваіх здольнасцей… Мне трэба было, каб нехта выконваў маю работу. Я стаміўся. Мне надакучыла. Вы ў мяне не адны. Ваяры Перуна, Жаўнеры Тора, Байцы Зеўса, Легіянеры Юпіцера — усіх пералічваць стоміш-

ся, не тое што наглядаць за ўсімі. Наогул, яму можна пакідаць свой мурашнік без нагляду і выпраўляцца эксперыментаваць з іншымі формамі жыцця. Чым я горшы?

Усевалад сціснуў рукамі скроні. Гэта было надта складаным, надта вялікім для яго ўсведамлення. Бог уздыхнуў, прысеў побач з ім на кукішкі. Зусім як Свят тады, калі дапамог яму чысціць нажы Людавіта. Уважліва зірнуў юнаку ў вочы.

— Усё настолькі дрэнна?

Усевалад вытрываў позірк — плынь чыстай Энергіі.

— Катастрафічна. Яны адчынілі Наўе...

— Дык хто ў гэтым вінаваты?! — раззлавана зароў бог. — Вы хоць уяўляеце, чым гэта можа абярнуцца?!

Зусім побач бліснула маланка. Грымнула. Усевалад на імгненне сцяўся, але хутка ўзняў вочы.

— Можа, не варта было пакідаць нас без нагляду?

— Табе проста разважаць, смяротны. Ты не ведаеш слова «вечнасць», не адчуваеш яго сэнсу, — бог сціснуў далонь на шыі юнака.

Зрабілася нясцерпна горача. Бракавала паветра.

— Прапаную абмен. Смерць за дапамогу, — прахрыпеў Ваяр.

— Навошта мне цябе забіваць?

— Наадварот. Я прапаную не жыццё. Я прапаную смерць. Буду вашым прадстаўніком на Беларусі. Вечна. Сачыць за парадкам, падтрымліваць раўнавагу.

— Ты не ўяўляеш, што прапануеш, хлопчык, — бог расціснуў руку. — Ты звар'яцееш раней, чым міне першая сотка гадоў.

— Вернеце мне смерць у любы зручны вам момант, — усміхнуўся Усевалад, паціраючы шыю. — А за сотку шмат можна паспець. Нават у кантэксце вечнасці.

* * *

Усевалад стаяў на каленях сярод прысадаў, поўных попелу і пылу. За спінай ракатала навальніца. Маланкі раз-пораз білі туды, дзе яшчэ засталіся Наўя. Ля дрэваў варушыліся знясіленыя боем Ваяры. Тыя, хто яшчэ мог. Праваруч глядзеў шклянымі вачамі ў шэрыя ранішнія нябёсы Майстар Людавіт. Леваруч, усё яшчэ слаба сціскаючы яго руку, ляжаў Міхась. Ва Усевалада перахапіла дыханне.

Яму так хацелася адчуць пад пальцам слабую пульсацыю, пачуць грукат сэрца, убачыць, як дрыжаць вейкі.

І адначасова так хацелася, каб гэты чортаў Знахар ніколі не расплюшчваў вачэй. Бо ён пасталее, пастарэе ды памрэ, а Усевалад будзе глядзець на гэта. Бездапаможна.

Гэты пракляты горад рассыплецца ў попел, а Усевалад застанецца. Адзін.

Міхась расплюшчыў вочы.

Змест

Мурашы 5
Недапалак 10
Атрута 14
Пачынаць 17
Крама 27
Ружы 32
Спайс 36
Бачыць 41
Валацуга 52
Абаронца 59
Новы Час 65
Разумець 72
Крывавая Мэры 82
Вулічныя Музыкі 87
Знаходзіць 95
Перунова Зорка 114
Глыбіня 117
Прымаць 123
Вера 136
Аскепкі 142
Навальнічнікі 147
Вырашаць 152
Бізнес 160
Падземка 167
Бегчы 174
Вучань 181
Знахар 188
Навальніца 193

Літаратурна-мастацкае выданне

Длатоўская Аліна Аляксандраўна

АРНАМЕНТЫ

Аповесць

12+

Адказны за выпуск *Андрэй Янушкевіч*
Рэдактар *Наста Карнацкая*
Карэктар *Наста Анцімонік*
Камп'ютарная вёрстка *Андрэй Янушкевіч*
Дызайн вокладкі *Васіль Шарапаў*

Падпісана да друку 25.07.2019. Фармат 84×108/32.
Папера Classic Stora Enzo. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,7. Ул.-выд. арк. 7,0.
Наклад 500 экз. Заказ 2829.

Індывідуальны прадпрымальнік
Янушкевіч Андрэй Мікалаевіч.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/218 ад 18.03.2015.
Вул. Шафарнянская, 3/135, 220125 г. Мінск.
https://januskevic.by

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Новапрынт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы і распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, к. 4, п. 10, 220138 г. Мінск.

JANUSKEVIC.BY

9 789857 210251

ЯНУШКЕВІЧ
выдавецтва

АРНАМЕНТЫ